КУЛЬТУРА ‣ ГРАМАДСТВА ‣ ЭКАНОМІКА ‣
ЛЮДЗІ ‣ ПАДЗЕІ ‣ ФАКТЫ

№23 (151)
26 ЧЭРВЕНЯ 2009 г.

# Новы Час



**ВОЛЬНЫ ТВОРЦА І ПАТРЫЁТ**

Стар. 6

**РАБОЧЫЯ ЦІКАВЯЦЦА АНТЫКРЫЗІСНАЙ ПЛАТФОРМАЙ АПАЗІЦЫІ**

Улада робіць стаўку на крэдыты,
АДС — на Антыкрызісную платформу

Стар. 5

**НА АБАРДАЖ ЕЎРАПЕЙСКАЙ ПАЛІТЫКІ!**

Сапраўдны фурор ва ўсім свеце, асабліва сярод маладых карыстальнікаў інтэрнэту, выклікаў поспех шведскай Партыі піратаў на выбарах у Еўрапарламент.

Стар. 21

**ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ**

Стар. 9–16

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**ВЕРШНІКІ НА КОНЯХ**

ПРАЦЯГ НАРЫСА АЛЯКСЕЯ ХАДЫКІ З ЦЫКЛУ "ТААЯМНІЦЫ БЕЛАРУСКАЙ ГІСТОРЫІ"

ГЕАПАЛІТЫКА

# ЕЎРОПА ІДЗЕ Ў БЕЛАРУСЬ

Алена Запалянская

**Адносіны Беларусі і Расіі з нядаўняга часу сур'ёзна ўскладніліся. У гэтых умовах прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прасіць камісара Еўрасаюза па знешніх сувязях і еўрапейскай палітыцы добрасуседства Беніту Ферэру-Вальднер тэрмінова прыехаць. Сустрэча, якая планавалася на 12 сакавіка, але ад якой ён ухіліўся, калі тэрмінова ад'ехаў з візітам у Арменію, адбылася 22 чэрвеня.**

"Я тут, каб пабачыць, што можна зрабіць і што ўжо зроблена, каб развіваць нашы адносіны", — так вызначыла Ферэра-Вальднер мэты свайго візіту (дарэчы, першага візіту еўрапейскага камісара) у Беларусь.

## Галоўнае

Усе галоўныя пытанні вырашаліся на сустрэчы з Аляксандрам Лукашэнкам. Амаль пра ўсе з іх можна толькі здагадвацца, бо СМІ стала вядомай толькі маленькай частка з 2,5 гадзіннай размовы: афіцыйны пачатак і кароткія каментары Ферэры-Вальднер па выніках.

"Апошнім часам у ЕС ёсць палітыкі, якія лічаць, што Лукашэнка вядзе нейкую гульню з Еўропай, што ён такі-сякі і нічога не збіраецца мяняць у краіне і ў адносінах з Еўропай. За ўсе свае гады прэзідэнцтва я ніколі не дазваляў сабе паводзіць сябе несумленна", — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

"Мы шчыра хочам, хоць камусьці гэта не падабаецца, пабудаваць з вамі добрыя адносіны", — дадаў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Ужо па выніках сустрэчы Беніта Ферэра-Вальднер назвала яе вельмі прадуктыўнай. "Прэзідэнт вельмі ўважліва слухаў тое, што я казала, а я ўважліва выслухала ягоную пазіцыю", — патлумачыла еўракамісар.



### Апазіцыя задаволена

Задавальненне ад сустрэчы з Ферэрай-Вальднер выказалі і прадстаўнікі апазіцыі. "Спадарыня камісар вельмі добра разабралася ў сітуацыі, якая існуе ў Беларусі. Цяпер зразумела, што Еўрасаюз добра ведае, чаго чакае ад Беларусі, і афіцыйнаму Мінску будзе вельмі цяжка, амаль немагчыма, навязаць еўрапейскім чыноўнікам сваю гульню", — пракаментаваў "Новаму часу" намеснік старшыні руху "За свабоду" Віктар Карніенка.

Падчас сустрэчы былі ўзнятыя пытанні свабоды дзейнасці ў краіне недзяржаўных грамадскіх арганізацый, наяўнасці палітзняволеных, узаемаадносінаў паміж Еўрасаюзам, беларускімі NGO і ўладай, паведамілі "Новаму часу" праваабаронцы.

## Што Беларусь павінна зрабіць

На гэты раз Еўрасаюз прыйшоў да Беларусі фактычна з палітычнымі патрабаваннямі як гаранта далейшага супрацоўніцтва. Беніта Ферэра-Вальднер нагадала, што краіны ЕС звярнуліся да Беларусі з просьбай выканаць "пяць пажаданняў".

Самае галоўнае — гэта сумесная праца з БДІПЧ АБСЕ дзеля змянення выбарчага заканадаўства Беларусі. Акрамя таго, сярод пажаданняў ЕС — свабода СМІ, свабода сходаў, рэгістрацыя недзяржаўных арганізацыяў, адсутнасць палітзняволеных. Гэта, акрамя іншага, дасць доступ да паўнавартаснай працы ў межах "Усходняга партнёрства".

"Тыя захады, якія вы зрабілі, далі магчымасць еўрапейцам пераасэнсаваць падыход да вашай краіны, — адзначыла еўракамісар. — Калі будзе жаданне з вашага боку, то будзе гатоўнасць і з нашага наладжваць супрацоўніцтва".

Камісар ЕС падкрэсліла, што Еўрасаюз паважае суверэнітэт Беларусі, ведае яе гісторыю і разумее, як складана быць мостам паміж Усходам і Захадам. Паводле яе слоў, у беларускага кіраўніцтва пасля прыпынення санкцый ЕС ёсць шанец і час да снежня, каб прадэманстраваць, што Беларусь гатовая да супрацоўніцтва з Еўропай.

## Што візіт дасць Беларусі

Па словах А. Лукашэнкі, Беларусь хацела б пабудаваць нармальныя адносіны з Еўрасаюзам, паколькі Еўропа — сусед Беларусі, на краіны ЕС прыпадае палова тавараабароту, да таго ж гандлёвае сальда для Беларусі складаецца дадатнае.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што Еўрасаюз вельмі тэхналагічны, а Беларусь мае высокатэхналагічную эканоміку, і таму без супрацоўніцтва з ЕС наша краіна не можа далей развіваць сваю эканоміку.

З сабой еўракамісар прывезла 10 мільёнаў еўра з бюджэту Еўракамісіі. З аднаго боку, даволі невялікая сума, асабліва ў параўнанні з тымі крэдытамі, што выдала Беларусі Расія. З другога — гэта ўсё ж важна як пачатак, і, падаецца, мае сімвалічны характар: 10 мільёнаў на фоне "малочнай вайны" будуць выдзелены для паляпшэння ў галіне стандартызацыі і харчовай бяспекі для паставак беларускага харчавання ў ЕЗ. Акрамя таго, Беніта Ферэра-Вальднер абяцала пасадзейнічаць зніжэнню цаны на шэнгенскія візы.

Так што візіт важны ў доўгатэрміновай перспектыве і, верагодна, калі Беларусь выканае ўсе ўмовы, прынясе свае дывідэнды. Пакуль жа — гэта было знаёмства, дэкларацыя аб палітычных намерах.

Такога меркавання прытрымліваюцца і эксперты. Так, палітолаг-міжнароднік Фёдараў распавёў карэспандэнту "Новага часу", што сярод прапановаў Беніты Фэрэры-Вальднер — "у абмен на дэмакратызацыю ў краіне — пашыранае супрацоўніцтва з Еўрасаюзам". "У тым ліку — інвестыцыі і тэхналогіі, хаця наўпрост гэтым еўракамісар не займаецца", — падкрэсліў эксперт.

На погляд эксперта, "у бліжэйшай перспектыве гэта не кампенсуе прэферэнцыі, якія Беларусь атрымлівае ад Расіі, але ў трохі аддаленай перспектыве — палепшыць узровень жыцця ў краіне".

Беларусь, як заўсёды ў такой сітуацыі, гуляе паміж Расіяй і Захадам. Пакуль што такая тактыка была даволі эфектыўнай для афіцыйнага Мінску. У гэтай партыі мяч на палове беларускага боку, і далейшае развіццё будзе залежыць менавіта ад ягонай падачы.

## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### ПЕРАБРОДДЗЕ. СВОЙ ГЕРБ І СЦЯГ

Першы прыклад таго, як жыхары невялікага населенага пункта Беларусі аднавілі свае векавые геральдычныя сімвалы — вёска Перабродддзе. Яе гісторыя багатая на падзеі і імёны. Герб тут паўстаў яшчэ ў XVI стагоддзі, калі тутэйшыя жыхары дапамаглі перайсці брод каралю Рэчы Паспалітай і вялікаму князю ВКЛ Жыгімонту III Вазе з войскам, які вёў вайну з Масковіяй. З гэтай нагоды ён падараваў мястэчку Магдэбургскае права.

Каб засведчыць тое, што адбывалася тут на працягу стагоддзяў, жыхары Перабродддзя знялі пра сваю вёску 6-хвілінны фільм. Зрабілі пераклад на англійскую мову. Размясцілі ў інтэрнэце. Пасля гэтага вёску сталі часта наведваць замежныя госці. Вось толькі тутэйшыя людзі хочуць, каб Перабродддзе наведвальнікі называлі мястэчкам.

### КОБРЫН. ПАРК І СЯДЗІБУ АДНОВЯЦЬ



Ідзе рэканструкцыя парка, які з'яўляецца помнікам садова-паркавага мастацтва, што быў заснаваны ў 1768 годзе пры дапамозе знакамітага Антонія Тызенгаўза. Парк — частка сядзібы Кобрынскі ключ, якая ў 1795 годзе была перададзена расійскай імператрыцай Кацярынай II ва ўладанне Аляксандру Сувораву, што задушыў вызвольнае паўстанне пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі.

Сёння ў парку пакладзена тратуарная плітка, пасаджаны новыя віды дэкаратыўных раслін, абнаўляюцца атракцыёны. Абнаўляецца зала забаўляльных аўтаматаў, якая будзе працаваць увесь год. У гэтай новай зале можна будзе не толькі вабіць вольны час, але і арганізоўваць сямейныя і карпаратыўныя святы. Хутка будзе завершана будаўніцтва амфітэатра. На месцы старога фантана з'явіцца новы.

### ГЛЫБОКАЕ. КІНАФЕСТЫВАЛЬ "MAGNIFICAT–2009"

Magnificat

У Глыбокім пачаўся кінафестываль. Яго мэта — агляд беларускіх і замежных карцін і тэлепраграм, створаных у розных хрысціянскіх традыцыях і накіраваных на евангелізацыю грамадства, а таксама захаванне агульначалавечых каштоўнасцяў. Фестываль традыцыйны. Сёлета ў конкурснай праграме бяруць удзел 40 карцін. Упершыню ў фармаце фестывалю будзе арганізаваны паказ дзіцячых хрысціянскіх фільмаў, сярод якіх — 3 мультыплікацыйныя фільмы.

### КААЛІЦЫЯ "РЭГІЁНЫ СУПРАЦЬ АЭС"

Актывісты беларускага антыядзернага руху стварылі кааліцыю "Рэгіёны супраць АЭС". Заснавалі кааліцыю грамадскія актывісты з Горак, Бялынічаў, Вілейкі, Мінска і Магілёва. Каардынатарам абраны Эдуард Брохараў. Першай акцыяй кааліцыі стане ўсебеларускі дзень інфармавання насельніцтва пра небяспеку АЭС. І гэта не аднаразовае мерапрыемства. Пры правядзенні дзён інфармавання актывісты руху збіраюцца распавядаць людзям тое, пра што замоўчваюць чыноўнікі, спасылаючыся ў сваіх выступах на высновы навукоўцаў і эканамістаў, якія не бачаць неабходнасці будаўніцтва на Беларусі атамнай станцыі.

## ▸ КАНФЛІКТ

# ГАЗАВАЯ ВАЙНА, ЯКАЯ НЕ ПАЧАЛАСЯ

*Алена Запалянская*

**"Газпрам" прад'явіў прэтэнзіі "Белтрансгазу", але беларускі бок іх не прызнаў.**

На хвалі "малочнага абвастрэння" ў беларуска-расійскіх адносінах з'явіўся і "газавы фронт". Пасольства РФ у Беларусі распаўсюдзіла інфармацыю пра патрабаванне "Газпрама" аплаціць запазычанасць за газ у 230 мільёнаў долараў, якая ўзнікла з-за розніцы ў кошце паставак па кантракце і фактычна аплачанаму па сярэднегадавому кошту.

Па словах дарадцы па эканамічных пытаннях пасольства РФ у Беларусі Андрэя Кузняцова, "Газпрам" таксама збіраўся атрымаць пеню з гэтай сумы і звярнуцца па штраф за няпоўную выбарку газа ў гэты час.

Даволі сур'ёзнае пытанне, улічваючы фінансавы крызіс і стан беларускай эканомікі, вырашылася пакуль дастаткова проста. Прадстаўнік кампаніі "Белтрансгаз" заявіў агенцтву "Интерфакс-Запад", што запазычанасці не мае і будзе плаціць як плаціў па сярэднегадавым кошце па 150 долараў за 1 тысячу кубаметраў.

Між тым, пасол РФ у Беларусі Аляксандр Сурыкаў адзначыў, што ліст "Газпрама" — не што іншае, як "прапанова беларускаму боку ўрэгуляваць вусныя дамоўленасці двух прэзідэнтаў". "Ёсць дамоўленасць, трэба змяніць кантракт ці плаціць па існуючым кантрактам. Магчымыя абодва варыянты", — заявіў журналістам пасол.

Адзначым, пытанне пра кошт на газ для Беларусі было на павестцы дня сустрэчы прэзідэнтаў Беларусі і Расіі Аляксандра Лукашэнкі і Дзмітрыя Мядзведзева яшчэ ў снежні 2008 года. Тады было дамоўлена, што кошт будзе сярэднегадавым.

## ▸ ПАСТАЎКІ

# МАЛАКО ЗНОЎ ІДЗЕ НА ЎСХОД

*Алена Запалянская*

**Малочная вайна была кароткай, але запамінальнай: пад сякеру забароны трапілі 1200 найменняў малочнай прадукцыі, з якіх па замірэнню рэанімавана ўсяго толькі 273.**

"Да 139 відаў прадукцыі, якая была дапушчана па ўдакладненаму першаму спісу, сёння (22 чэрвеня) мы дадалі яшчэ 134 віды прадукцыі. У выніку 273 наймення малочнай прадукцыі беларускіх прадпрыемстваў з заўтрашняга дня могуць увозіцца на тэрыторыю Расіі", — цытуе ***РИА «Новости»*** галоўнага санітарнага ўрача Генадзя Анішчанку.

Прэзідэнта ж Расіі малочны канфлікт азадачыў. "Сітуацыя ж абсалютна простая — трэба гандляваць цывілізавана, нават такім блізкім, братэрскім краінам, як Расія і Беларусь. Мы яшчэ год таму сказалі, што трэба змяніць сертыфікаты на тую прадукцыю — мясную і малочную, — якую ўвозіць Беларусь", — заявіў Дзмітры Мядзведзеў. Пры гэтым ён дадаў, што расійскі рынак хаця і вялікі, але ўсё ж абмежаваны, а свае вытворцы Расіі ўсё роўна даражэй.

Паміж тым, завяршэнне "малочнай вайны" падаравала яшчэ адну цікавую навіну — *"Русский Newsweek"* назваў прычыну канфлікту. Па меркаванню эксперта выдання, яна ў тым, што Расія прапанавала Мінску прадаць 12 малочных заводаў, у якіх былі зацікаўлены расіяне.

*"Русский Newsweek"* распаўсюдзіў інфармацыю, што дамова пра продаж была заключаная яшчэ перад тым, як Расія запланавала выдаць крэдыт Беларусі: пасля першага ж траншу прадаць заводы. Аднак гэтага так і не адбылося. Дзеля справядлівасці трэба дадаць, што беларускі бок таксама пакуль застаўся без апошняга траншу крэдыту, пра які як быццам бы існавала дамова.

Да гэтага часу цяжка адназначна назваць пераможцу "малочнай вайны". Хутчэй за ўсё, гэта не Беларусь — усё ж нават пасля пашырэння спісу дазволеных, пад забаронай застаюцца каля тысячы найменняў малочных вырабаў. Але дэмарш прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі быў дастаткова цікавым крокам.

## ▸ ПІСЬМЕННІКІ

# У ЕЎРАПЕЙСКАЙ СЯМ'І



**Асацыяцыя Еўрапейскіх пісьменніцкіх саюзаў (European Writers' Congress) на кангрэсе ў Марселі прыняла ў свае шэрагі Саюз беларускіх пісьменнікаў пад кіраўніцтвам Алеся Пашкевіча.**

Асацыяцыя разам з навапрынятымі сябрамі ўжо налічвае 48 арганізацый. Разам з Беларуссю прымалі літаратурную акадэмію Мальты і Саюз пісьменнікаў Славеніі. Асацыяцыя мае свой офіс у Брусэлі і падтрымліваецца Еўрапейскай камісіяй па культуры і адукацыі. Займаецца яна абаронай аўтарскіх правоў, што асабліва актуальна ў часы інтэрнэту, а таксама апякуецца пісьменнікамі, якіх пераследуе ўлада. Напрыклад, асацыяцыя абараняла ад пераследу Архана Памука, турэцкага пісьменніка, які потым стаў лаўрэатам Нобелеўскай прэміі.

Як паведаміў дэлегат еўрапейскага пісьменніцкага кангрэсу Міхась Скобла, цяпер рыхтуецца вялікі зборнік пад назвай "Еўропа: цэнзура і свабода творчасці". У сваім выступе на кангрэсе Міхась Скобла адзначыў, што толькі аднаго беларускага матэрыялу хапіла б на падобную кнігу. Як лічыць дэлегат, уключэнне Саюзу беларускіх пісьменнікаў у еўрапейскую асацыяцыю ўмацуе сілы творцаў, патрачаныя на вырашэнне праблемаў несвабоды. Многія калегі пыталіся дэлегата з Мінску і пра тое, ці праўда, што ў яго краіне за беларускую мову можна патрапіць у турму.

**Паводле "Радыё Свабода"**

## ▸ СЕМІНАР

# РЭАБІЛІТАЦЫЯ ДЗЯЦЕЙ

**Міжнародны семінар па інавацыйных падыходах да рэабілітацыі дзяцей з асаблівасцямі развіцця праходзіць у Мінску з 23 па 26 чэрвеня.**

Арганізатарам семінара выступае прадстаўніцтва Хрысціянскага дзіцячага фонду ў Беларусі пры фінансавай падтрымцы Швейцарскага ўпраўлення па развіцці і супрацоўніцтве. У мерапрыемстве бяруць удзел спецыялісты Міністэрства адукацыі, прадстаўнікі цэнтраў карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі і Беларускай асацыяцыі дапамогі дзецям-інвалідам і маладым інвалідам.

Для правядзення семінара запрошаны эксперт у галіне працы з дзецьмі з абмежаванымі магчымасцямі з Вялікабрытаніі Джон Харыс, які больш за 30 гадоў займаецца гэтымі праблемамі ў краінах Еўропы. Джон Харыс паведаміў, што гэта яго восьмы візіт у Беларусь. Падчас семінара ён будзе знаёміць беларускіх калег з новым падыходам — правядзеннем халістычнай ацэнкі патрэб дзіцяці і яго бацькоў.

"Гэты метад грунтуецца на тым, што падтрымка чалавеку з цяжкасцямі ў развіцці аказваецца не толькі 24 гадзіны сем дзён у тыдзень 365 дзён у год, але і з самых розных бакоў, самымі рознымі спецыялістамі, каб забяспечыць яму паўнавартаснае існаванне", — патлумачыў эксперт. Асаблівая ўвага, паводле слоў Харыса, надаецца працы з бацькамі, чые дзеці маюць асаблівасці развіцця, каб навучыць іх быць ўцягненымі ва ўсе стадыі заняткаў з дзіцем і павысіць эфектыўнасць яго рэабілітацыі.



Як адзначыў эксперт, у прымяненні атрыманых практычных навыкаў не абысціся без падтрымкі дзяржавы. Харыс выказаў упэўненасць, што дзяржаўныя структуры Беларусі будуць аказваць спрыянне грамадскім аб'яднанням, чыя дзейнасць звязана з рэабілітацыяй і падтрымкай дзяцей з асаблівасцямі развіцця.

**Юлія Міцкевіч, БелаПАН**

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ЗНОЎ МЫ ПРАЛЯЦЕЛІ, ЯК ФАНЕРА...

Сяргей Салаўёў.

**Зноў мы праляцелі, як фанера. Але пакуль што яшчэ не над Парыжам, а над Страсбургам. Над Парыжам мы праляцім крыху пазней, калі ў нашай дзяржаве анічога не зменіцца.**




На тыдні Еўропа заявіла пра фундаментальную рэч: статус спецыяльна запрошанага ў Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы (ПАСЕ) будзе вернуты парламенту Беларусі толькі пасля ўвядзення мараторыя на смяротную кару. Такое рашэнне прынята 23 чэрвеня на сесіі ПАСЕ ў Страсбургу.

Абмеркаванне беларускага пытання на сесіі пачалося з выступлення спецдакладчыка ПАСЕ па сітуацыі ў Беларусі Андрэа Рыгоні. Ён прадставіў даклад і праект рэзалюцыі, што прадугледжвае вяртанне беларускаму парламенту статусу спецзапрошанага.

На праведзеных пасля гэтага спрэчках віцэ-старшыня камітэта ПАСЕ па юрыдычных пытаннях і правах чалавека Хрыстас Пургурыдзіс прапанаваў вярнуць беларускаму парламенту статус спецыяльна запрошанага толькі пасля ўвядзення ў краіне мараторыя на смяротную кару.

Кажучы пра важнасць увядзення мараторыя на смяротнае пакаранне, Пургурыдзіс падкрэсліў: "У Беларусі расстрэльваюць людзей, а сем'ям пакараных не выдаюць іх целы і не паведамляюць, дзе іх пахавалі". Паводле слоў віцэ-старшыні камітэта ПАСЕ, "неабходна правесці яшчэ вельмі вялікую працу", перш чым надаць беларускаму парламенту статус спецыяльна запрошанага.

"У Беларусі адбываецца шмат няправільнага. Надаючы статус, нам неабходна выставіць беларускім уладам канкрэтныя ўмовы", — перакананы Пургурыдзіс.

Большасць дэпутатаў ПАСЕ прагаласавала за прыняцце гэтай папраўкі ў рэзалюцыю.

У дакуменце адзначаецца: "Звяртаючы ўвагу на тое, што Беларусь далёкая ад стандартаў Савета Еўропы ў галіне дэмакраты, вяршэнства закона і правоў чалавека, але за апошні час яе ўлады зрабілі важныя захады ў правільным накірунку, Асамблея пастанаўляе падахвочваць краіну да працягу гэтага працэсу шляхам устанаўлення з уладамі палітычнага дыялогу, у той жа час прапагваючы садзейнічаць умацаванню дэмакратычных сіл і грамадзянскай супольнасці ў краіне".

Разам з тым, гаворыцца ў дакуменце, нягледзячы на пазітыўныя змены, "сітуацыя ў Беларусі працягвае выклікаць заклапочанасць".

У прыватнасці, парламенцкія выбары ў верасні 2008 года не адпавядалі еўрапейскім стандартам, працягваецца пераслед і запалохванне актывістаў апазіцыі, палітычныя і праваабарончыя арганізацыі па-ранейшаму "сутыкаюцца з перашкодамі пры рэгістрацыі", журналісты недзяржаўных і замежных СМІ сутыкаюцца са складанасцямі пры атрыманні акрэдытацыі.

ПАСЕ заклікала ўлады да правядзення незалежнага расследавання па справе ваўкавыскіх прадпрымальнікаў з тым, каб "высветліць, ці з'яўляюцца гэтыя асобы палітзняволенымі, і калі гэта так, дамагчыся іх вызвалення".

Акрамя таго, Асамблея заклікае Мінск: зняць судзімасць з былых палітзняволеных для забеспячэння ім магчымасці ў поўным аб'ёме карыстацца сваімі грамадзянскімі і палітычнымі правамі; устрымацца ад пераследу і запалохвання актывістаў апазіцыі, спыніць практыку прымусовага прызыву на ваенную службу, дазволіць рэгістрацыю праваабарончай арганізацыі "Наша вясна", забяспечыць захаванне правоў грамадзян на свабоду сходаў, асацыяцый, свабоду слова і меркаванняў; рэфармаваць выбарчае заканадаўства Беларусі з улікам рэкамендацый АБСЕ.

Асобна ў рэзалюцыі агаворана: пакуль у беларускім парламенце "не будзе належным чынам прадстаўлена апазіцыя", дэлегацыя пазапарламенцкай апазіцыі будзе абавязкова запрашацца на кожную сесію ПАСЕ, а таксама "кожны раз, калі пытанне пра Беларусь будзе фігураваць у парадку дня камісіі ПАСЕ".

Юрыдычна рашэнне па Беларусі павінна быць афармленае 7 верасня на пасяджэнні Бюро ПАСЕ ў Парыжы.

Карацей, Беларусі не дапамаглі ні "мяса-малочная істэрыка" з Расіяй, ні дэмарш наконт АДКБ, ні скарачэнне ваенных кантактаў з Расіяй (нагадаем, што ў плануемых на восень вучэннях "Захад–2009" прыме ўдзел значна меншая колькасць расійскіх войск, чым планавалася раней). Не дапамог нават цмяны візіт у Беларусь еўракамісара Беніты Ферэра-Вальднер, які прайшоў таксама на мінулым тыдні.

Дарэчы, бадай адзіным вынікам гэтага візіту стала тое, што беларуская грамадскасць нарэшце даведалася, чаго ад Беларусі чакае Еўропа. ЕС чакае ад Беларусі працягу прагрэсу ў пяці асноўных галінах: рэформа выбарчага заканадаўства, забеспячэнне свабоды аб'яднанняў, стварэнне ўмоў для дзейнасці НДА, свабода прэсы, зняцце абмежаванняў для свабоды асобы. А вось беларускія адносіны з Расіяй, здаецца, Еўропу не так хвалююць. Гэты аспект не ўлічылі тыя, хто разлічвае на нармальныя адносіны з ЕС. Так што трэба было б думаць раней. Бо фактычна вызваленне Беларусі ад смяротнага пакарання з'яўляецца шостай умовай.

Выглядае, што спадарыня Вальднер прыехала ў Беларусь з ультыматумам, які яна і выклала вышэйшаму кіраўніцтву краіны.

Тым не менш, кіраўнік мінскага офіса АБСЕ Ханс-Йохан Шмідт у эксклюзіўным інтэрв'ю БелаПАН заявіў, што ён з'яўляецца перакананым прыхільнікам развіцця дыялогу паміж Беларуссю і Еўропай. "Я настойваў і працягваю настойваць на неабходнасці развіваць станоўчыя адносіны з Беларуссю", — заявіў палітык.

Пры гэтым ён лічыць, што было б няправільным "патрабаваць фундаментальных радыкальных зменаў, як гэта робяць некаторыя палітыкі і грамадскія арганізацыі", бо "гэта значыць патрабаваць змены палітычнага рэжыму".

"Такія патрабаванні правакуюць жорсткае супраціўленне з боку дзяржаўных структур. І ў цяперашніх беларускіх умовах рэалізаваць гэтыя патрабаванні немагчыма. А значыць, яны супярэчаць інтарэсам усіх тых, хто зацікаўлены ў развіцці адносінаў паміж Захадам і Беларуссю і ў падрыхтоўцы глебы эвалюцыйных зменаў, напрыклад, у правядзенні эканамічных рэформ, якія патрабуюцца ў пераходныя і крызісныя перыяды", — лічыць Шмідт.

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ




### ВАСІЛЬ БЫКАЎ

Сёлета 19 чэрвеня Народнаму пісьменніку Беларусі Васілю Уладзіміравічу Быкаву споўнілася б 85 гадоў. А 22 чэрвеня 2003 года, у дзень пачатку Айчыннай вайны, пра якую Быкаў пісаў усё жыццё, творца сышоў у іншы свет. Найбольш вядомыя творы — аповесці "Знак бяды", "Трэцяя ракета", "Дажыць да світання", "Альпійская балада", "Мёртвым не баліць", "Сотнікаў" — паставілі Васіля Быкава ў адзін шэраг з выбітнымі майстрамі ваеннай прозы ХХ стагоддзя.

Мерапрыемствы па ўшанаванню памяці пісьменніка прайшлі па ўсёй Беларусі. Але найбольш знакавай падзеяй, відаць, з'яўляецца выхад у свет двухтомніка «Васіль Быкаў. Гісторыя жыцця» аўтарства журналіста Сяргея Шапрана. У кнізе сабраныя ўспаміны пра Васіля Быкава такіх асобаў, як Міхаіл Гарбачоў, Чынгіз Айтматаў, Рыгор Барадулін, Святлана Алексіевіч ды іншых. Апублікаваныя лісты з прыватнай перапіскі пісьменніка са сваімі сябрамі, франтавая перапіска, розныя дакументы, архіўныя матэрыялы.

### АЛЕСЬ ПУШКІН



Мастак Алесь Пушкін стаў лаўрэатам прэміі "За свабоду думкі" імя Васіля Быкава. Уручэнне прэміі, якую заснаваў рух "За свабоду", адбылося ў Дзень нараджэння пісьменніка 19 чэрвеня ў яго роднай вёсцы Бычкі Ушацкага раёна.

Прэміяй уганароўваецца асобы, якія плённа працуюць на ніве беларушчыны, зрабілі значны ўнёсак у развіццё нацыянальнай думкі.

Алесь Пушкін вядомы як аўтар маніфеста соцарта, арганізатар перфомансаў. За найбольш вядомы з іх — «Гной для прэзідэнта», — калі мастак перавярнуў каляску з гноем перад адміністрацыяй Аляксандра Лукашэнкі, быў асуджаны да двух гадоў пазбаўлення волі ўмоўна. Удзельнік мноства мастацкіх выстаў, Алесь Пушкін займаўся роспісам будынкаў, кніжнай графікай.

Летась прэмію "За свабоду думкі" атрымалі пісьменнікі Рыгор Барадулін і Уладзімір Арлоў, а таксама палітык і пісьменнік Павел Севярынец.

### УЛАДЗІМІР МАКЕЙ

Кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта Беларусі Уладзімір Макей заявіў пра гатоўнасць да палітычнага абмену: мараторый на смяротную кару ўзамен на вяртанне Беларусі статусу адмыслова запрошанага ў Парламенцкую асамблею Савета Еўропы.

"Мяркую, не варта разглядаць ужыванне ў беларускім заканадаўстве смяротнай кары як штосьці застылае, — адзначыў Уладзімір Макей на выязным пасяджэнні Грамадска-кансультатыўнай рады пры Адміністрацыі прэзідэнта, якое прайшло ў жодзінскай турме. — Грамадства, дзяржава, заканадаўчыя сістэмы — усё гэта развіваецца, і, адпаведна, змяняюцца адносіны да дадзенай праблемы". Уладзімір Макей адзначыў важнасць гэтага пытання ў кантэксце перспектыў уступлення Беларусі ў Савет Еўропы. Па словах кіраўніка "Чырвонага дома", калі Беларусі будзе вернуты статут адмыслова запрошанага ў ПАСЕ, то пытанне пра мараторый неабходна будзе вырашаць у бліжэйшай будучыні. "Адпаведная працоўная група будзе створаная ў беларускім парламенце, і парламент выкажа сваё меркаванне па гэтым пытанні. Пытанне гэтае вельмі далікатнае", — зазначыў Макей.

Дарэчы, па словах кіраўніка офіса АБСЕ ў Мінску Ханса-Йохана Шмідта, Еўракамісія гатовая прафінансаваць інфармацыйную кампанію ў падтрымку адмены смяротнай кары.

Летась у Беларусі былі прыведзеныя ў выкананне чатыры прысуды да смяротнай кары. Агульную статыстыку па смяротнай кары ўлады не агучваюць.



АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ

# НЕЗАЎВАЖАНЫ ЮБІЛЕЙ

Сяргей Нікалюк



**У гэтым годзе спаўняецца 100 гадоў са дня выхаду зборніка "Вехі", гэтай, па вызначэнні Леніна, "энцыклапедыі ліберальнага рэнегацтва". Аўтары "энцыклапедыі" прадказвалі надыходзячую катастрофу.**

Асноўную прычыну катастрофы яны бачылі ў імкненні інтэлігенцыі "будаваць жыццё па розуму, адарваўшы яго ад аб'ектыўных пачаткаў гісторыі", калі думка чалавечая, захопленая сваім палётам, "імкнецца сама з сябе ўзнавіць усю рэчаіснасць, замяніўшы яе арганічныя законы сваімі адцягненымі патрабаваннямі".

## Простыя рэцэпты

Эканамічны крызіс і надыходзячыя чарговыя прэзідэнцкія выбары зрабілі зноў актуальным пошук адказу на пытанне "Што рабіць?" Недахопу ў прапановах няма. Усе, каму паводле штатнага раскладу належыць выказвацца, ужо пачалі гэта рабіць. Такую актыўнасць можна было б толькі вітаць, калі б не адно "але": як і сто гадоў таму, выразна прасочваецца ўсеагульнае імкненне да стварэння аўтарамі сваёй уласнай рэчаіснасці, прычым рэчаіснасці вельмі спрошчанай.

Прастата ў разуменні спараджае спрошчанасць рэцэптаў па ўдасканаленні выдуманай рэчаіснасці. Напрыклад, Анатоль Лябедзька спіс сваіх прапаноў адкрывае наступнай фразай-прадмовай: "Наш рэцэпт просты, як пяць пальцаў". Распачынаюцца "пяць пальцаў" прапановай даваць чалавеку і пакідаць яму 80 працэнтаў заробленага, а заканчваюцца заклікам кантраляваць службоўцаў і палітыкаў. Прапанова, безумоўна, правільная, аднак ва ўмовах аўтарытарнай улады яна чымсьці падобная да заклiку павесіць ката на шыю званок. Дзе той суб'ект, які на такі ўчынак адважыцца?

У Беларусі, паводле сакавіцкага апытання Незалежнага інстытута сацыяльна-эканамічных і палітычных даследванняў (НІСЭПД), 74 працэнта рэспандэнтаў лічаць, што "большасць не зможа пражыць без апекі дзяржавы". Пры такой сацыялогіі разлічваць на эфектыўны "народны кантроль" не даводзіцца, дый попыту на яго няма. Што датычыць прапановы пакідаць чалавеку 80 працэнтаў заробленага, то не зусім зразумела, дзе гэтага канкрэтнага чалавека шукаць. Калі сярод шматлікай арміі бюджэтнікаў, дык яны ж не працуюць, а служаць. Іх служэнне ажыццяўляецца па-за рынкам, а таму яны атрымліваюць сваю частку грамадскага пірага праз механізм дзяржаўнага пераразмеркавання. Пра пенсіянераў, якіх у рэспубліцы ўжо больш за 2,5 мільёна, я і не кажу. У гэтых умовах прапанова пакідаць 80 працэнтаў заробленага тым, хто сапраўды зарабляе, азначае для большасці беларусаў пераход да існавання на мяжы фізічнага выжывання, а магчыма, і па-за мяжой.

**Табліца 1. Размеркаванне адказаў на пытанне: "Калі Вы цікавіцеся палітыкай, то ў чым выяўляецца гэта цікавасць?", %** *(магчымы больш за адзін адказ)*

| Варыянт адказу | 03'09 |
|---|---|
| Галасую на выбарах | 48.9 |
| Уважліва сачу за інфармацыяй пра палітычныя падзеі | 31.0 |
| Абмяркоўваю палітычныя падзеі з сябрамі | 28.0 |
| Удзельнічаю ў палітычных акцыях, дэманстрацыях, мітынгах, пікетах, страйках | 2.4 |
| Удзельнічаю ў арганізацыі і правядзенні выбарчых кампаній | 2.1 |
| Падпісваю лісты, звароты | 1.5 |
| Прысутнічаю на мерапрыемствах якой-небудзь палітычнай партыі (руху) | 1.1 |
| З'яўляюся сябрам палітычнай партыі (руху) | 1.0 |
| Палітыкай не цікаўлюся наогул | 26.5 |

## Выдаючы жаданае за сапраўднае

Звернемся, аднак, да "Стратэгіі дзейнасці еўрапейскіх сіл Беларусі". Яе аўтары выходзяць з перакананння, што беларускае грамадства ў асноўным гатовае да "дэмакратычных механізмаў кіравання дзяржавай". На чым заснаваная такая гатоўнасць — сказаць цяжка. Прынамсі падчас сацыялагічных апытанняў выявіць яе не атрымліваецца. Безумоўна, у асноўнай сваёй масе беларусы не супраць дэмакратыі (такіх толькі 6%). Усё пытанне ў тым, які сэнс яны ўкладваюць у гэта паняцце. Большасць (43%) выступае за дэмакратыю своеасаблівую, якая адпавядае нацыянальнай спецыфіцы Беларусі, і ў гэтым яны цалкам салідарызуюцца з кіраўніком дзяржавы. Прыхільнікаў заходняй дэмакратыі істотна менш — 28%. Яшчэ 12% настальгуюць па дэмакратыі савецкага ўзору.

Калі ў міжасобасных адносінах прынцып "ты мне — я табе" лічыцца цалкам прымальным, то пераносіць яго на свае адносіны з дзяржавай, дэманструючы тым самым сваю грамадзянскасць, у беларусаў асаблівага жадання няма. Пры адказе на пытанне: "Якому прынцыпу адносін паміж дзяржавай і яе грамадзянамі Вы асабіста аддаяце перавагу?", абсалютная большасць (67%) пагадзілася з тым, што дзяржава павінна клапаціцца пра людзей, а вось ахвяраваць сваім асабістым дзеля дабрабыту дзяржавы выказалі гатоўнасць толькі 10%. Яшчэ 22% лічаць за лепшае трымацца ад дзяржавы як мага далей, таму абралі варыянт адказу: "Людзі павінны праявіць самастойнасць і самі паклапаціцца пра сябе". Звярніце ўвагу, частка "самастойных" апынулася на 6 працэнтных пунктаў менш за колькасць прыхільнікаў заходняй дэмакратыі. Таму пры ацэнцы ступені еўрапейскасці беларусаў да вынікаў сацыялагічнага апытання варта ставіцца без фанатызму.

**Табліца 2. Размеркаванне адказаў на пытанне: "Калі Вы цікавіцеся палітыкай, то ў чым выяўляецца гэтая цікавасць?" у залежнасці ад узросту, адукацыі і даверу да прэзідэнта, %**

| Варыянт адказу | Галасую | Сачу | Абмяркоўваю | Не цікаўлюся |
|---|---|---|---|---|
| *Узрост:* | | | | |
| 18–29 гадоў | 33.3 | 30.6 | 32.1 | 35.7 |
| 30–39 гадоў | 48.5 | 36.9 | 30.8 | 20.0 |
| 40–49 гадоў | 46.4 | 37.4 | 30.8 | 23.5 |
| 50–59 гадоў | 53.4 | 35.1 | 31.9 | 26.7 |
| 60 гадоў і старэй | 61.5 | 20.5 | 18.5 | 25.9 |
| *Адукацыя:* | | | | |
| Пачатковая | 54.1 | 9.4 | 7.6 | 38.2 |
| Няпоўная сярэдняя | 44.8 | 23.5 | 19.5 | 36.3 |
| Сярэдняя агульная | 48.1 | 28.8 | 29.4 | 28.1 |
| Сярэдняя спецыяльная | 48.2 | 35.7 | 33.2 | 22.2 |
| Вышэйшая | 51.5 | 51.5 | 38.3 | 12.3 |
| *Давер да прэзідэнта:* | | | | |
| Давяраю | 61.7 | 20.5 | 20.1 | 24.6 |
| Не давяраю | 36.1 | 34.9 | 36.9 | 26.4 |

Чаму ж у свой час Ленін так не ўпадабаў вехаўцаў? Звернемся да арыгінала: "Асноўнай праявай інтэлігенцкай свядомасці, якая прыводзіць да крушэння, з'яўляецца рацыяналістычны утапізм, імкненне ўладкаваць жыццё разумна, адарваўшы яго ад аб'ектыўных пачаткаў гісторыі, ад арганічных асноў грамадскага парадку, ад жыватворных святыняў народнага быцця". Тады, у пачатку мінулага стагоддзя, народная свядомасць была найперш рэлігійная. Таму інтэлігенцыя са сваімі гатовымі формуламі, часцей за ўсё запазычанымі на Захадзе, па меркаванні вехаўцаў, "замест таго, каб быць сілай стваральнай і прагрэсіўнай, становіцца пачаткам разбуральным і рэвалюцыйным".

Ад рэлігійнай свядомасці ў сучасных беларусаў мала што засталося. Ідучы ў нагу з часам, змяніла свае тэарэтычныя прыхільнасці і доблесная праслойка — інтэлігенцыя. Яна выкінула вучэнне пра класавае змаганне на сметнік гісторыі ды пачала асэнсоўваць айчынную незаходнюю сацыяльную рэальнасць у катэгорыях сучасных заходніх тэорый. Інтэрнэт і старонкі недзяржаўных газет запоўніліся развагамі пра сярэдні клас, сацыяльны кантракт і пра іншыя замежныя цікавосткі. Беларускае грамадства, гатовае да "дэмакратычнага механізма кіравання дзяржавай", — яшчэ адзін прыклад такога кшталту творчага пераасэнсавання.

## У пошуках знешняй мяжы рэжыму

Пра тое, што працэс супрацьстаяння ўлады і апазіцыі не варта разглядаць у якасці лакаматыва сучаснай беларускай гісторыі, я пісаў у папярэдній "Азбуцы палiталогіі" (гл. "НЧ" № 21 ад 12 чэрвеня). Пяройдзем цяпер да працэсу супрацьстаяння ўлады і грамадства. Але перш чым гэта зрабіць, паміж імі неабходна правесці лінію падзелу. Намалюем на лісце паперы роўнабаковы трохкутнік і адсячэм паралельнай аснове лініяй яго вяршыню. Дапусцім, што гэта дзяржаўныя службоўцы. Паводле любога сусветнага класіфікатара іх варта аднесці да дзяржавы. Колькі іх у Беларусі? Знаўцы сцвярджаюць, што не менш за 50 тысяч. На 7 мільёнаў дарослага насельніцтва гэта нямнога.

Такая ў нас на першы погляд кампактная і адначасова моцная дзяржава. На жаль, адной паралельнай рысай нам не абмежавацца. Ёсць яшчэ і людзі ў пагонах. Іх у 4–5 разоў больш, чым дзяржаўных службоўцаў, але і гэта яшчэ не ўсё. Вышэй ужо былі згаданы бюджэтнікі. Гэта яны ставяць клізмы ў лякарнях і правяраюць сшыткі ў школах, а ў вольны ад асноўнай працы час падлічваюць галасы на выбарчых участках. У верасні 2008 года, паводле афіцыйных дадзеных ЦВК, агульная колькасць толькі ўчастковых камісій склала 69849 чалавек, і ўся гэта армія з пастаўленай дзяржавай задачай справілася! Можа, уся справа ў тым, што, насуперак уяўленням палітычных рамантыкаў ад апазіцыі, і маладзенькія медсёстры, і першыя настаўніцы з "сівымі пасмачкамі" з'яўляюцца часткай дзяржавы, а не грамадства.

А ёсць жа яшчэ работнікі дзяржпрадпрыемстваў, чый матэрыяльны дабрабыт вызначаецца стаўкай першага разраду і сістэмай галіновых каэфіцыентаў. Ёсць бізнесмены, занятыя сумесна з дзяржаўнымі службоўцамі "засваеннем" бюджэтных рэсурсаў. Ёсць, урэшце, 2,5 мільёна пенсіянераў, якія на трох прэзідэнцкіх выбарах дружна галасавалі за Лукашэнку. Матывацыя такога галасавання зразумелая. Яна неаднаразова апісвалася сацыёлагамі. Незразумела толькі, дзе ж варта правесці рысу, якая аддзяляе дзяржаву ад грамадства. Вунь тая канкрэтная бабулька, што працягвае руку ў пераходзе, яна ўжо грамадства або яшчэ дзяржава? Незразумела. А калі партыйныя актывісты выбудоўваюць стратэгію па змаганні з "антынародным рэжымам", то яны змагаюцца за інтарэсы бабулькі з працягнутай рукой або супраць?

Тое, што шмат каму здаецца натуральным (аддзяленне грамадства ад дзяржавы), у рэальнасці адбылося пакуль толькі ў краінах заходняй дэмакратыі. Гэта хутчэй выключэнне, чым правіла. Аддзяліцца ад дзяржавы можа толькі грамадства, якое складаецца з грамадзян. Таму што грамадзянін, у адрозненне ад падданага ,— гэта аўтаномная ад дзяржавы асоба. Такое азначэнне. Толькі грамадства, якое складаецца з аўтаномных асоб, можа стаць апорай апазіцыі, як, зрэшты, і апорай дзяржаве. Для таго, каб у гэтым пераканацца, рэкамендую яшчэ раз праглядзець вынікі адказу на пытанне: "Якому прынцыпу адносін паміж дзяржавай і яе грамадзянамі Вы асабіста аддаяце перавагу?".

І ў якасці заключэння прапаную некалькі прапісных ісцін:

– любая сацыяльная рэальнасць складаней за нашы ўяўленні пра яе;

– няма і не можа быць простых рэцэптаў па мэтанакіраванаму зменненню рэчаіснасці;

– на раз, два, тры, чатыры, пяць толькі зайчыкі выходзяць пагуляць, але такія шпацыры, як правіла, нічым добрым не заканчваюцца.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# РАБОЧЫЯ ЦІКАВЯЦЦА АНТЫКРЫЗІСНАЙ ПЛАТФОРМАЙ АПАЗІЦЫІ

Алена Варажбей

**На мінулым тыдні актывісты АГП і яе моладзевай арганізацыі раздалі ў Мінску больш за 13 тысяч экземпляраў "Народнай волі" з антыкрызіснымі прапановамі апазіцыі. Вынікі "хаджэння ў народ" аказаліся паказальнымі.**

**Калі а палове на сёмую раніцы кіраўнік АГП Анатоль Лябедзька і двое актывістаў "Маладых дэмакратаў" прыйшлі на прахадную Мінскага трактарнага завода, перад імі ўзнік прадстаўнік службы бяспекі прадпрыемства. Ён запатрабаваў спыніць раздачу "Народнай волі". "Нам ужо ў тры гадзіны ночы паведамілі, што вы тут будзеце", — сказаў ахоўнік. А праз 7 хвілін з'явілася міліцэйская машына з аўтаматчыкамі.**

**"Міліцыянты паводзілі сябе агрэсіўна і паспрабавалі сілай спыніць раздачу газеты, — распавёў Анатоль Лябедзька. — Але за нас заступіліся рабочыя. Іх рэзка негатыўная і эмацыйная рэакцыя прымусіла аўтаматчыкаў сысці".**

**Аднак калі Лябедзька з адным актывістам адышлі за газетамі, міліцыянты схапілі другога — Сяргея Клюева, які застаўся ля прахадной. Па дарозе ў апорны пункт Сяргею пагражалі скласці пратакол за "супраціўленне праваахоўным органам". У будынку міліцыі сітуацыя кардынальна змянілася. Начальства, не саромеючыся ў выразах, аблаяла падначаленых, якія затрымалі актывіста. А хлопцу нават прапанавалі напісаць скаргу на незаконнае затрыманне.**

**Цікава і тое, што калі хлопца забралі, яго выклікаліся замяніць дзве жанчыны. Яны раздавалі "Народную волю" разам з Анатолем Лябедзькам і Міколам Сергіенкам. За паўгадзіны яны распаўсюдзілі 2 тысячы газет. "Быў толькі адзін інцыдэнт, калі мужчына падышоў да мяне і сказаў: "Нацыяналіст". А вось словаў падзякі і падтрымкі мы атрымалі дзесяткі", — адзначыў кіраўнік АГП.**

**Што ж уяўляе сабой антыкрызісная платформа АДС чытачам "НЧ" тлумачаць ініцыятары яе распрацоўкі і прыняцця кіраўнік Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька і намеснік старшыні АГП эканаміст Леў Марголін.**

## Анатоль Лябедзька:

"Улада робіць стаўку на крэдыты, АДС — на Антыкрызісную платформу"



***— Спадар Лябедзька, як Вы ацэньваеце сітуацыю ў Беларусі ў сувязі з крызісам?***

— Праблемы нарастаюць, бы снежны ком. Улады імкнуцца вырашыць усе праблемы выключна за кошт знешніх запазычанняў. Каб закрыць дзіркі, у гэтым годзе Чырвоны дом збіраецца ўзяць каля 7 мільярдаў долараў крэдытаў. У астатнім усё без зменаў. На складах сабралася прадукцыі на 7,3 трыльёна беларускіх рублёў, гэта 95 працэнтаў сярэднямесячнай вытворчасці, але канвеер працягвае штампаваць тое, на што няма попыту. Беларускі экспарт за 2009 год скараціўся на 48,6 працэнта ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года. Таму ўсялякія заявы пра рост унутранага валавога прадукту з'яўляюцца качкай, нафаршыраванай хлуснёй і дэзінфармацыяй.

Ужо сёння людзі рэальна згубілі ў даходах прыкладна 20–25 працэнтаў. Калі гэта тэндэнцыя працягнецца, то сітуацыю не выратуе ужо нічога.

***— Калі каротка, у чым сутнасць Антыкрызіснай платформы, якую прапануюць уладзе і насельніцтву дэмакратычныя сілы?***

— Антыкрызісная платформа — гэта перамены. Не радыкальныя, а прадуманыя і пралічаныя. Неабходны грамадскі і грамадзянскі кантроль над уладай. Чыноўнікі павінны рабіць справаздачу за кожны выдаткаваны рубель. Трэба знізіць цэны да ўзроўню заробкаў і пенсій. Трэба разняволіць прадпрымальнікаў і даць ім свабоду ствараць працоўныя месцы.

***— Многія людзі баяцца, каб не было яшчэ горш.***

— Платформа — гэта не заклік "разбурыць дашчэнту, а затым..." Гэта адказныя рэформы сістэмы кіравання.

Наш рэцэпт просты: давярай чалавеку — і пакідай яму 80 працэнтаў заробленага; дай беларусу зямлю і ўласнасць; дапамагай малазабяспечаным людзям, а не безадказным юрыдычным асобам; не кашмар бізнес — захоўвай свабодную канкурэнцыю і гандаль; кантралюй чыноўніка і палітыка.

***— Што атрымаюць людзі і краіна, калі антыкрызісная праграма апазіцыі будзе рэалізавана?***

— Антыкрызісная платформа — гэта новыя магчымасці для чалавека, сям'і, прадпрыемства, краіны. Калі яе рэалізаваць у поўным аб'ёме, то краіна атрымае каля 15 мільярдаў долараў дадатковага прыбытку.

Кожная сям'я толькі на прадуктах харчавання штогод будзе эканоміць прыкладна да 300 долараў, за кошт нізкіх цэнаў і свабоднай канкурэнцыі вытворцаў. На набыцці адзення, абутку, бытавой тэхнікі мы будзем эканоміць яшчэ каля 200 долараў штомесяц. Жыллё стане значна больш даступным. 600 долараў за квадратны метр — гэта сярэдняя цана жылля для Мінска. У абласцях і раёнах яна будзе на 30–40 працэнтаў ніжэй.

Прадпрымальнікам і бізнесу будзе лёгка ствараць працоўныя месцы. Ліквідацыя непатрэбнай бюракратыі (да 30 працэнтаў), зніжэнне падаткаў, лібералізацыя вытворчасці і гандлю пакінуць на руках у бізнесу больш 5 мільярдаў долараў. У бюджэце будзе больш грошай на выплату пенсій, дапамогу для чарнобыльцаў і заробкі бюджэтнікам. Замест зневажальнай дапамогі па беспрацоўю ў 20 долараў сёння, АДС прапануюць павысіць яе як мінімум да 120 у месяц. Дзяржава таксама абавязваецца фінансаваць перанавучанне звольненых і атрыманне імі іншых спецыяльнасцяў.

Мы прапануем набор мер, якія павінны стымуляваць выхад эканомікі з шэрай зоны на легальнае становішча. Гэта вялізны патэнцыял для напаўнення бюджэту. АДС выступаюць за ўзмацненне кантролю за выдаткаваннем атрымоўваемых крэдытаў. Кожны чалавек павінен мець магчымасць выйсці на сайт ураду і азнаёміцца з інфармацыяй пра атрыманыя рэсурсы і пра тое, на што яны патрачаны. Гэта хоць нейкая страхоўка ад маштабнай карупцыі.

***— Вы пайшлі на завадскія прахадныя з антыкрызіснымі матэрыяламі апазіцыі. Як Вас сустрэў рабочы клас?***

— Цудоўна. На трактарным заводзе нават узнікалі чэргі, з усіх бакоў цягнуліся рукі за "Народнай воляй", якая апублікавала нашы артыкулы і інтэрв'ю па выхаду з крызісу. Для мяне гэта самая дакладная сацыялогія. Людзі ведаюць, што можа даць улада, і яны хочуць ведаць, што прапануе апазіцыя.

Перспектывы трывожныя. Той жа трактарны завод пераходзіць на чатырохдзённы працоўны тыдзень. На МАЗе ўжо прайшлі скарачэнні каля трох тысяч чалавек. У рэгіёнах сітуацыя яшчэ больш складаная. Напэўна, упершыню за 15 гадоў узнікла сітуацыя, калі попыт на пазітыўную альтэрнатыву, якую прапануе апазіцыя, штодзень узрастае.

Дарэчы, Аб'яднаная грамадзянская партыя прапанавала мінчанам паслугу — дастаўку антыкрызісных матэрыялаў дадому. Любы жыхар сталіцы можа патэлефанаваць у офіс АГП па нумары 289-50-09 і назваць адрас, куды іх даставіць. Практычна ў той жа дзень ён знойдзе ў сваёй паштовай скрыні выданні з антыкрызіснымі прапановамі дэмакратычных сілаў. Гэтай паслугай ужо скарысталіся мінчане, якія пражываюць на вуліцы Няміга, Захарава, Л. Украінкі, праспекце Пераможцаў.

## Леў Марголін:

"Лібералізацыя эканомікі немагчыма без лібералізацыі ў грамадстве"



***— Чаму беларускі ўрад так і не прадставіў грамадству ніякай антыкрызіснай праграмы?***

— Беларускія ўлады жывуць, так бы мовіць, у паралельнай прасторы. Для іх усё, што робіцца ў нашай эканоміцы, гэта праявы сусветнага фінансавага крызісу. Інакш кажучы, мы проста апынуліся не ў той час і не ў тым месцы. "У нас выдатная прамысловасць, выдатная сельская гаспадарка, пра будаўніцтва і транспарт і казаць няма чаго, — сцвярджаюць яны. — Што скараціўся попыт на нашу прадукцыю, гэта не віна наша, а бяда. Гэтую навалу трэба проста перачакаць, як навальніцу, і ўсё вернецца да ранейшага стану". Адсюль выснова: трэба шукаць грошы, каб не спыняць вытворчасць і адначасова падвысіць намаганні па продажу прадукцыі. Калі ўдасца перачакаць крызіс, то пры першых прыкметах ажыўлення мы зноў будзем на кані.

***— Можа, яно і на самай справе так?***

— Ні ў якім разе. Крызіс наш мае свае, беларускія карані, і пачаўся ён не ўчора. У яго аснове ляжыць неэфектыўная эканамічная мадэль савецкага кшталту. Толькі шматмільярдныя расійскія датацыі ў выглядзе танных нафты і газа дазвалялі ёй больш-менш удала існаваць апошнія 15 гадоў. Скончыліся датацыі — скончылася шчасце. Гэта толькі спадар А. Тур лічыць, што падчас крызісу злачынна рабіць рэформы. У рынкавай эканоміцы толькі падчас крызісу гэтым і займаюцца, таму праз два-тры гады на расійскім рынку нас будзе сустракаць нечаканая канкурэнцыя з боку больш якасных і танных тавараў, выробленых на расійскай тэрыторыі японскімі, еўрапейскімі і паўднёвакарэйскімі фірмамі.

Сапраўдная лібералізацыя эканомікі немагчыма без лібералізацыі ў грамадстве. Мы ніколі не атрымаем сапраўдных інвестыцый — не толькі замежных, але і ўнутраных — пакуль у краіне будзе кіраваць не закон, прыняты дэмакратычным парламентам, а ўказы і дэкрэты. З другога боку, сапраўдная лібералізацыя ў сферы бізнесу падрывае асновы аўтарытарнага рэжыму, таму тое, што робіцца цяпер, — гэта не больш чым дэкарацыя. Ну, сапраўды, ці можна лічыць гэта лібералізацыяй, калі гранічныя надбаўкі на асобныя віды тавараў не адмяняюцца, а падвышаюцца з 20% да 30%. На самай справе, зроблены толькі першы крок: спрашчэнне рэгістрацыі бізнесу, і другіх пакуль не бачна.

***— А што прапануюць Аб'яднаныя дэмакратычныя сілы?***

— Аб'яднаныя дэмакратычныя сілы прапанавалі ўраду і грамадству сваю антыкрызісную платформу. Гэта насамрэч іншая філасофія народнай гаспадаркі. Тут няма магчымасці, каб падрабязна распавесці пра яе. Але скажу, што ў яе аснове ляжаць тры асноўныя прынцыпы.

Па-першае, гэта роўныя правы і эканамічная свабода ўсіх суб'ектаў эканомікі, незалежна ад формы ўласнасці. Ніякіх прагнозных паказчыкаў. Вытворчасць павінна адпавядаць попыту. Ніякага дырэктыўнага цэнаўтварэння. Нягледзячы на прысутнасць Дзяржкамцэн, цэны ў нас толькі растуць. На Захадзе такой установы няма, а цэны падаюць. Ніякіх абмежаванняў дробнаму бізнесу, хай наймаюць людзей, хай скарачаюць беспрацоўе.

Па-другое, скарачэнне бюракратычнага апарату, скарачэнне бюджэтных выдаткаў на падтрымку стратных прадпрыемстваў. Тое, што павінна памерці — усё роўна памрэ. Але адначасова — падвышэнне дапамогі па беспрацоўі да памераў пражытковага мінімуму, дзяржаўныя праграмы перападрыхтоўкі кадраў і перасялення іх пры неабходнасці туды, дзе ёсць працоўныя месцы.

Па-трэцяе, выкарыстанне замежных крэдытаў не на падтрыманне абменнага курсу, а на неадкладнае рэфармаванне эканомікі і дапамогу тым, хто пацярпеў ад крызісу. Больш падрабязна з платформай можна азнаёміцца на інтэрнэтсайтах.

**Антыкрызісную платформу і матэрыялы па пераадоленню крызісу можна прачытаць на сайтах ucpb.org; udfb.org**

ЛАЎРЭАТЫ

# ВОЛЬНЫ ТВОРЦА І ПАТРЫЁТ

**Вольны мастак, нонканфарміст Алесь Пушкін ладзіць перформансы, удзельнічае ў грамадскіх кампаніях, робіць пастаноўкі ў тэатры, піша дэкарацыі. У цэрквах і касцёлах застануцца абразы і роспісы, зробленыя ім. Алесь — шчыры і гасцінны чалавек. Моладзь, што пабывала ў яго на сядзібе, наперабой расказвала пра катанне на конях, пра маляўнічы пейзаж за рэчкай. Летась, калі прэмію "За Свабоду думкі" атрымліваў Павел Севярынец, каля сядзібы ў Бычках цёплыя словы пра яго сказаў мастак Алесь Пушкін. І ў сваім стылі перформансу не забыўся пажадаць Паўлу сямейнага шчасця і паху цёплых дзіцячых пялюшак. Сёлета Алесь Пушкін сам стаў лаўрэатам гэтай прэміі, пасля ўручэння якой у Бычках, на радзіме Васіля Быкава, не адмовіўся адказаць на пытанні Элы Дзівінскай.**

*— Спадар Алесь, мястэчка Бобр Крупскага раёна і ёсць ваша малая радзіма?*

— Так, там я нарадзіўся 6 жніўня 1965 года. А ў 1978 годзе паступіў у Рэспубліканскую школу-інтэрнат па музыцы і выяўленчаму мастацтву імя Ахрэмчыка. Вучыўся ў Шарыпы. У 1983 годзе паступіў на першы курс манументальна-дэкаратыўнага мастацтва Тэатральна-мастацкага інстытута.

*— Вы бунтар з дзяцінства або са студэнцкіх часоў, з вашага знакамітага першага перформансу ў 1989 годзе?*

— Са школы. У 1982 годзе я ўдзельнічаў у стыхійных выступленнях вучняў супраць самаўпраўства адміністрацыі: складалі петыцыі, патрабаванні да адміністрацыі, абвяшчалі галадоўкі і г.д. У 1984 годзе, пасля заканчэння першага курса, быў прызваны ў войска, служыў у 40-й арміі, у Афганістане. У 1986 годзе дэмабілізаваўся і аднавіўся на 2-гі курс інстытута. У 1988 годзе ўдзельнічаў у студэнцкім руху — у Другім Вальным сойме моладзевых беларускіх суполак у Вільні, у першых Дзядах у 1988-м… 25 сакавіка 1989 года арганізаваў першы перформанс — святкаванне 71-х угодкаў БНР, тым самым распачаўшы сацарт у беларускім мастацтве.

Мае першыя выставы і перформансы адбываліся ў сценах БДТМ. Арышт на 15 сутак, распачатая крымінальная справа за святкаванне Дня Волі. 14–21 ліпеня 1989 года Мінскі гарадскі суд прыгаварыў мяне за гэта да двух гадоў умоўна з пяцігадовым паражэннем у правах.

*— Здаецца, што ў вашым жыцці, таксама, як у Васіля Быкава, шмат што звязана з Віцебскам?*

— Пасля інстытута я абраў накіраванне на працу ў Віцебск. 25 сакавіка 1991 года ўдалося зладзіць там першую персанальную выставу артэфактаў дэкаратыўнага мастацтва, сацарту ў выставачнай залі АНМЦ Народнай творчасці, што па вуліцы Леніна, 18. Гэта выстава была першым новым крокам у постсавецкім мастацтве Віцебска. Упершыню сацарт з'явіўся ў Віцебску разам з перабудовай, галоснасцю, дэмакратыяй — рэаліямі таго часу. Гэта ж выстава ў поўным складзе была перавезена ў Гродна, дзякуючы намаганням майго першага куратара-мастацтвазнаўцы, арганізатара гэтай выставы, спадарыні Ларысы Міхневіч, якая на той час была старшынёй Віцебскага фонду культуры. Падчас путчу 1991 года 20 жніўня я вывесіў бел-чырвона-белы сцяг над ратушай горада Віцебска.

23 сакавіка 1993 года была адкрыта першая прыватная Галерэя сучаснага мастац-



Сын Міколка. Мастак А. Пушкін

тва ў Віцебску "У Пушкіна". Упершыню ў постсавецкім перыядзе мастацтва ў Віцебску з'явілася і аформілася як з'ява галерэя сучаснага постмадэрнізму ў жывапісе маладых беларускіх мастакоў з Полацка, Гродна, Віцебска — тых творцаў канца 1980-х — пачатку 1990-х гадоў, што вучыліся са мной у тэатральна-мастацкім інстытуце. Пасля за 1993–1995 гады было зладжана восем значных выстаў жывапісу, графікі, скульптуры, сучаснай фатаграфіі, пластычнага перформансу. Усё гэта рабілася на свае заробленыя сродкі — ні Міністэрства культуры, ні арганізацыі і фонды не падтрымалі галерэю. Яна была першай лабараторыяй-эксперыментам апошняга накірунку сучаснага мастацтва ў Віцебску і ў Беларусі.

*— Так усё ўдала пачыналася… А чаму і калі скончылася?*

— Перамога на прэзідэнцкіх выбарах Лукашэнкі ў 1994 годзе, правядзенне рэферэндумаў, адмена Канстытуцыі 1994 года не маглі не адбіцца на лёсе галерэі, яе дзейнасць патрапіла пад ідэалагічную абструкцыю з боку гарадскіх выканаўчых улад. Прадчуваючы яе закрыццё, я даў згоду на правядзенне ў памяшканні галерэі 25–27 лістапада 1995 года Першага з'езда беларускіх нацыяналістаў. У выніку галерэя была зачынена па матывіроўцы "парушэнне статута і нямэтавае выкарыстанне памяшкання". 19 снежня 1995 года адбылася развітальная прэс-канферэнцыя. Акцыі першай прыватнай галерэі сучаснага мастацтва ў Віцебску яшчэ праходзілі ў 1995–1996 гадах у розных памяшканнях — "Арт-Уно-Дзіскус" у лютым 1995-га, "Арт-Прагноз–96" у сакавіку 1996-га. Апошняя мая выстава "Біяграфія" адбылася ў Віцебску ў лютым 1997 года.

*— Што вы адчувалі, калі*



Дачка Марыя. Мастак А. Пушкін

*распісвалі касцёл у Магілёве, праваслаўную царкву на радзіме?*

— Найперш мне хацелася пасля заканчэння Акадэміі мастацтваў папросту праца-



Роспісы Алеся Пушкіна

ваць па адраджэнні нашых занядбаных святыняў па сваёй спецыяльнасці, паводле дыплому мастака-манументаліста. І гэта маё жаданне супала з тым блаславёным часам свабоды ў 1991–1995 гадах і з прапановамі, якімі на той час я быў багаты — ад каталікоў, з боку Беларускай каталіцкай грамады, ды і ад сваёй праваслаўнай парафіі, у прыватнасці, новаадбудаванай царквы Святога Міколы майго роднага мястэчка Бобр.



Злева направа: Алесь Пушкін, Віктар Карніенка, Алесь Марачкін

І я не хаваю, што адчуў пачуццё гонару і задавальнення тым, што выконваю Волю Божую сваім сціплым талентам і рукамі ў роднай Беларусі. Што, атрымаўшы найлепшую на той час мастацкую адукацыю ў нашых вядомых прафесараў і мастакоў — Вашчанкі, Бараноўскага, Семчанкі, Раманюка — не ўцякаю, абхаяўшы сваю Alma Mater і настаўнікаў, у Парыж, Нью-Йорк ці Лондан з Барселонай за славай і эфемерным дабрабытам, а запатрабаваны тут. У беднасці і нястачы, але пры магутным на той час эмацыйным пад'ёме, штоназіраўся ў нашай краіне…

*— Ваша жыццё даволі густа размалявана рознымі экстрэмальнымі выпадкамі. Адзін з іх — затрыманне на Крапівенскім полі ў гадавіну бітвы пад Воршай. 7 сутак у турме. Як перанёс гэта як мастак і творца?*

— У галаве дагэтуль круціцца сюжэт карціны, якую я ўсё ж напішу, эскіз ёсць, "Сашэсце ў пекла". Там, у старой аршанскай вязніцы ў цэнтры горада, шмат чаго давялося пабачыць, пачуць, перадумаць…

*— Аднойчы вас пабілі мясцовыя маладзёны на моцным падпітку за карыстанне беларускай мовай і свядомую грамадзянскую пазіцыю мастака. Вы ж замест таго, каб распачаць крымінальную справу, намовілі хлопцаў прынесці пакаянне ў Царкве…*

— Народу мала, бязлюддзе вакол, вымірае вёска. Ну як яшчэ гэтых беларускіх маладзёнаў у турмы перапоўненыя садзіць? Вось і палюбі на справе свой народ! А рускую дырэктрысу Бобрскай школы, што 8 год рабіла з іх манкуртаў, не прабачу. Гэта мой вораг — Шэкун Яўгенія Аляксееўна, я не супакоюся, пакуль яна будзе тут, на Беларусі.

*— Хто вам падаў цудоўную ідэю вырабіць шпакоўні і аддаць іх у афармленне знакавым асобам? Такім чынам вы запрашаеце да творчасці VIP-персонаў?*

— Сам гэта перажыў і прыдумаў! І за тое, што на 25 сакавіка 2008 года я першыя пяць шпакоўняў выставіў як сімвал Вясны, Свабоды, Аптымізму, быў скручаны ў кайданкі міліцыяй, асуджаны суддзёй Крупскага райсуда Андрэем Сізам. Цяпер у мяне ўжо 35 шпакоўняў, распісаных уласнаручна вядомымі людзьмі.

*— У Вашым жыцці былі сустрэчы з рознымі прыгожымі жанчынамі. Які скарб дабрачыннасцяў вы знайшлі ў сваёй жонцы?*

— Жоначка мая Яніна — сціплая, мудрая вясковая настаўніца, вучаніца Генадзя Сагановіча, свядомая беларуска з каталіцкай сям'і. Спагадлівая, верная, цярплівая. Хочам з ёй выканаць хоць адзін указ Лукашэнкі (іншых ніводнага не выконваем!) — нарадзіць траіх дзетак. Двое ўжо нас цешаць — Міколка і Марыйка. Дачушка, на жаль, захварэла вятранкай, таму яны з маці засталіся дома і не змаглі прыехаць у Бычкі разам са мной.

7

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 29 ЧЭРВЕНЯ, ПАНЯДЗЕЛАК

### 1

**05.35** Камедыйны серыял "Як сказаў Джым".
**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05, 07.05, 08.10** "Добрай раніцы, Беларусь!"
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 08.25, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.20** Гатуем разам.
**08.30** У свеце матораў.
**09.05, 12.10** "Беларусь. Гісторыя Перамогі".
**09.10** Nota Bene.
**09.35** "Здароўе".
**10.05** Жаночае ток-шоў "Жыццё як жыццё".
**11.00** Серыял "Два бакі адной Ганны".
**12.20** Гераіка-прыгодніцкі фільм "Мама, я жывы!"
**13.30** В/ф "Зброя Перамогі. Гомельшчына".
**14.05** Камедыйны дэтэктыўны серыял "Монк".
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.30** Культурныя людзі.
**16.05** Вострасюжэтны серыял "Двое з куфара".
**16.50** Меладрама "Тэрыторыя прыгажосці".
**17.50** Серыял "Два бакі адной Ганны".
**18.50, 00.45** "Зона Х". Крымінальная хроніка.
**19.35** "Арэна". Праграма аб спорце.
**19.55** Ток-шоў "Ход у адказ".
**21.00** Панарама.
**21.40** Футбол. Чэмпіянат Еўропы U-21. Фінал.
**23.45** Д/й "Эпоха". Зоркі Канскага фэсту.
**00.50** Дзень спорту.
**01.05** Камедыйны серыял "Офіс" (ЗША).

### Н

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 06.05** АНТ прадстаўляе: "Наша раніца".
**09.00** Нашы навіны.
**09.05** Контуры.
**10.10** Мультфільмы.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** "Кантрольны закуп".
**11.40** "Ералаш".
**12.00** "Малахаў+".
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** "Зразумець. Прабачыць".
**13.45** "Модны прысуд".
**14.45** "Хачу ведаць".
**15.10** АНТ прадстаўляе: "Рэкламная паўза".
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** "Прынцэса цырку". Шматсерыйны фільм.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Серыял «Гуманоіды ў Каралёве». Расія.
**19.05** Чакай мяне.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Ток-шоў "Выбар".
**22.05** "Смерць шпіёнам. Крым". Серыял. Закл. серыя.
**23.10** Нашы навіны.
**23.25** Навіны спорту.
**23.30** "Зваротны адлік".
**00.00** "Шпіталь каралеўства". Серыял.
**00.45** Нашы навіны.
**01.00** Навіны спорту да **01.10**.

### СТВ

**06.00** "24 гадзіны".
**06.10** "Міншчына".
**06.20** "Раніца. Студыя добрага настрою".
**07.30** "24 гадзіны".
**07.40** "Раніца. Студыя добрага настрою".
**08.30** "Тыдзень".
**09.30** "Вялікі сняданак".
**10.00** "Пяць гісторый".
**10.30** "24 гадзіны".
**11.00** "Танга ўтрох". Тэленавэла.
**11.50** "Сіла прыцягнення". Серыял.
**12.40** "Званая вячэра".
**13.30** "24 гадзіны".
**13.50** Фільм "Маё вясёлае жыццё". 1999 г.
**15.35** "Я - вандроўца".
**16.00** "Культурнае жыццё".
**16.30** "24 гадзіны".
**16.50** "Спартыўны тыдзень".
**17.10** "Наша справа".
**17.20** "Міншчына".
**17.30** "Званая вячэра".
**18.30** "Сіла прыцягнення". Серыял.
**19.30** "24 гадзіны".
**20.00** "Сталічныя падрабязнасці".
**20.10** "СТБ-спорт".
**20.15** "Добры вечар, маляня".
**20.30** Фільм "Суперцешча для няўдачніка ". Расія, 2003 г.
**22.30** "24 гадзіны".
**22.55** "СТБ-спорт".
**23.00** "Сталічны футбол".
**23.30** "Інструктар". Серыял.
**00.25** "Гучная справа".

### ЛАД

**06.55** ЛАДная раніца.
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.20** Тэлебарометр.
**08.35** Усё аб бяспецы.
**09.05** У гэты дзень.
**09.10** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**10.00** Серыял "Спадчынніца" (Мексіка).
**10.50** "І зноў рану сэрца кранаючы...".
**11.05** Дзіцячы фільм "Паланэз Агінскага".
**12.30** Бухта капітанаў.
**13.10** Мультфільм.
**13.30** Мультсерыял "Джордж з джунгляў".
**14.20** Пазакласная гадзіна.
**14.30** Таемны гук.
**15.00** Экспедыцыя.
**15.30** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**16.25** Смачна з Барысам Бурдой.
**16.55** Медычныя таямніцы.
**17.35** Серыял "Спадчынніца" (Мексіка).
**18.35** Навіны культуры.
**18.50** Серыял "Вяртанне Турэцкага".
**19.45** Беларуская часіна.
**20.40** Калыханка.
**20.55** Экспедыцыя.
**21.00** "І зноў рану сэрца кранаючы...".
**21.10** Баявік "Паміж жыццём і смерцю".
**22.45** "Іншыя". Псіхалогія крыміналу.
**23.10** Трылер "Сакрэты зніклых. Клоны". 1 серыя.

### РОССИЯ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.10** Фільм "Прызначэнне".
**10.30** "Ранішняя пошта".
**11.00** Весткі.
**11.30** "Спаленыя крылы. Здрадзіць канструктару". Д/ф.
**12.25** Т/ф "ТАСС упаўнаважаны заявіць..." 1-я серыя.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** "Пакой смеху".
**15.55** "Я прыйшоў даць вам казку. Яфім Частнякоў". Дакументальны фільм.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** "Кулагін і партнёры".
**17.55** "Трымай мяне мацней". Тэлесерыял.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00**. Весткі.
**19.30** Тэлесерыял «Кармеліта».
**21.20** Тэлесерыял «1941». Расія, 2009 г.
**22.20** Тэлесерыял «Трое супраць усіх-2».
**23.20** "Нічога асабістага".
**23.35** Навіны - Беларусь.
**23.45** "Весткі+".
**00.05** "Кулагін і партнёры".
**00.35** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**06.00** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал "Сёння раніцай".
**08.55** Сёння. Выніковая праграма.
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.00** Сёння.
**10.25** "Кулінарны паядынак".
**11.15** "Кватэрнае пытанне".
**12.15** "Следства вялі...".
**13.35** Дэтэктыўны серыял "Вяртанне Мухтара-2".
**15.10** Серыял "Аэрапорт".
**16.30** Серыял "Вуліцы пабітых ліхтароў".
**18.15** "Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне".
**18.35** "Агляд. Надзвычайнае здарэнне".
**19.35** Вострасюжэтны серыял "Горад спакус".
**21.35** "Сумленны панядзелак".
**22.35** "Агляд. Надзвычайнае здарэнне".
**23.25** Серыял "Псеўданім "Албанец-2".
**00.15** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял "Эксперты".
**01.00** "Школа зласлоўя".

### EUROSPORT

**09.30** Ралі. Чэмпіянат свету. Польшча. Дзень 3.
**10.00** Супербайк. Чэмпіянат свету. Заезд 2.
**11.00** Матаспартыўны часопіс.
**11.15** Футбол. Жанчыны. Швейцарыя. Фінал.
**13.00** Плаванне. Міжземнаморскія гульні. Дзень 2.
**14.00** Веславанне на байдарках і каноэ. Чэмпіянат Еўропы на гладкай вадзе. Дзень 3.
**15.30** Веславанне на байдарках і каноэ. Чэмпіянат Еўропы на гладкай вадзе. Дзень 4.
**16.00** Снукер. Зала славы.
**17.00** Веласпорт. Тур Фландрыі. Бельгія.
**18.30** Плаванне. Міжземнаморскія гульні. Дзень 2.
**19.00** Плаванне. Міжземнаморскія гульні. Дзень 3.
**21.00** Футбол. Еўрагалы.
**21.20** Вось дык так!!!
**21.35** Армрэстлінг. PAL/NAL.
**22.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE.
**22.30** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**23.30** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. Total Knock Out.
**00.30** Плаванне. Міжземнаморскія гульні. Дзень 3.
**01.30** Веславанне на байдарках і каноэ. Чэмпіянат Еўропы на гладкай вадзе. Дзень 3.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.05** «Элі Макбіл», тэлесерыял.
**18.50** «Кіно і катлеты», дак. фільм, Беларусь.
**20.05** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**20.20** Еўрапейскі Саюз без сакрэтаў, 2 серыя: «Сельскагаспадарчая палітыка».
**20.40** Асабісты капітал.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Курганы».
**21.25** «Чалавечая прырода», маст. фільм, ЗША.
**23.05** «НКВД – гестапа. Браты па крыві», дак. фільм, 2009 г., Беларусь.
**23.40** Аб'ектыў.

## 30 ЧЭРВЕНЯ, АЎТОРАК

### 1

**05.35** Камедыйны серыял "Як сказаў Джым".
**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.05, 08.10** "Добрай раніцы, Беларусь!".
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.20** Гатуем разам.
**08.35** "Арэна". Праграма аб спорце.
**09.05, 15.55** "Беларусь. Гісторыя Перамогі".
**09.10** Дакументальны цыкл "Мая праўда".
**10.00** Меладрама "Тэрыторыя прыгажосці".
**10.50** Серыял "Два бакі адной Ганны".
**11.40** Відэафільм АТН "Спадчына зямлі Аршанскай" цыклу "Зямля беларуская".
**12.10** "Залатыя Віцязі Беларусі".
**13.10** Камедыйны дэтэктыўны серыял "Монк".
**14.05** Ток-шоў "Ход у адказ".
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** Мастацка-публіцыстычны цыкл "Аперацыя "Баграціён". Хроніка Перамогі". Фільм 4-ы.
**16.05** Вострасюжэтны серыял "Двое з куфара".
**16.55** Меладрама "Тэрыторыя прыгажосці".
**17.50** Серыял "Два бакі адной Ганны".
**18.50, 01.00** "Зона Х". Крымінальная хроніка.
**19.30** Сфера інтарэсаў.
**19.55** Серыял "Карамболь" (Расія). 1-я серыя.
**21.00** Панарама.
**21.45** Драматычны серыял "Доктар Хаўс" (ЗША).
**22.50** Д/ц "Эпоха". Зоркі Канскага фэсту. Фільм 3-і.
**23.15** Камедыя "Другое жыццё" (Францыя).
**01.10** Дзень спорту.
**01.20** Камедыйны серыял "Офіс" (ЗША).

### Н

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: "Наша раніца".
**09.05** Чакай мяне.
**10.00** "Смерць шпіёнам. Крым". Серыял.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** "Смерць шпіёнам. Крым". Шматсерыйны фільм. Заключная серыя.
**12.00** "Малахаў+".
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** "Зразумець. Прабачыць".
**13.45** "Модны прысуд".
**14.45** "Хачу ведаць".
**15.10** "Гарачы лёд". Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** "Прынцэса цырку". Шматсерыйны фільм.
**17.10** "Хай кажуць" з Андрэем Малахавым.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Гуманоіды ў Каралёве». Расія, 2008 год.
**18.55** "Рудая". Шматсерыйны фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. "Крапавы берэт". Шматсерыйны фільм.
**22.55** Нашы навіны.
**23.10** Навіны спорту.
**23.15** "Каханне як пакаранне".
**00.15** "Шпіталь каралеўства". Шматсерыйны фільм.
**01.00** Нашы навіны.
**01.15** Навіны спорту да **01.25**.

### СТВ

**06.00** "24 гадзіны".
**06.10** "Міншчына".
**06.20** "Раніца. Студыя добрага настрою".
**07.30** "24 гадзіны".
**07.40** "Раніца. Студыя добрага настрою".
**08.30** Фільм "Суперцешча для няўдачніка ". Расія, 2003 г.
**10.05** "Пяць гісторый".
**10.30** "24 гадзіны".
**11.00** "Танга ўтрох". Тэленавэла.
**11.50** "Сіла прыцягнення". Серыял.
**12.40** "Званая вячэра".
**13.30** "24 гадзіны".
**13.50** "Новыя падарожжы дылетанта".
**14.20** "Далёкія сваякі".
**14.40** "Гадкае качаня". Моладзевы серыял.
**15.30** "Інструктар". Серыял.
**16.30** "24 гадзіны".
**16.50** "Сталічны футбол".
**17.20** "Міншчына".
**17.30** "Званая вячэра".
**18.30** "Сіла прыцягнення". Серыял.
**19.30** "24 гадзіны".
**20.00** "Сталічныя падрабязнасці".
**20.10** "СТБ-спорт".
**20.15** "Добры вечар, маляня".
**20.30** "Беларусьфільм" прадстаўляе: "Маёр Вятроў". Серыял.
**21.40** "Аўтапанарама".
**22.00** "Вайна. Вядомая і невядомая".
**22.30** "24 гадзіны".
**22.55** "СТБ-спорт".
**23.00** "Інструктар". Серыял.
**23.55** "Надзвычайныя гісторыі".

### ЛАД

**06.55** ЛАДная раніца.
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.20** Дэтэктыўны серыял "Вяртанне Турэцкага" (Расія).
**09.10** У гэты дзень.
**09.15** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**10.05** Серыял "Спадчынніца" (Мексіка).
**10.50** "І зноў рану сэрца кранаючы..." Маналогі аб вайне.
**11.05** Дэтэктыўны серыял "Двайняты" (Расія).
**12.00** Моладзевы дэтэктыўны серыял "Вераніка Марс" (ЗША).
**13.25** Мультфільм.
**13.50** Мультсерыял "Джордж з джунгляў" (ЗША).
**14.35** Пазакласная гадзіна.
**14.50** Бітва экстрасэнсаў.
**15.40** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**16.35** Смачна з Барысам Бурдой.
**17.00** Медычныя таямніцы.
**17.35** Серыял "Спадчынніца" (Мексіка).
**18.35** Навіны культуры.
**18.50** Дэтэктыўны серыял "Вяртанне Турэцкага" (Расія).
**19.45** Беларуская часіна.
**20.40** Калыханка.
**20.55** Экспедыцыя.
**21.00** "І зноў рану сэрца кранаючы..." Маналогі аб вайне.
**21.10** Спорт-кадр.
**21.40** Серыял "Доўгія вёрсты вайны" ("Беларусьфільм"). 1-я серыя.
**23.05** "Іншыя". Псіхалогія крыміналу.
**23.35** Фантастычны трылер "Сакрэты зніклых. Клоны" (Францыя-Бельгія). 2-я серыя.

### РОССИЯ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.20** Тэлесерыял «Кармеліта».
**11.00** Весткі.
**11.20** "Нічога асабістага". Інфармацыйна-сатырычная праграма.
**11.35** Тэлесерыял «1941». Расія, 2009 г.
**12.25** Тэлефільм "ТАСС упаўнаважаны заявіць..." 2-я серыя.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** Тэлесерыял «Трое супраць усіх-2».
**15.15** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**15.50** "Жыццё насуперак. Міхаіл Таніч". Дакументальны фільм.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** "Кулагін і партнёры".
**17.55** "Трымай мяне мацней". Тэлесерыял.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00**. Весткі.
**19.30** Тэлесерыял «Кармеліта».
**21.20** Тэлесерыял «1941». Расія, 2009 г.
**22.20** Тэлесерыял «Трое супраць усіх-2».
**23.20** Навіны - Беларусь.
**23.30** "Весткі+".
**23.50** "Кулагін і партнёры".
**00.20** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**06.00** Сёння.
**06.00** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал "Сёння раніцай".
**09.05** "Праграма Максімум. Скандалы. Інтрыгі. Расследаванні".
**10.00** Сёння.
**10.25** "Агляд".
**10.55** "Жаночы погляд".
**11.25** "Рускія сенсацыі".
**12.10** Вострасюжэтны серыял "Псеўданім "Албанец-2".
**13.00** Сёння.
**13.30** Дэтэктыўны серыял "Вяртанне Мухтара-2".
**15.05** Серыял "Аэрапорт".
**16.00** Сёння.
**16.30** Крымінальны серыял "Вуліцы пабітых ліхтароў".
**18.15** "Чыстасардэчнае прызнанне".
**18.30** "Агляд. Надзвычайнае здарэнне".
**19.00** Сёння.
**19.35** Прэм'ера. Вострасюжэтны серыял "Горад спакус".
**21.35** "Вочная стаўка".
**22.30** "Агляд. Надзвычайнае здарэнне".
**23.00** Сёння.
**23.25** Вострасюжэтны серыял "Псеўданім "Албанец-2".
**00.15** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял "Эксперты".

### EUROSPORT

**09.35** "Алімпійскія гульні". Алімпійскі часопіс.
**10.00** Футбол. Чэмпіянат Еўропы да 17 гадоў. Жанчыны. Швейцарыя. Фінал.
**11.30** Веласпорт. Тур Фландрыі. Бельгія.
**13.00** Плаванне. Міжземнаморскія гульні. Пескара (Італія). Дзень 3.
**14.00** Снукер. Турнір Мастэрс. Лондан. Фінал.
**17.00** Веласпорт. Велагонка "Amstel Gold". Нідэрланды.
**18.30** Плаванне. Міжземнаморскія гульні. Пескара (Італія). Дзень 3.
**19.00** Плаванне. Міжземнаморскія гульні. Пескара (Італія). Дзень 4.
**21.00** Снукер. Турнір Мастэрс. Лондан. Фінал.
**22.00** Бокс. Міжнародны паядынак. ЗША.
**00.00** Ралі. Чэмпіянат свету. Польшча. Агляд.
**01.00** Матаспартыўны часопіс.
**01.15** Вось дык так!!!
**01.30** Плаванне. Міжземнаморскія гульні. Пескара (Італія). Дзень 4.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.05** «Вышэй за падазрэнні», маст. фільм, 2000 г., ЗША.
**19.45** Хто ёсць кім: «Бард і літаратар Міхаіл Валодзін. Тут мой дом».
**20.10** Акно ў Еўропу (інфармацыйная праграма).
**20.40** Беларусы ў Польшчы.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Хрысціянства» (спазнавачая праграма).
**21.25** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Заўчасны падарунак», дак. фільм, 1996 г., Польшча.
**22.20** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял.
**23.10** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу "Нямецкая хваля").
**23.40** Аб'ектыў.

# ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ

**Выпуск №3 (31) (чэрвень)**

www.litbel.org www.novychas.org

Культурна-асветніцкі праект Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага часу»


**Анонс**


Галоўныя навіны і падзеі літаратурна-грамадскага чэрвеня ..... с. 2

Новыя вершы Марыны НАТАЛІЧ і Васіля ДЭБІША ..... с. 3

Аповед «Грандыёзны законапраект» Іллі РАСОЛАВА ..... с. 4

«Пятая калонка» ад Марыйкі Мартысевіч ..... с. 5

Пераклад апавядання амерыканскага пісьменніка Дэвіда Фостэра УОЛЕСА ..... с. 6

Нехрэстаматыйнае эсэ пра Аляксандра Пушкіна ..... с. 7

Агляд кніг на «Паліцы» «Ь» ..... с. 8


**Наступны нумар Ь выйдзе ў падвойным аб'ёме ў жніўне**

ПАЗІЦЫЯ

## ЛІНІЯ МЕДСАНБАТА

**Віктар ХУРСІК**

Калі трымаеш у руках пажоўклыя ўспаміны пра 1941-ы, пачынаеш дыхаць адным дыханнем з пакаленнем забытых. Там, у той краіне, якая звалася СССР, яны кахалі, спадзяваліся, верылі. Большасць мела высокую чалавечую годнасць і сумленне. Патрыёты сваёй Айчыны былі да самаахвяравання адданыя ідэі лепшай будучыні, а ў час выпрабаванняў іх любоў да Радзімы выклікала павагу нават у ворагаў.

Вайна і пасляваенны час наклалі свой адбітак на паводзіны тых людзей, знік і сам СССР, але мужнасць байцоў 1941-га прапісаная ў гісторыі навечна. Яна заўсёды будзе крыніцай развažанняў пра смеласць у барацьбе за свабоду і незалежнасць краіны.




…Малады ваенны ўрач Фёдар Мацвеевіч Вялічка скончыў ваенна-медыцынскую акадэмію ў Ленінградзе ў 1939 годзе і атрымаў размеркаванне ў Прыволжскую ваенную акругу. Праз год ён ужо камандаваў медсанбатам 154-ай стралковай дывізіі. У 1941 годзе не маючы часу на фарміраванне поўнай штатнай колькасці гэтая дывізія ў складзе 63-га корпуса была тэрмінова накіраваная на папаўненне войскаў Беларускай ваеннай акругі. Адбылося гэта за некалькі дзён да аб'яўлення вайны. Праз тыдзень, калі вайна ўжо ішла, эшалон дасягнуў месца разгрузкі на станцыі Добруш. Пад нямецкай бамбёжкай часткі рушылі займаць абарону на ўсходнім беразе Дняпра па лініі Жлобін-Рагачоў. Да сярэдзіны ліпеня часткі корпуса вялі крававыя баі, пакрысе пасоўваючы ворага на захад. Аднак націск фашыстаў мацнеў. Увыніку пад канец ліпеня часткі 63-га корпуса перайшлі да абароны. У гэты час медсанбат Вялічкі размясціўся ля дарогі, у лесе непадалёк Лугавой Вірні. Батальён меў у сваім складзе сорак чалавек і восем адзінак аўтатэхнікі. Урачы працавалі кругласутачна, аперацыі выконваліся пад электрычнае святло ад акумулятараў, пастаянна ішла эвакуацыя цяжкапараненых. За кароткі час баявых дзянняў была аказаная дапамога звыш шасці тысячам байцоў.

Аб ваеннай абстаноўцы Фёдар Мацвеевіч даведваўся ў штабе дывізіі. Дзесятага жніўня там стала вядома, што пад націскам немцаў адзін з палкоў дывізіі адступіў, вораг фарсіраваў Днепр. Медсанбат тэрмінова перабазаваўся на ўсход і праз два дні размясціўся ў лесе на паўднёвы-ўсход ад вёскі Негаўка непадалёк ад шашы Рагачоў-Гомель. Аб сваім месцазнаходжанні данеслі ў штаб цераз сувязнога, але ён адтуль не вярнуўся. Вырашылі быць напагатове, выставілі баявую ахову. Ранкам трынаццатага жніўня правялі рэкагнасцыроўку ўбок вёсак Мяркулавічы і Глыбочына. Сэрца ёкнула, калі ўбачылі, што на лузе ля кустоў'я прызямліўся нямецкі самалёт. З яго павыскаквалі ўзброеныя салдаты і схаваліся ў лесе. Самалёт адразу ж паляцеў, а на яго месца пачалі прылятаць новыя з такім жа "грузам". Тэрмінова склалі аб гэтым данясенне ў штаб дывізіі і адправілі з сувязным на машыне.

Але ні машына, ні сувязны не вярнуліся…

Ноччу ў раён размяшчэння медсанбата прыбыў ветэрынарны лазарэт дывізіі ў колькасці сарака байцоў пад кіраўніцтвам камісара Мінегалія Загірава і васьмі байцоў-рамонтнікаў з дывізіённага аўтабата. У ветэрынараў мелася пяць машын і адзін станкавы кулямёт, а таксама гармата-саракапятка з камплектам снарадаў.

Што магла супрацьпаставіць гэтая жменька фашысцкай ваеннай машыне? Нічога. Акрамя ўзору служэння Радзіме. Не штрафбат гнаў урачоў і ветэрынараў пад яе колы (як часам гэта малююць). У 1941-м людзьмі рухала іншае: забытае цяпер пачуццё асабістай адказнасці за лёс дзяржавы, за яе будучыню, імі рухала бясстрашша, без якога перамагчы немагчыма. Калі ноччу ў лес, што на пуўднёвы ўсход ад Негаўкі, быў дастаўлены загад камандуючага дывізіяй генерала Фоканава заняць абарону, ніхто з асабістага складу групы не збег, не дэзерціраваў. Хаця кожны разумеў, чым можа скончыцца бой для медсанбата.

Задачай групы было адцягнуць увагу фашыстаў і даць магчымасць адысці часткам 63-га стралковага корпуса. Між тым Вялічка не ведаў, што фашысты ўжо завершылі і яго акружэнне, і корпуса цалкам.

Абавязкі па кругавой абароне размеркавалі наступным чынам. Паўночна-заходнюю частку ляснога масіву абараняў ветлазарэт на чале з камісарам Загіравым. Намесніку камандзіра медсанбата Сухініну разам з двума дзесяткамі байцоў (у тым ліку ўрачамі і фельдшарамі) дасталася паўночная частка лесу побач з дарогай Доўск-Гомель. Камісар медсанбата Грэйскап разам з рамонтнікамі і рэшткай медсанбата заняў паўднёва-ўсходні рубеж. Сам жа камандзір з шасцю байцамі залёг у кустах на заходнім узлеску.

Ранкам 15 жніўня 1941 года група пачала ўцягвацца ў баі з немцамі, якія рухаліся па дарозе на Гомель. Ад страляніны, распачатай ветлазарэтам, купка немцаў разгубілася, пачала адстрэльвацца, а калі запрацаваў станкавы кулямёт, то ўвогулле ратавалася ўцёкамі. Праз гадзіну пасля здарэння на баявую групу Сухініна выпаўзлі тры танкеткі. У байцоў у распараджэнні акрамя вінтовак было шмат бутэлек са спіртавымі настоямі і некалькі гранат. Пры набліжэнні па бронемашынах быў адкрыты агонь. Танкеткі павярнулі назад, па адступаючым было зроблена некалькі выстралаў з гарматы. У гэты ж час на захадзе, побач з засадай камандзіра медсанбата спынілася аўтамашына з немцамі. Каля двух дзесяткаў фашыстаў з аўтаматамі саскочылі на зямлю, пачалі размінаць ногі, перагаворвацца. Вялічка прыкінуў: шэсць вінтовак і пісталет супраць дваццаці аўтаматаў. Але ж ёсць яшчэ пара гранатаў, а на чатырох вінтоўках штыкі.

Атакавалі знянацку. Вораг быў часткова пабіты, але частка фашыстаў збегла ў недалёкую нязжатую пшаніцу. Пабеглі за ўцекачамі, ды вярнуліся. Раптам сціхла. У час передышкі камісар Грэйскап арганізаваў адыход раненых жанчынурачоў і медсясцёр у вёску Негаўка. Жыхарка гэтай вёскі Аляксандра Мікалаеўна Гаўрыленка схавала жанчын, пераапранула.

Пазней яны перабраліся ў партызанскі атрад.

Ледзь толькі жанчыны сыйшлі, як над лесам закружыў нямецкі самалёт-разведчык "рама". Лес пачалі бамбіць самалёты і абстрэльвала артылерыя. Усё змяшалася. Відаць фашысты прынялі медсанбат за больш сур'ёзную частку і нанеслі па ёй сакрушальны ўдар. Гарэў лес, машыны, гінулі абаронцы ляснай крэпасці. А сёмай гадзіне вечара сціхла, і толькі група Загірава працягвала бой у сваім сектары, ды і там з цягам часу наступіла цішыня.

…Ранены ў нагу камандзір медсанбата агледзеўся. З шасці яго байцоў жывымі засталіся трое. Стала вядома, што значныя страты былі і ў іншых групах. Загінулі камісар Грэйскап, Сухінін, Загіраў. Належала адшукаць жывых і як мага хутчэй адступіць. Не зважаючы на боль, Вялічка кінуўся да аўтамашын. Дзякуй Богу, тры на хаду. Размеркаваў у іх каля двух дзесяткаў чалавек. Сам сеў у кабіну першай. Аднак ледзьве ад'ехалі ад лесу, як трапілі пад моцны мінамётны абстрэл. Машыну перавярнула. Камандзір цудам ацалеў. Аглушаны ўзрывамі, ён паглядзеў наўкола: машыны былі разбітыя, многія байцы забітыя ці цяжка параненыя. Вораг пасля мінамётнага абстрэлу пайшоў у атаку.

Вялічка паспрабаваў з байцамі падняць аўтамашыну, але гэта не ўдалося. Ён адчуў моцны ўдар па галаве і страціў прытомнасць. Агоўтаўся тады, калі ўбачыў, як два немцы адшпільвалі дзягу і кабуру. "Камісар?"— запытаў афіцэр. "Не, Arc, урач", — захітаў ён галавой. Жывых аказалася каля дванаццаці чалавек. Хто не мог падняцца, таго прыстрэлілі на месцы. З байцоў сарвалі знакі адрознення і пагналі ў вёску Дубраўка (там фашысты збіраліся вячэраць).

На наступны дзень жывыя пад наглядам немцаў хавалі ў лесе сваіх таварышаў. Іх загінула амаль сотня…

Часта чуюцца галасы аб прымірэнні. Маўляў, пара адзначыць і дагледзець месцы нямецкіх пахаванняў. Зразумела, час гоіць раны. Жыць на зямлі з пачуццём вечнай нянавісці немагчыма. Перакананы, каб быў такі дазвол, то сталёвымі нямецкімі крыжамі тэрыторыя Беларусі была б пакрытая даволі хутка. А вось з мемарыялізацыяй подзвігу бацькоў і дзедаў нашых у нас і да сёняшняга часу — непярэліўкі. Прыдумалі і прафінансавалі "Лінію Сталіна", каб цешыць "Сталіна", а лінію медсанбата ды поле подзвігу яго байцоў зааралі…

ЮБІЛЕЙ

# ПАМЯЦЬ ПРА ВАСІЛЯ БЫКАВА

Беларусь адзначае 85-ю гадавіну з дня нараджэння пісьменніка Васіля Уладзіміравіча Быкава. У Мінску масавай юбілейнай вечарыны не будзе: на жаль, перамовы Саюза беларускіх пісьменнікаў з дырэкцыяй Палаца мастацтваў аб арэндзе залы завяршыліся безвынікова.

18 чэрвеня юбілейная вечарына адбылася ў Музеі гісторыі беларускай літаратуры, дзе пра творцу ўзгадвалі яго калегі-пісьменнікі, навукоўцы і супрацоўнікі музея.

19 чэрвеня, у дзень народзінаў, творцы і чытачы ўсклалі кветкі на магілу Васіля Быкава. Адбылася традыцыйная вандроўка на ягоную радзіму ў вёску Бычкі — з удзелам сястры Валянціны Уладзіміраўны і кіраўніцтва Саюза беларускіх пісьменнікаў.

19 чэрвеня аддзел культуры Вушацкага райвыканкама таксама ладзіў мерапрыемствы ў памяць пра славутага земляка — экскурсіі ў мемарыяльны музей Васіля Быкава ў Бычках, урачыстую вечарыну ў раённым Палацы культуры.

Актывісты руху "За Свабоду" ў той дзень у Бычках уганаравалі лаўрэатаў прэміі "За свабоду думкі". Летась прэмія, заснаваная Аляксандрам Мілінкевічам, была ўручаная ўпершыню. Яе атрымалі Рыгор Барадулін, Уладзімір Арлоў і Павал Севярынец.

З нагоды юбілею Васіля Быкава ў абласной бібліятэцы імя Леніна адчынілася мастацкая выстава і прайшла вечарына "Салдат Перамогі". Экспазіцыю выставы ў фае бібліятэкі склалі творы ўдзельнікаў Быкаўскага пленэру, які раз на два гады праводзіць на радзіме


Фота Сяргея Шапрана.

пісьменніка грамадскі цэнтр імя Язэпа Драздовіча.

Літаратурную вечарыну пад назвай "Салдат Перамогі" падрыхтавалі супрацоўнікі бібліятэкі, а таксама віцебская арганізацыя Таварыства беларускай мовы. У імпрэзе ўзялі ўдзел і прадстаўнікі Саюза беларускіх пісьменнікаў, сябрам якога быў Васіль Быкаў, і сябры Саюза пісьменнікаў Беларусі.

ПРЭМІІ

# "ШКЛЯНОЕ ПЯРО" УЛАДЗІМІРА НЯКЛЯЕВА

З 6 па 9 чэрвеня ў Цвяры праходзіў I міжнародны фестываль славянскай паэзіі "Спеўныя пісьмёны", які быў прымеркаваны да 210-годдзя з дня нараджэння Аляксандра Пушкіна. У рамках фестываля адбыліся паэтычныя вечары, круглыя сталы для маладых паэтаў і выдаецца ў шмат іншых мерапрыемстваў.

Вітальным словам цырымонію ўрачыстага завяршэння адкрыла намеснік губернатара Цвярской вобласці Вольга Пішчуліна. Ад імя губернатара яна падзякавала паэтам, педагогам ВНУ, гасцям з усіх славянскіх краін за актыўны ўдзел у мерапрыемстве.

У апошні вечар паэтычнага свята былі ўзнагароджаныя чатыры паэты-ўдзельнікі фэсту. У намінацыі "За выбітны шматгадовы ўнёсак у паэтычную творчасць" – "Шкляное пяро" – атрымаў беларускі паэт Уладзімір Някляеў. У намінацыі "За шматлікія і таленавітыя пераклады рускай паэзіі на іншую мову" быў узнагароджаны польскі паэт Аляксандр Наўроцкі. "За пераклады замежнай паэзіі на рускую мову" адзначаны рускі паэт Віктар Шырокаў. Цвярскі паэт Кастусь Рабенькі атрымаў узнагароду ў цвярской рэгіянальнай намінацыі "За поспехі ў шматгадовай паэтычнай творчасці на Цвярской зямлі".

# УЛАДЗІМІР АРЛОЎ — НАМІНАНТ ПРЭМІІ "ЕЎРАПЕЙСКІ ПАЭТ СВАБОДЫ"

Уладзімір Арлоў будзе прадстаўляць Беларусь на агульнаеўрапейскім конкурсе «Еўрапейскі паэт свабоды». Прэмія заснаваная муніцыпалітэтам горада Гданьск, калыскі «Салідарнасці». Памер прэміі – 100 000 злотых (каля 22 000 еўра).

На першым этапе конкурсу, які прайшоў у сакавіку 2008 года, з 46 еўрапейскіх краінаў былі выбраныя сем — Беларусь, Кіпр, Славакія, Славенія і Сербія, Францыя і Швецыя. Перакладчыкі-эксперты, якіх запрасілі арганізатары, вылучылі па паэту ад кожнай краіны і ўзяліся перакладаць іхнія кнігі на польскую мову. Па адным зборніку кожнага фіналіста выйдзе ў спецыяльнай серыі «Еўрапейскі паэт свабоды — намінацыі».




Кнігу вершаў Уладзіміра Арлова «Паром праз Ла-Манш» пераклаў вядомы польскі творца, віцэ-прэзідэнт Польскага ПЭН-цэнтру Адам Паморскі.

Імя пераможцы будзе агучана падчас Міжнароднага літаратурнага фестывалю ў 2010 годзе, які таксама адбудзецца ўпершыню.

СУСТРЭЧЫ

# ЛІТАРАТУРНАЯ БАЛТЫКА

З 9 да 11 чэрвеня на запрашэнне Саюза пісьменнікаў Эстоніі пад патранатам Балтыйскай асацыяцыі пісьменніцкіх саюзаў (у склад якой з гэтага года ўваходзіць і Саюз беларускіх пісьменнікаў) адбылася традыцыйная сустрэча творцаў з розных краін: Швецыі, Фінляндыі, Расіі, Нямеччыны, Беларусі. У склад шведскай дэлегацыі ўваходзіла нават адна прадстаўніца народнасці Саамі. Распачаўшыся ў офісе Саюза пісьменнікаў Эстоніі, які месціцца ў гістарычнай частцы Таліна, мерапрыемствы працягнуліся ў славутай Нароўскай крэпасці і Доме творчасці пісьменнікаў у Касму.

Паколькі Саюз беларускіх пісьменнікаў увайшоў у Балтыйскую асацыяцыю пісьменніцкіх саюзаў толькі сёлета, прадстаўнік ад Беларусі – паэт Анатоль Івашчанка – браў удзел у падобным форуме ўпершыню. Вось што ён распавёў карэспандэнту "Ь": "Па-сутнасці, гэта была сяброўская, амаль сямейная па духу сустрэча, што мела на мэце знаёмства літаратараў з далейшым плённым супрацоўніцтвам. Сітуацыя з дзяржаўнай падтрымкай пісьменнікаў там дыяметральна супрацьлеглая. Да прыкладу, дэбютная кніга рускамоўнага (!) эстонскага паэта, які піша пад псеўданімам П.І. Філімонаў, была адзначаная ўзнагародай ад Міністэрства культуры Эстоніі як лепшы дэбют года з прэміяй у суме 40 тысяч эстонскіх кронаў (каля 4 тысяч долараў). Вядома, Саюз беларускіх пісьменнікаў, пазбаўлены сродкаў для існавання, маёмасці і Дома творчасці, не шмат што можа прапанаваць у якасці гасціннага адказу эстонскім пісьменнікам. Але наладжванне сувязей, адчуванне таго, што нашая літаратурная сітуацыя цікавая для Балтыкі й Паўночнай Эўропы, надзвычай важнае".

Прадстаўнічасць удзельнікаў балтыйскай сустрэчы можна праілюстраваць на прыкладзе дэлегацыі з Санкт-Пецярбурга, на чале якой быў паэт, крытык і журналіст Ілля Фанякоў, аўтар больш як сарака кніг, які гэтым разам прэзентаваў свае пераклады сучасных эстонскіх і нямецкіх паэтаў, а таксама кнігу "Гармонія і алгебра радка" .

ВОДГУК

# "КАБ СОНЦА ЗАХІЛІЦЬ..."

Штотыднёвік "Літаратура і мастацтва" ў нумары за 5 чэрвеня змясціў на першай старонцы віншаванне беларускім пісьменнікам, якія "працуюць на карысць Айчыны", з нагоды 75-годдзя Саюза пісьменнікаў Беларусі, якое падпісаў старшыня гэтага аб'яднання Мікалай Чаргінец.




Аўтар святочнага панегірыка сцвярджае, што "Саюз пісьменнікаў Беларусі з'яўляецца пераемнікам тых ідэй і літаратурных традыцый, якія былі закладзеныя на пачатку стварэння грамадскай арганізацыі і набылі сваё развіццё ў 40-90 гады XX стагоддзя". Але ці так гэта насамрэч, ці не хітрыць тут спадар Чаргінец, падмяняючы паняцці і выдаючы чорнае за белае?

Каб разабрацца ў пытанні "who is who", неабходна зрабіць невялікі экскурс у гісторыю стварэння пісьменніцкай арганізацыі ў Беларусі.

8 чэрвеня 1934 года адбыўся Першы ўстаноўчы сход беларускіх пісьменнікаў, які заснаваў Саюз пісьменнікаў БССР. Гэтая дата і лічыцца днём стварэння масавай грамадскай арганізацыі літаратараў Беларусі, якой нядаўна споўнілася 75 гадоў.

Ад часу свайго стварэння і да сённяшняга дня пісьменніцкі саюз з'яўляецца ядром нацыянальнай інтэлігенцыі, апірышчам культурнай і эстэтычнай думкі. З яго шэрагаў паўсталі і сталіся сусветнымі творчымі постацямі Янка Купала, Якуб Колас, Кузьма Чорны, Пятрусь Броўка, Іван Мележ, Уладзімір Караткевіч, Алесь Адамовіч, Іван Шамякін, Янка Брыль, Васіль Быкаў, сотні іншых, не менш таленавітых пісьменнікаў. Нездарма за развіццё нацыянальнай культуры і папулярызацыю беларускай літаратуры сябры Саюза пісьменнікаў ушаноўваліся дзяржавай: 19 сябрам СП было прысвоена званне Народных пісьменнікаў і паэтаў; 3-ом – Народных артыстаў; 41-му – заслужаных дзеячоў культуры Беларусі; 10-ці – заслужаных дзеячоў навукі. Больш сотні з іх сталі Лаўрэатамі Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

Саюз пісьменнікаў БССР, як і творчыя саюзы ў іншых краінах-суседзях, у 1991 годзе змяніў сваю назву на «Саюз пісьменнікаў Беларусі». Але не надоўга, паколькі ў 1996 годзе ў Рэспубліцы Беларусь на заканадаўчым узроўні было прынятае рашэнне, згодна з якім слова "Беларусь" у назвах арганізацый стала асабістай прэрагатывай дзейснай улады. Ад таго часу наш Саюз пісьменнікаў Беларусі мусіў мяняць сваю назву (рашэнне было прынятае на агульным з'ездзе) і атрымаў новую назву – Саюз беларускіх пісьменнікаў (СБП).

Незалежная ад палітычнаўладнай кан'юнктуры пазіцыя Саюза беларускіх пісьменнікаў на працягу апошніх гадоў выклікала рэпрэсіі з боку ўладаў Беларусі. У 1997 годзе ў СБП быў адабраны Дом літаратара, а ў 2006 годзе аб'яднанне было гвалтоўна выкінутае з займаемага памяшкання. (А яшчэ раней, у 2002-м, у СБП былі адабраныя літаратурна-грамадскія перыядычныя выданні, заснавальнікам якіх ён з'яўляўся.) На гэтай базе і была створаная дзяржаўная Рэспубліканская выдавецкая ўстанова (РВУ) "Літаратура і мастацтва", а нелаяльныя рэдактары і супрацоўнікі – звольненыя з працы. Штотыднёвік "Літаратура і мастацтва", адпаведна, стаў органам новастворанага Саюза пісьменнікаў Беларусі, якому было дазволена так назвацца. Вось такая падмена "сонцаў". А як яны свецяць – меркаваць, натуральна, спажыўцам літаратуры, слухачам на літаратурных імпрэзах. Сёння колькасць членаў новага саюза, які ўзначальвае Мікалай Чаргінец, не нашмат перавышае 300 чалавек (сярод якіх, па некаторых звестках, ёсць і тыя, хто пісьменнікамі не з'яўляецца). І вось сёння гэты новаствораны саюз перацягвае на сябе коўдру ранейшых дасягненняў нацыянальных літаратараў...

Пазіцыя зручная: з аднаго боку – падмяніць паняцці, а з другога – замаўчаць існаванне Саюза беларускіх пісьменнікаў – на сёння не толькі дзейснага члена Міжнароднай супольнасці пісьменніцкіх саюзаў (правапераемніка СП СССР), але і паўнапраўнага члена Еўрапейскай Пісьменніцкай Рады. Урэшце, менавіта СБП сёння з'яўляецца дэ-факта паўнапраўным пераемнікам і спраў, і гісторыі СП колішняга, а юрыдычна – і ёсць спадкаемцам Саюза пісьменнікаў Беларусі – бо Статут СБП (тэкст размешчаны на сайце арганізацыі) зарэгістраваны Міністэрствам юстыцыі Рэспублікі Беларусь 28 кастрычніка 1991 года. У той год і паўстала Рэспубліка Беларусь...

Ды і дзе "схаваць" больш за 600 сяброў старэйшай пісьменніцкай арганізацыі, сярод якіх лепшыя літаратары сучаснасці: Рыгор Барадулін, Ніл Гілевіч, Генадзь Бураўкін, Уладзімір Някляеў, Уладзімір Арлоў, Алесь Разанаў, Святлана Алексіевіч, Вольга Іпатава, Віктар Казько, Анатоль Кудравец ды сотні іншых майстроў праўдзівага слова – да самых маладых? Як пісаў колішні ейны сябар Кандрат Крапіва, "Каб сонца захіліць..."

**Жорж Кунцэвіч, www.litbel.org**

# СВЯТЛО Ў ВАЧАХ



Марына НАТАЛІЧ

***
*Сярод россыпу жоўценькіх*
*дзьмухаўцоў*
*Толькі адзін аксакал –*
*На вузлаватайназе*
*Белая галава.*

*Кліча яго дзядулем*
*Гарэзлівая малеча,*
*Рагоча без дай прычыны:*
*Самая раніца траўня,*
*А ён ужо такі сівенькі!..*

***
*Таму ты такая самотная,*
*Лёткая ластаўка ў небе,*
*Што ў тваёго сябрука*
*Нават наймення мужчынскага*
*Няма, не было і не будзе...*

***
*Мой каханы,*
*Лёсам наканаваны,*
*Што ведаем мы*
*Пра яго выборы?*
*То палыну ліне*
*Ў арабінавае віно,*
*То ў студні бяздоннай*
*Пакажа дно.*
*То пяшчотай апаліць,*
*То сцюжаю абвее, –*
*На вятрах мілосці*
*Палаю-калею.*
*А лёс рагоча,*
*Стары белачубы,*
*Як ты нямееш*
*У адчаі ад згубы.*

*Што́ мы яму, каханкі,*
*Не вартыя жалю падранкі,*
*Кволыя птахі*
*Без апранахі?*
*Выштурхне з сэрцавіны кахання –*
*Ні спагады няма, ні адхлання.*
*Сэрцайка ўшчэнт разаб'ецца,*
*А лёс бессаромна смяецца*
*І шыбуе далей*
*Шукаць маладзенькую пару –*
*Забаўку і ахвяру...*



### Страчаная

*Адвярніся, любы,*
*Хмура не сачы,*
*У чыю далонь я*
*Магла згубіць ключы...*

*Я зірнула ў студню,*
*Як па воду йшла, –*
*Жоўтая вяргіня*
*Вочы апякла.*
*Жоўтая вяргіня*
*Там, на глейкім тле,*
*Мой адбітак зыбкі*
*На празрыстым шкле.*
*Хто ж мяне сурочыў,*
*У час які і дзе,*
*Што канаю кветкай*
*Ў ледзяной вадзе?*

*...Не ключы згубіла –*
*Душу не зберагла,*
*Кветкай упусціла*
*У прадонне зла...*

### Мастаковыя сны

*Клопат збуду –*
*Гуляю ў пацеркі:*
*Жэмчуг чорны,*
*Перлінкі белыя.*
*Ночкі цёмныя,*
*Ранні імгненныя...*

*Бог за мной*
*Падглядае ўпотайкі:*
*Раптам я што прыдумаю новае –*
*Сіне-светлае,*
*Пекна-ружовае.*

*Ён мяне разумее,*
*Самотную...*

***
*Не сястра, не каханка,*
*Не дачка я табе –*
*Падчарка.*
*Не змяя-камяняломка,*
*Не жонка ласкавая –*
*Яшчарка,*
*Безабаронная, нецікавая,*
*стылая,*
*Вачам – не пагляднная,*
*Сэрцу – не мілая.*

*Навошта зловіў ты мяне,*
*Утаймаваў, прыручыў,*
*Як святло ў вугальку,*
*Прысабечыў злоўлены пламень,*
*А потым раптоўна адрынуў, скамечыў*
*Выклікам хлёсткім: "Хачу і хлушу!.."*
*І стаў дом мой – трывушчы камень,*
*У ім яшчарка залатая схавала душу.*

***
*Празрыстасць вінаграду – радасць,*
*Смуглявасць вінаграду – сум,*
*І вінаватасць далягляду*
*За вырай нашых лёгкіх дум.*

*Віна зялёны вір і морак,*
*І патанулы райскі сад,*
*Зноў вінаграду сыты голад,*
*Начэй паўднёвых зарапад.*

*Ўсё гэта там, за даўнім часам,*
*У снах, у восеньскіх начах,*
*Дзе я не чайка над баркасам –*
*Святло ў вачах.*

# НЕ ДЛЯ БОГА ХАМ БУДУЕ ХРАМ

Васіль ДЭБІШ

**Паэт**

*Анатолю Сысу*

*Паэт на пожню кінуў слова смела*
*Не чыстае і вабнае красы,*
*На дрэвы ўсохлыя, людзей спадлелых,*
*На нівы счэзлыя і мёртвыя лясы.*

*Паэт на пожню кінуў смела слова:*
*Пачварнае, нібы гадзюкі сык,*
*Цяжкое, нібы камень стопудовы,*
*Балючае, як прадсмяротны крык.*

*Паэт на пожню смела слова кінуў...*
*Ён плакаў, ды нядоўга... Хай згарыць*
*Народ – без мовы, без душы – Айчына,*
*Ўсё, што немагчыма ўваскрасіць.*

***
*З чужыны вяртаюцца дадому*
*Песні, што дзядуля мне спяваў...*
*Як пяецца сёння? Невядома...*
*Пасівелі травы, снег апаў.*

*Ці зіма, ці восень? Я не знаю.*
*Знаю, як вялі такой парой*
*Дзеда на расстрэл. Душа рыдае,*
*Ды жыве краса шчэ кволых мрой,*

*Дзе-ніздзе яшчэ пачуеш слова*
*Роднае, да болю, хрыпаты...*
*Хай жыве! – і падаюць аковы.*
*Беларусь! – лунае Дух святы.*

### Сабака

*Ланцуг я на яго, як звечарэла,*
*Надзеў. Ён смуткаваў, была няўмоч*
*Няволя. Доўга выў на месяц белы.*
*Вачыма бліскаў чорнымі, як ноч.*

*Яго пашкадаваў я і на волю*
*Зноў адпусціў з ярма, бо гэта грэх.*
*І заззвінеў хітрэцкі і свавольны*
*У цемнату сабачы звонкі брэх.*

*Мы потым сярод клёнаў і гарэшын*
*Гулялі разам доўга-доўга з ім.*
*Яму чытаў свае натхнёна вершы –*
*Ён слухаў і штосьць думаў аб сваім...*

### Восень

*Аблятае апошні лісточак.*
*Шапаціць вецярок з цішыні.*
*І такія халодныя ночы,*
*І такія дажджлівыя дні.*

*Па пустыннай і змрочнай алеі*
*Я іду. Чую жудасны стук*
*Малаткоў і сякераў. Чарнее*
*Хворы ясень з абрубкамі рук.*

*Сумна так! Сярод гэтых пачварных*
*Дрэваў – птушак мне больш не пачуць.*
*З туманамі злавесныя хмары*
*Нізка-нізка над краем плывуць...*

***
*Слабне вера. І не той я сам.*
*Мне б вярнуць назад дзесятак год...*
*Не для Бога хам будуе храм –*
*Дзеля ўцехі гонару свайго.*

*Смерць наўкол. Людская льецца кроў.*
*Гінуць душы ў д'ябалавым агні.*
*Ані бляску ў свеце ліхтароў,*
*І куды ні глянь – смурод і гніль.*

*Летам – снег, зімой – дажджы, дважджы.*
*Змушаны я ў зацемку датлець.*
*Край... народ... Ды й ён зусім чужы,*
*Не магу яго і зразумець...*



*Свет перавярнуўся на вачох.*
*Зніклі назаўсёды мары-сны.*
*І на троне, дзе калісь жыў Бог...*
*Дэман валадарыць там зямны.*

АПОВЕД

# ГРАНДЫЁЗНЫ ЗАКОНАПРАЕКТ

Ілля РАСОЛАЎ

Дэпутат Варган Варганавіч Груздалёў з фракцыі "Праспаны край" не спяшаючыся набіў тытунём люльку, важна выкурыў яе і ўзяўся за нажніцы. Справаў было няшмат, і ён, пстрыкаючы нажніцамі, як звычайна скідваў папяровыя габлюшкі папсаваных законапраектных дакументаў у сметніцу.

Крыху больш за пяцьдзесят, шчыльнага целаскладу, мускулісты, з шырока разгорнутымі плячыма і выпуклымі магутнымі грудзямі, на сваім працоўным месцы Груздалёў быў падобны на барацьбіта або цяжкаатлета. Сёння ён раней звычайнага адпусціў дадому кіроўцу і памагатых. У будынку Гаспадаравай Думкі запанавала цішыня, звычайная для надыходзячых зімовых вакацый. Груздалёў распраміўся ў мяккім фатэлі і задумаўся аб сваім нялёгкім дэпутацкім лёсе.

На пасадзе старшыні профільнага камітэта па ўладкаванні кутоў і платоў ён працаваў ужо не першы год. Не выпадкова высокае, надзеленае чароўнай уладай, начальства, даверыла гэты партфель менавіта яму. Былы старшыня Думкі, незабыўны спікер Расшыбайкін любіў паўтараць: «Прызначэнцаў у нашай справе шмат, а Груздалёў у нас такі – адзін». Кіраўнік профільнага камітэта не тое, каб стаміўся ад сваіх перапрызначэнняў у Думе. Часам яму снілася, што можна было б перадаручыць каму-небудзь цяжкае ўладкаванне кутоў і платоў, але… як здавалася Варгану Варганавічу, самы галоўны і грандыёзны яго плот, гэта значыць законапраект, – наперадзе. Увогуле, сыходзіць на супакой было яшчэ рана.

Нечакана зазваніў тэлефон. Груздалёў чамусьці нават занепакоіўся, што так рана адпусціў памагатых. Ён пакрывіўся на апарат, аднак тэлефонная кананада не сцішалася. Тэлефанавалі па другой «вяртушцы». Дэпутат неахвотна ўзяў трубку:

– Прыёмная Груздалёва. Слухаю.

– Тэлефануюць з прыёмнай намесніка старшыні Гаспадаравай Думкі генерала па будаўніцтве вертадромаў Аліпкера Муслімавіча Прахіндоева. Варганыч, ты, старая сука? – пачуўся ў тэлефоннай трубцы знаёмы голас Муслімыча.

– Муслімыч, што здарылася? Думаў, ты на Кіпры з бабамі. Самы час.

– Якраз не час. Слухай сюды, адразу да справы. Гэтыя курвы з партыі «Нямыты край» зусім абарзянелі. Хочуць нас затрымаць з адпускнымі, уносяць новы праект закона аб пажыццёвым тэрміне для Вярхоўнага.

– Як гэта аб пажыццёвым? Ёсць жа Канстытуцыя! – загрымеў Груздалёў, варушачы ў памяці веды па юрыспрудэнцыі. – І ўся астатняя дробязь… – працягнуў ён, – таму Галоўнакамандуючы сыйдзе на супакой ужо ў наступным верасні.

– Ды што ім твая Канстытуцыя! Дадзена адмашка, Кукуеву тэлефанаваў сам Юрдуеў, а Юрдуеву сказаў сам Мамуеў. Мамуеў даведаўся аб тым у Прэзідэнта Буркіна-Фасо, з якім піў гарэлку на брудэршафт на тамтэйшым свяце з выпадку пачатку Вялікага Даждж у. Потым Кукуеў і Буздакрыкін былі на прыёме ў Вярхоўнага камісара папуасаў Паўночнай Гвінеі. Усюды інфармацыя пацвярджаецца. Прозвішчы ўсе табе вядомыя. Гэта нашыя найгаднейшыя людзі, якіх ведаюць ва ўсім свеце, у любой еўрапейскай краіне.

– Іншая справа, – нясмела абарваў прыяцеля Груздалёў. – А Кукуеў паранейшаму сустракаецца з дачкой Вярхоўнага?



Ілля Расолаў – паэт, празаік, журналіст, доктар юрыдычных навук, сябар Саюза пісьменнікаў Масквы.

Нарадзіўся ў сям'і беларусаў. Жыве ў Маскве.

– Не па тэлефоне… яна цяпер у Мюнхене. Зойдзеш да мяне. Усё распавяду.

– Зразумеў, – сумна прамармытаў Груздалёў, сцяміўшы, што дарма ляпнуў аб дачцы па тэлефоне.

– Так што думай. Ты ж нездарма на гэтае месца прызначаны, – працягваў Муслімыч. – Ты – вытворнае ад усяго вялікага, народнага, статкавага. – Муслімыч хацеў яшчэ далучыць да гэтага нейкую цытату з вялікага правадыра ўсіх чырвонагаловых, але тут жа аціх, успомніўшы, што Вярхоўны галоўнакамандуючы гэтага правадыра не любіць.

– Кінь, Муслімыч, якое вытворнае? Дзе ты бачыў гэты народ? Ён вунь… а мы во… – пачаў усхваляванa жэстыкуляваць Груздалёў, успомніўшы, як аднойчы быў змушаны выступаць на мітынгу ў Самары ў падтрымку свайго прыяцеля губернатара Грабежкіна. – Што рабіць будзем? – спытаў пасля невялікай паўзы.

– Што-што… будзем рыхтаваць наш законапраект. Я цяпер размаўляў з Прыкатайкіным з Адміністрацыі. Нам дадзеная адмашка. Абяцалі, што прагаласуюць усе. Але наш праект закона павінен быць неверагодна грандыёзным. Калі папрацуем добра, абяцалі вечную памяць. Цябе ўзнагародзяць крыжам, ганаровым месцам на могілках і акцыямі «Нафта-газа-соплепрама», ды яшчэ мэр Капейкін абяцаў падарыць некалькі кватэр у цэнтры горада пад офіс, дзе можна будзе прымаць высокіх гасцей.

– Высокіх… – прашаптаў Груздалёў.

– І стройных…

Муслімыч засмяяўся і кінуў трубку.

Варган Варганавіч Груздалёў доўга хадзіў па кабінеце. Ён думаў, страляючы вачыма на партрэт Галоўнакамандуючага. Гэты маленькі, несамавіты чалавечак, нададзены вялікай уладай і бязмернай народнай любоўю, сядзіць сабе дзесьці там, у Сочы, і чакае ад яго, Груздалёва, важных дзяржаўных рашэнняў.

Дэпутату нечакана захацелася выйсці з прасторнага кабінета і даведацца ў людзей, у натоўпу аб тым, што яго хвалюе. Але ён чамусьці падумаў, што цяпер не час, ды і дзе, у канцы працоўнага дня, знойдзеш патрэбных людзей, у якіх можна было б нешта толкам распытаць. Хіба што – у вахцёра або прыбіральшчыцы.

«Трэба будзе ў бліжэйшы тыдзень замовіць сацыялагічнае апытанне на гэтую тэму ў аўтарытэтнага цэнтра «Чаго дазволіце?». Куды зручней рапартаваць, абапіраючыся на падрыхтаваныя і правераныя лічбы, чым на сумніўную грамадскую думку». – Гэта натхніла Груздалёва, і ён адчуў упэўненасць у сабе.

Прайшло яшчэ каля гадзіны цяжкіх дэпутацкіх разважанняў. Груздалёў нацягнуў пінжак і стаў вызвоньваць свайго кіроўцу. Той абяцаў прыехаць праз чвэрць гадзіны і прывезці пошту. Заставалася дачакацца, і працоўны адпачынак дэпутата, здавалася, закончыўся б. Нечакана погляд Варгана прыцягнуў фотаздымак з кіраўніком горада Капейкіным, які стаяў у акуратнай рамцы на стале. Ворыч, як звалі мэра сябры, выглядаў на здымку вельмі стомленым, нават пабітым. Нягледзячы на патухлы погляд, на грудзях кіраўніка горада красаваліся два ордэны «Астаткі сумлення» І-ай і IV-ай ступені. Побач з ім Груздалёў здаваўся проста хлапчуком.

«Семдзесят дзевяты год пайшоў Ворычу, – падумаў ён, – а якая хвацкая памяць! Запамінае лічбы толькі так. Бывае, кажу яму: шэсць атрымлівае, мільён дзелім на дваіх. Арыфметыка! Толькі галавой ківае і паўтарае: «Разгледзім! Праверым! Разгледзім! Праверым!» Словам – прафесіянал. Ды ўзяць хоць бы Папугайкіна. Яму ўжо восемдзесят шосты год, а яшчэ ходзіць самастойна, нават без палачкі. А які парадак навёў у Міністэрстве па ўсеагульнай нянавісці! Проста бляск! Трох намаў пасадзіў у турму, дзевяць сакратарак сабе завёў. Адміністратар. Родапачынальнік адміністрацыйнай рэформы! Усе працуюць, а ён, знай сабе, адпачывае. Так… яшчэ гадоў дзесяцьдваццаць і разгубім увесь стары кадравы склад. Медыцына цяпер не тая. Не тое, што ў старых час: забальзамуюць цябе, ляжы сабе, адпачывай на вечныя часы. Пашана і павага. Натоўп рыдаючага плебсу з успамінам аб таннай каўбасе і распуснай маладосці. А цяпер наперад нагамі вынесуць і не заўважаць. Моладзь цяпер непрыстойная. Хто ідзе нам на змену? – пахітаў галавой Груздалёў. – Суцэльная шантрапа і драбязa. Вось калі б расійскаму службоўцу пасля сямідзесяці сталі не дадаваць, а наадварот змяншаць гады! Працуе сабе на семдзесят другім годзе, а яму пішуць семдзесят першы, і так пакуль ён неператворыцца ў юнака, а потым зноў стане мужнець за працоўным сталом. Ад гэтага б толькі выйграла Айчына, ды і наколькі б памаладзелі заступнікі народу». Ад такіх разважанняў Груздалёву стала не па сабе, лоб яго пакрыўся потам: «Як гэта ён, дэпутат Груздалёў, неўзабаве застанецца адзін на гэтым белым свеце без Капейкіна і Папугайкіна?»

Уладар кутоў і платоў выцягнуў насоўку, дбайна выцер пот і вырашыў, што нельга гэтую справу пускаць так, на самацёк. Трэба выступіць на чарговым пасяджэнні Палаткі і падтрымаць старых! Выказацца ў падтрымку старога курсу. Груздалёў нават падышоў да пісьмовага стала і напісаў алоўкам на паперы: «Пераемнасць улады – аснова ўладкавання кутоў і платоў». Вось табе і аснова для новага законапраекта.

Тэкст закона зглямэздалі праз тыдзень. Асноўная думка Варгана Варганавіча Груздалёва выглядала так: «Народ наш вялікі і мудры. Ён мае вялікую гісторыю. Народ бясстрашны, подзвіг яго несмяротны. Улада Галоўнакамандуючага вытворная ад улады народа. Ён і ёсць увасабленне народа. Сам народ кіраваць сабой не можа, гэтым займаецца адмысловы апарат. Галоўнакамандуючага перадае службоўцам частку сваіх высокіх паўнамоцтваў. Яны ў сваю чаргу таксама павінны быць несмяротныя. Адзінай перашкодай на шляху прагрэсу і адміністрацыйнай рэформы з'яўляецца век службоўца і той факт, што нястомным працаўнікам даводзіцца паміраць. А гэта – нярупліваe выкарыстанне людскіх і дзяржаўных рэсурсаў. Але на сённяшні дзень, па меркаванні фракцыі «Праспаны край», гэта не перашкода. Найноўшыя тэхналогіі сусветнай медыцыны дазваляюць хутка вырашыць гэтую праблему. Неабходна надзяліць службоўца адмысловымі паўнамоцтвамі. Ён можа працаваць на сваім пасту і пасля фізічнай смерці, кіруючы народам з замагільнага свету. Выйгрышным пунктам законапраекта з'яўляецца палажэнне аб эканоміі фінансавых сродкаў. Пасля непазбежнай адстаўкі заробак памерламу службоўцу не налічаецца, працоўны стаж не залічваецца, увесь яго прыбытак ідзе ў карысць дзяржавы»…

Узнагарода знайшла Груздалёва толькі на пачатку калядных святаў. Гэта была раскошная тэлеграма з віншаваннем ад Галоўнакамандуючага. Нягледзячы на тое, што ў прэзідэнцкім пасланні было ўсяго некалькі фразаў, усе яны былі прасякнутыя рэдкім патрыятызмам:

«Улічваючы ваш адмысловы ўнёсак у справу будаўніцтва абноўленага Краю, дазвольце выказаць вам сваю падзяку. Як сапраўдны грамадзянін і патрыёт, вы пакутуеце ўсім сэрцам за лёс нашага народа, за справядлівае ўладкаванне нашай магутнай імперыі. Нястомным вашым клопатам з'яўляецца фармаванне маральных і духоўных ідэалаў. З вашым імем цяпер назаўжды звязаная ідэя збережання народа».

Неўзабаве патэлефанаваў Муслімыч.

– Выдатна зроблена, нас падтрымалі на самім версе. Старыя проста ў захапленні! Да свінячага віску. Асабліва Папугайкін, ён як пачуў аб нашай ідэі – завёў яшчэ адну сакратарку. Поўны сілаў і гатовы яшчэ працаваць сто гадоў!

Цяпер засталося замацавацца на гэтай пазіцыі і папрацаваць яшчэ. Просяць унесці ў Закон «Аб вечнай маладосці і нязменнасці службоўцаў» папраўку, каб яго дзеянне распаўсюджвалася на сваякоў і сяброў Галоўнакамандуючага!

Так што наперадзе ў нас яшчэ шмат грандыёзных законапраектаў.

# ПАЎЗЕ ПАДМАРОЖАНАЯ СВІСЛАЧ

### СЛОВА

“Пятая калонка” працягвае хваліцца талентамі, якія не даў закапаць у зямлю конкурс маладых літаратараў імя Карласа Шэрмана, што ладзіўся ПЭН-цэнтрам напачатку 2009 года. Асноўнай адметнасцю сёлетняга конкурса было тое, што ўпершыню маладыя перакладчыкі былі вылучаныя ў асобную намінацыю. А асноўнай прыемнасцю – тое, што найлепшыя фіналісты спалучылі ў сабе адразу дзве творчыя іпастасі, выступіўшы і як паэты, і як перакладчыкі.

Уладзь Лянкевіч спявае свае тэксты пад музыку. Пазбягаючы слова “бард” – найноўшае пакаленне ўвогуле пазбягае слова “бард”, дыскрэдытаванага, на іх погляд, познесавецкай і “дзевяностай” рыторыкай. Але калі гэтае слова ўсё-ткі ўжыць, творчы карунак, у якім рухаецца Уладзь Лянкевіч, можна назваць “бард-мадэрн”. Гэта цяжка ўявіць, прачытаўшы на паперы, – і тым больш мы б не рызыкнулі расставіць акорды над радкамі гэтых вершаў.

Лянкевіч-паэт арганічна абарочваецца Лянкевічам-перакладчыкам паэзіі. Чытаючы ягоныя пераклады Гіёма Апалінэра, разумееш, дзе караніцца яго ўласная паэтыка, а чытаючы яго вершы, – наадварот, цешышся, што ў беларускай літаратуры з’яўляюцца творцы, якім не трэба наступаць на горла ўласнай песні, каб адэкватна і з душой перакласці класікаў еўрапейскага мадэрнізма.

**Марыйка Мартысевіч**

**Уладзь ЛЯНКЕВІЧ**

***

учора караткевіч плакаў пад снегам
непадалёк ад соннай артэрыі менску

усе подбегам
асобныя бегам

я абдымаю дрэвы калі мне кепска

(памятаеш, мы чулі гукі лютні
ды песню чорнага хлеба)

тут ён кавалкамі валяецца
хрумсціць пад нагамі прыцярушаны

галубы гэтага горада адляцелі ў вырай

***

Я жыву на восьмым паверсе

Ягонае цела кінулі дагніваць
Парэшткі скубаў вецер груганнё і сабакі

Груганы выраслалі з добрую хату
клявалі мінакоў і вулічны брук
наеўшыся ўсчыналі спевы пад грукат
камянёў у іхных жыватах (шлунках)
не ўзляталі ад цяжару з’едзенага
ператвараліся ў цёмна-вельмі-цёмна-сінія
кучы і марудна распаўзаліся магмай
па тым каго мы па звычцы называем
горадам

Я прачнуўся, выйшаў з пад’езду. Здзівіўся,
відаць, прапусціў вывяржэнне вулкану.
Хутчэй за ўсё таго, што на адной
з цэнтральных плошчаў.
(А ведаеце, можа гэта напраўду прыгожа
– даваць плошчам назвы месяцаў)

### Павольная пампея

Не. Усё-ткі я прачнуўся, выйшаў з пад’езду
і не здзівіўся.
Толькі якім-небудзь халодным вясновым
вечарком я падумаю:
як добра мне жыць на першым паверсе

Не, чакайце, тут штосьці не так…
я выразна памятаю суседзяў знізу

***

дробачкі Сёння сыплюцца як жвір
хтосьці выпіў капяжы

я мог бы быць тваім цмокам
вазіў бы цябе на спіне па горадзе
выкідаў бы смецце бегаў у краму
аніякіх праблемаў з паркоўкай
ды ў любую хвіліну – на лецішча

і дахі на якіх заставаліся б сляды маіх
ступакоў
ганарыліся б і па начох апавядалі б
суседнім
як гэта

проста я ведаю, ты любіш
паржавелую бляху, гарышчы
і крыху мае лусачкі

ты называла б мяне з асаблівацямі



Уладзь Лянкевіч нарадзіўся 1987 годзе ў Мінску. Скончыў філалагічны факультэт БДУ (беларуская філалогія) і Беларускі Калегіюм (філасофія / літаратура). Сябра рэдакцыі інтэрнэт-часопіса перакладной літаратуры “Прайдзісвет” (www.prajdzisvet.org).

паўночна-ўсходняй вымовы
Чмок

ты ляпіла б для мяне з батона
юнакоў і дзяўчат

А ў зімовыя вечары
ты б грэла рукі ля маёй пашчы
а ноздры прыдаліся б як фен

Але я не стану тваім цмокам
бо яшчэ з маленства памятаю
чым такія гісторыі сканчаюцца

*(песня 1)*

усё пачалося з таго, што я перастаў
розніць дождж і снег
розніць дождж і снег
дыхнуў вецер
рыпнулі веснічкі
ты ўпала з дрэва
лужынай на дарогу
лужына на досвітку
я праходзіў побач
патрапіў лапкамі
ты загарнула далоні
і шэпчаш цяпер
ты шэпчаш цяпер
багоўка багоўка
божая кароўка
паляці на небка
прынясі нам хлебка
чорнага і белага
толькі не гарэлага
а я не палячу

неспадзявана ўраз
знячэўку й раптам
нечакана знянацку
самахоць у балота
спакваля неўпрыцям цішком
незаўважна паціху
ціхачом і паволі
самахоць у балота

ты мая любая імшара алёс
багна балота дрыгва і твань
ты мая багна дрыгва і твань
морач круговіна вязь ды алёс
ты мяне зацягнеш
ты трасавіна дрыгва і твань
морач круговіна багна алёс
ты мяне зацягнеш
ты мяне засмокчаш
ты маё балота

Твае абдымкі былі незамкнёныя я
ўвайшоў

*(песня 2)*

Вазьмі мяне на рукі і занясі туды,
У княства, дзе не ловіць мабільны
тэлефон,
Дзе вуліцы брукуюць бульбай ды
яблыкам
А на правым крысе твайго паліто
А на правым крысе яго паліто
жывуць казкі
Ужо на даляглядзе, здымай абутак,
Кладзі мяне ў пантофлю ды і сама лягай,
Плывем пад бзззз пчолкі па густасеянай
расе
А на левым крысе твайго паліто
А на нейкім крысе яго паліто
дом пчалярскі
Тут кнігі пішуць галубы
Люлі-люлі-люлі,
прыляцелі гулі,
селі на варотах
у чырвоных ботах

гэткія ж як боты
кніжак пераплёты

І жаўцее самотная рыбіна ў сажалцы,
Скідае луску, а тая ўсплывае –
Прыкідаецца лісцём апалым

Распраніся і стань люстэркам

***

*“мяне ў дзяцінстве называлі – Ляля”*

**З ейных словаў**

Пакажы, што ты хаваеш у руцэ
пальчыкі быццам у лялькі, зробленае з
кавалачкаў крэйды
і чым даўжэй яна водзіць рукой па маіх
валасах,
карацеюць ейныя пальцы, сціраюцца,
спісваюцца
а я сівею
ножкі ейныя, калі танчыць, пакідаюць
малюнкі
а трохі пазьней, як не стане грошай, мы
ўладкуем цябе на працу
ты будзеш наносіць разметку (куды дагэ
туль не заязджала кола машыны)
толькі цяпер я разумею, чаму яна не ўмее
плаваць (чаму ты не ўмееш плаваць,
лялечка)
крэйду лёгка пакрыўдзіць
крохкая
хто цябе сабраў з крэйдзінак? што засталіся
ў зарослых імхом класах,
закаціліся пад настаўніцкі стол
старыя драўляныя дошкі пакрыла зяленіва,
нехта ўпрыгожыў маем
лабірынты шчылінак у зацёртым паркеце,
пісягі
ляцелі сарокі, ухапілі ўрокі
я чуў, што на моры на кіяне стаіць белы
камень,
дзяды над морам праляталі, іхныя слёзкі
на камень упалі
Ты адтуль?

Я хвалююся, калі ты пячэш штокалечы з
мукі, я баюся,
каб ты не заблукала ў ёй, не схавалася,
а печыва твае заўсёды з такім чароўным
смакам
а раптам гэта ты шторазу крышку сябе ў
цеста крышыла?
а разынкі ў пірагу – гэта твае зрэначкі?
чалавечкі? лялечкі?

***

*Sous le pont Mirabeau coule la Seine*

Паўзе падмарожаная Свіслач

[яна даўно не сябруе з Менскам больш не
адбівае яго]

Яна любіць калі качкі казычуць яе
лапкамі
качкі – выгнанцы
рака – рэзервацыя
Яны месяць гушчу вады – за гэта дзякуй
дзякуй таксама рэдкім аматарам круціць
катамараныя колы
што яшчэ паўзе, не застыгла, не стала
колам
Яе пашчыпвае мароз ды чайка дзюбаю
абое вязнуць
Рыбіны ў ёй з цягам часу сталі нагадваць
кратоў,
бо інакш аніяк не прабрацца скрозь
зеленаваты кісель
[кемкія дзядкі ўзяўшы рыдлёўку й вядро не
кепскі часам прыносяць дадому ўлоў]

### Паўзе падмарожаная Свіслач

Мы часта задаемся пытаннем, куды
падзяецца наш горад. Я ўспомніў адказ.
Якбыў я малым, боўтаў дубчыкам у свіслачы
[гэта было па-за горадам, з бацькам
рыбаліць пайшлі]
я разбіваў павуціне за кустом
трэба падчапіць вось там
падалей цягнуся – бульк
крычу тата! і не чую, толькі звініць
увушшу
і тут я прыкмеціў, як па дне супраць
плыні
валакуцца старыя будынкі драўляныя
хаты камяніцы і цэрквы касцёлы і
плошчы сядзібы
а між іх шпацыруюць па рухомых вулках
дзіўныя людзі
я падумаў
вялікі эскалатар ляжыць на дне свіслачы і
ўсё гэта падымае ўверх па цячэнні

напэўна, я не патануў тады
бо ўчапіўся за травяную чупрынку берага
бо тата схапіў мяне за руку
гэта здарылася, калі яшчэ можна было
патануць у ёй
цяпер – толькі заграznуць

са свіслачы нельга напіцца,
толькі адарваць кавалачак,
вылепіць з яго свісцёлку й падараваць
дзіцяці

паўзе падмарожаная Свіслач

я ведаю, калісьці я пакажу табе тое месца.

ДАЛЯГЛЯД

# АНАТОМІЯ БЯСКОНЦАСЦІ

У літаратуры нібыта “усё ўжо сказана”. Сказана многае, сапраўды. Але ментальны працэс грамадства адбываецца, і на мяжу грамадскага прызнання выходзяць тыя, хто здольны гэтыя ніткі сувязяў пабачыць, паказаць іх у асляпляльнасці бліскавак жыццёвых падзей. Той, хто ахапляе існы стан цэлым позіркам і можа ў сваёй ацэнцы даць трапную метафару, патрапляе сёння (як і заўсёды) на грэбень хвалі...

Дваццаць гадоў пакутаваў на дэпрэсію амерыканскі пісьменнік Дэвід Уолес (David Foster Wallace). Літаратурная знакамітасць Амерыкі, аўтар бэстсэлераў, што ўваходзяць у сотню найлепшых амерыканскіх раманаў і ў дваццатку найбольш раскуплялых кніг, 12 верасня мінулагагода засіліўся...

Ён спрабаваў гаварыць пра свет, у якім жыве, праз метафару бясконцасці. І сам, мусіць, разумеў хісткасць такой “метафарычнасці.

Найвядомейшы Ўолесаў раман — “Бясконцы кпін” (Infinite Jest; 1996). Вялізная таміна на тысячу з гакам старонак. У кнізе сплятаюцца аповеды пра жыццё ўяўных Акадэміі тэнісу і Шпіталю для наркаманаў і алкаголікаў. Акадэмія на гары, Шпіталь пад гарой. Беднякі і нябогі з-пад гары марацьбыць на гары. Але і на гары – не канцавы пункт, і там маюць сваю мэту і мару. Дзецюкоў у Акадэміі рыхтуюць да “Шоў” (найбольшы гульнёвы турнір). Такая вось складаная метафара сацыяльных каштоўнасцяў. Дзеянне часта пераскоквае ў будучыню, дзе створаны заснавальнікам Акадэміі авангардны фільм – адзіная “Забава” (так усе і называюць), дый такая прывабная, што людзі гатовыя глядзець яе бясконца. Фільм той і мае назву “Бясконцы кпін”. Стваральнік жа фільму даўно ўжо звар’яцеў і скончыў жыццё самагубствам, засунуўшы галаву ў мікрахвалёўку.

Галава, якая згарае ў жары, — не адзіны вобраз, якім аўтар нібы вымалёўвае абразок “чалавек вымысліе бясконцасць”. У іншым рамане “Усё і яшчэ болей: маленькая гісторыя бясконцасці” (Everything and More: A Compact History of ∞; 2003) аповед ідзе пра жыццяпіс знакамітага матэматыка XIX стагоддзя Георга Кантара, які запачаткаваў “тэорыі мностваў”. Кантар вымысліў праз розум і матэматычную логіку шчыльней наблізіцца да разумення бога, параўноўваў тое, што дагэтуль лічылася зусім адным і боскім, — з бясконцасцю. Маўляў, бясконцасці могуць быць няроўныя і ўключацца адна ў адну, а “наймацнейшая” бясконцасць і ёсць бог. Не могучы давесці парадоксы сваёй тэорыі, Кантар звар’яцеў і дваццаць гадоў прабавіў у вар’ятні. Згарэў на рабоце, прабачце за чорны гумар...

Нарэшце, тая галава, што ў пісьменніка-Ўолеса згараевар’яцее ад разумовага набліжэння да бясконцасці, мае і яшчэ адну бачную рысу. Гэта з апавядання “І яшчэ адзін прыклад пранікнёнасці пэўных межаў” (Yet Another Example of the Porousness of Certain Borders; 1997), у якім маці выйграе ў сына судовы зыск па абароне правоў спажыўцоў, на атрыманыя грошы робіць пластычную аперацыю, якая праходзіць няўдала, і яе твар робіцца застыглай маскай жудкай вусцішы. І цяпер сын мусіць суправаджаць маці ў яе паездках аўтобусам.

Замысліўшы прагаварыць пра бясконцасць, Уолес даў зразумелую метафару: бясконцасць, спадарства, – гэта не бог, не лічба і не абстракцыя; бясконцасць – гэта вашая галава, што палае вар’яцкім пякельным агнём і носіць пячатку гэтага агню на сваім твары. Такая апакаліптычная выява свету, які жыццё вылічвае, бога вымярае, а даброты праграмуе.

Уолес не стрываў і ўдавіўся. Маўляў, і прыкладам сваім пацвярджаю...

**Алесь МІКУС**

# ТЭНІС, ТРЫГАНАМЕТРЫЯ, ТАРНАДА: ХЛАПЕЦТВА НА СЯРЭДНІМ ЗАХАДЗЕ



Дэвід Уолес

Калі я пакінуў сваё заціснутае сярод фермерскіх абсягаў Ілінойсу мястэчка, каб пайсці ў бацькаву alma mater у шумлівым Беркшыры, што ў заходнім Масачусэтсэ, я адразу ж выявіў свае здольнасці ў матэматыцы. Цяпер пачынаю разумець, чаму так. Матэматыка ў каледжы выклікала тугу ў жыхара Сярэдняга Захаду па доме. Я вырас сярод вектараў, ліній ды ліній, перпендыкулярных лініям, кр таў. А на ўзроўні далягляду – тлустыя скрыўленыя лініі прыроднага асяроддзя, дзіўнай тапаграфічнай кругаверці, што пасела, круцячыся на брыжах вялікай наваколнай талеркі, пасярод якой была суцэльная, адпрасаваная ледавіком роўнядзь. Я мог на вока вызначыць плошчу паміж тымі тлустымі крывымі і ніжэй за іх, на сутыку зямлі і нябёснага шляху, – яшчэ задоўга да таго, як хоць нешта ўведаў пра фармальныя інтэгралы або ступені свабоды. Вылічэнне было, у літаральным сэнсе, маёй дзіцячай забавай. <...>

Вось жа, умовы ў Цэнтральным Ілінойсе з матэматычнай перспектывы цікавыя, а з гледзішча тэнісу кепскія. Улетку – спёка і вільготная сырасць; матылі і здакучлівыя мушкі, што ўтвараюць астэроідны пояс вакол кожнага высокага ліхтара ўначы, і ўсё гэта прасвятляе на паверхні корту спазматычныя дробныя цені; камары, якія насядаюць на палявыя барозны і заімшэлыя разоры на мяжы кожнага поля; а найболей вецер.

Той, хто не з Сярэдняга Захаду, кажа пра яго суцэльную роўнядзь, чорную зямлю і палі зялёных зараснікаў (“лёгкае шчацінне”), далікатныя ўзгоркі і пукатасці, якія робяць тапалогію пакутлівым практыкаваннем з вызначэння квадратаў, а шашу – такой аднолькавай і змярцвелай, што гэта даводзіць вадзіцеляў да шаленства. Калі свой Сярэдні Захад згадвае каторы з Індыяны, Вісконсіну або паўночнага Ілінойсу, дык прыгадвае сельскую гаспадарку і прыбыткі з яе, кукурузу-бабы-зерне, і яблычна-шчокія нардычныя тыпы, і сідр, і рэзанне жывёлы, і футбольныя матчы з белым туманным дыханнем, што выходзіць са шлемаў. Але ў дзіўнай цэнтральнай кішэні, дзе Шампань-Урбана, Рэнтул, Філа, Магамет-Сэймур, Матун і Талона, цэнтральна-заходняе жыццё фармуецца і дэфармуецца ветрам. На захад, паміж намі і Гарамі, няма бадай нічога высокага, і непазбежныя зефіры і паветраныя зрухі злучаюцца з лёгкімі і рэзкімі павевамі ды з чорт ведае чым аднекуль з Нэбраскі і Канзасу, ды рушаць на ўсход як ручаіны ў раку, як струмяні гарачага паветра, як ваенныя франты – наспельваюцца, бы снежныя абвалы, і, равучы, сунуцца назад па выараным следзе першага бізона, да нашых непрытуленых трыбухоў. Ніхто, каго я ведаў у Філа, не часаў сваіх валасоў, бо чаго ж непакоіцца. <...>

Я вельмі цаню тое, што пачуваўся адмыслова ўтульна сярод простых ліній. Тое было ад асяроддзя. Маё мястэчка Філа – гэта такая ссунутыя краты: дзевяць вуліц з поўначы на поўдзень супраць шасці з паўночнага ўсходу на паўднёвы захад, дзесяткі і дзесяткі скасавурана-крыжападобных вуглоў (тангенсы вуглоў перасячэння ўсходу і захаду маглі б інтэгральна ацэньвацца паводле іх секансаў!) вакол гарадскога цэнтра, што складаўся з трох перасячэнняў. Большасць маіх успамінаў дзяцінства – ці гэта ўзараныя акры зямлі альбо варта жняцоў ўздоўж вуліцы Р.Р.104В, альбо гульня рэзкіх ценяў у прыцемках поля на сафтболе ў Легіён-Холе, – усё гэта пры патрэбе я мог бы зараз аднавіць з вугольнікам і транспарцірам.

Мне падабаліся вострыя дачыненні простых ліній больш, чым каму з дзяцей, з якімі я вырас. Мяркую, гэта дзеля таго што яны былі тамтэйшыя, тады як мяне ў маленстве правезлі з Ітакі, з Нью-Ёрку, дзе тата меў навуковую ступень. Такім чынам, я ведаў, хоць бы і дзіцём, гарызантальна і паўсвядома, нешта іншае – высокія пагоркі і серпантын аднабаковых дарог паўночнага Нью-Ёрку. Я ўпэўнены, што захаваў гэтую кашу з крывых і ўзвышшаў як кантрастны фон дзесь глыбока ў змяёвай частцы маіх мазгоў. Дзеці з Філа, з якімі я біўся і гуляў, ніколі не знаалі нічога іншага і не бачылі тут, у такім плане мястэчка, нічога надта дзіўнага; адпаведна, гэта і не ўзрушала іх.

Мой першы дэталёвы ўспамін – спрэс вострыя вуглы. Аднойчы ў красавіку я дапамагаў суседскаму хлопчыку дапамагаць яго маці палоць іх новы гарод на заднім двары. Абрыс гароду быў дакладна квадратны, з пяццю размешчанымі “ў шахматным парадку” дзялянкамі – у цэнтры свяшчэнныя цукіні – усё спарадкавана ў такую літару “Н”, разлінавана калкамі і вяроўкамі. Мы, малыя хлопчыкі, адкідалі каменне і буйныя камякі з дарогі кабеты, якая працавала з культыватарам – заарандаваным, у форме вазка з ручкамі, на бензінавым паліве; культыватар роў і хроп, станавіўся на дыбкі і, здавалася, сам хутчэй штурхаў сваю гаспадыню, чым яна яго; яе ногі пакідалі п’яныя сляды на зямлі. Неўзабаве ў слязах і з плачам на двор выйшаў маленькі брат майго сябрука, мо’ гады чатыры на той час. Ён быў у нейкай пухнатай чырвонай апранасе і трымаў у звернутай угору далоньцы нешта не дужа прыемнае з выгляду. Ромбападобны кавалак цьвілі з нейкага экзатычнага завугалля іх вільготнага падвалу. Нешта зялёнае, у чорных плямках, няўцямнакалматае. Горш за тое, кавалак цьвілі выглядаў недавершаным, падгрызеным; нейкай гідкай дрэнню быў спэцканы маленькі рот малечы. “Я з’еў гэта”, – пачаў ён румзаць, як толькі маці выключыла культыватар і падышла да яго. Мой сябрук і я былі забытыя, як на дзяцей забываюцца пры яшчэ меншых дзецях. Але ж маці таго малога, якая цяпер, здаецца, ужо адышла ў няпэўных медыцынскіх абставінах пару гадоў таму, зусім зашалела:

“Памажыце! Мой сын з’еў гэта!” – крычала яна зноў і зноў, высока трымаючы плямісты кавалак і бегаючы вакол сваіх квадрантаў, а мой сусед і я здзіўлена пазіралі на першую ў нашым досведзе дарослую гістэрыю; усхліпваючага малога забылі і мы, і кабета.

“Памажыце! Мой сын з’еў гэта! Памажыце!” – яна ўсё галасіла, бегаючы кампактнымі складанымі кароткімі маршрутамі акурат унутры вяровак, што пазначалі дзялянкі гароду. І я запомніў, што заўважыў, – і, мусіць, я адзін такі, хто заўважыў, – якімі роўнымі, нават падчас стрэсу, былі лініі яе палёту, якімі сапраўды па-амерыканску прамымі былі яе сляды, а яе павароты, унутры ідэаграмаў вяровак, – выразна-акрэсленымі і нейкімі зусім вайсковымі. Яна бегала і галасіла і разварочвалася і галасіла і бегала. Тата майго сябрука, з твару якога вытыркалася люлька, урэшце прыцягнуў шланг з вадой. <...>

Што да надвор’я, дык маё мястэчка, а па праўдзе і ўвесь усходнецэнтральны Ілінойс, – гэта ладная частка таго, што метэаролагі называюць Алеяй Тарнада. Я асабіста бачыў два ці тры на зямлі і пяць па-над зямлёй, што намагаліся сабрацца. Гратэскная часціня тарнада вакол майго мястэчка – гэта, як я кажу, функцыя тых жа пераменных, што выклікаюць і звычайныя ветры. Мы ж на такой каардынаце, дзе франты і паветраныя масы сыходзяцца. Большасць дзён паміж познім сакавіком і чэрвенем у тэлевізары нашых ТВ-станцый мільгаціць: “Пільнуйцеся Тарнада”. Пільнуйцеся – значыць, умовы для тарнада спрыяльныя. Але толькі на радзейшыя “Небяспекі Тарнада” трэба, каб хто адзін адмыслова назіраў і пры патрэбе ўключаў сірэны грамадскай абароны. Сірэна на версе Пачатковай Школы мястэчка Філа мела вышыню і цыкл гуку, адрозныя ад сірэны ў паўднёвай частцы мястэчка Ўрбаны, і вішчанне гэтых дзвюх сірэнаў злівалася і раз’ядноўвалася ў жахлівым хаўтурным пяянні...

Тарнада былі ладнай часткай майго дзяцінства на Сярэднім Захадзе, і, як малое дзіцё, мяне мучылі страхі пра тарнада. Найранейшыя мае кашмары былі пра скавытанне сірэнаў і змярцвела-белыя нябёсы, пра тонкага монстра на даляглядзе з боку Аёвы, які хутчэй па-яшчарнаму, чым па-фалічнаму, вытыркаўся з нізкага цяжкога неба, лётаючы туды-сюды так шалёна, што ён амаль падвойваўся, спрабуючы з’есці свой хвост, і раскідваў салому, пыл, крэслы. Ад далягляду ён ніколі не набліжаўся; ён і не мусіў.

Тое самае пераследавала мяне і калі я вырас. І я ведаю, чаму. Тарнада для мяне былі пераканфігураваннем. Як і ўсе сур’ёзныя вятры, яны былі такой z-каардынатай для нашага маленькага прасцягу роўнядзі, такім вытырканнем з еўклідавай манатоннасці нашых разораў, дарог, восяў і кратаў. Мы вучылі пра тарнада ў школе: канадскае ўзвышша накіроўвае тарнада на паўднёвы-ўсход ад Дакоты, а вільготная цёплая маса расцягвае яго на поўнач ад Арканзасу. Вынікам было не грэцкае х і нават не картэзіянская вось, але алхімічнае кручэнне квадрата па коле. У нашай частцы Цэнтральнага Ілінойсу тарнада былі кропкай без вымярэнняў, у якой паралельныя лініі сустракаліся, закручваліся і выбухалі. Тарнада тут былі і без мэтаў – дамкоў не раздзьмувалі, але выдзьмувалі. Мёртвых свойскіх жывёлаў знаходзілі за тры мілі без адзінай драпінкі на іх...

**1991 г.**

**З ангельскай пераклаў Алесь МІКУС.**

ДЗЕНЬ НАРОДЗІНАЎ

# ПУШКІН ЯК КРЫВОЕ ЛЮСТЭРКА ЛІТАРАТУРЫ



Алесь АКУЛІЧ

***

...Ну аніяк не разумею расійскіх жанчын XIX стагоддзя! І афіцэрыстых дваранаў хапала, ды і паэтаў не менш было – а вось стварылі сабе куміра... І росту недастатковага, і крыві-колеру... Таленту невымернага?

Тады яшчэ цяжэй: не магу ўразумець тысячы літаратуразнаўчых гімнаў у славу паэта. Перачытайце ягоныя вершы 1813 – 1830 гадоў. Альбомныя прысвячэнні, рыфмаваныя «пугі», памфлеты, эпіграмы, пераспевы антычнай паэзіі, і ўсё тое ў густ падліве байранізму...

Аднак жа хрэстаматыйны аўтар! Пералічым тое: «Вольность», «Деревня», «Я пережил свои желанья...», «Узник», «Свободы сеятель пустынный...», «Зимний вечер», «Пророк», «Во глубине сибирских руд...», «Друзьям», «Что в имени тебе моём?..»... Большасць з таго мае грамадзянска-публіцыстычны адценак. А калі яшчэ згадаць «Клеветникам России», «Бородинская годовщина» і падобныя вершы?

Дык дзе ж узнёслы лірык з пухнымі бакендардамі?

Дзесяцігоддзямі ў Пушкіне бачылі (паказвалі) зусім не тое, чым ён багаты. Чаму ён першы з першых, чаму мастацкі сімвал? Чаму горшымі былі ягоныя сучаснікі Жукоўскі, Бацюшкаў, Вяземскі, Баратынскі? Хто цяпер разбярэцца, калі ледзь не стагоддзе праз школу культывавалі аднаго Пушкіна, а за ім «вучня» Лермантава? І вышэй пералічанага дзесятка вершаў было дастаткова! Бо імі яскрава ілюстравалася савецкая ідэалогія ў дачыненні да культуры XIX стагоддзя: антыцарская скіраванасць, распачатая дзекабрыстамі. А тое, што «паэт голы» – каму да таго быў клопат?

Голы, канешне, у пераносным значэнні, хоць у яго не менш «падперчанага», чым хрэстаматыйнага. І многае мяжуе з багахульствам. Хто памятае пушкінскі верш «Христос воскрес»? Вось ён, «натуральны» Пушкін:

*Христос воскрес, моя Ревекка!*
*Сегодня следуя душой*
*Закону бога-человека,*
*С тобой целуюсь, ангел мой.*
*А завтра к вере Моисея*
*За поцелуй я не робея*
*Готов, еврейка, приступить –*
*И даже то тебе вручить,*
*Чем можно верного еврея*
*От православных отличить.*

Калі разумееце, у канцоўцы верша размова – не пра галаўныя ўборы...

Пушкін – не лірык. Ён – паэт-трыбун, за тое і быў узвялічаны. Ён скандэнсаваў вершаваную «дзяржаўнасць» ад Ламаносава да Дзяржавіна і Жукоўскага. Пушкін – у адной асобе таленавітая асучасненая анталогія-хрэстаматыя расійскай славеснасці, якая была выдрукавана ў эпоху царызму і арганічна чыталася ў часы савецкага самадзяржаўя. Іншыя ж вершы (акрамя некалькіх лірычных спеваў) былі і застаюцца сытнай ежай для тысячаў расійскамоўных графаманаў. І паспрабуй пярэчыць ім: так жа ў класіка! Калі лухта ў мяне, дык што ж у яго?!

Пушкін геніяльны не ў паэзіі, а ў эпіцы. У сваіх паэмах, баладах, вершаваных казках, нарэшце, у прозе. А вось як паэт-лірык...

Згадваецца тэлешаленства 1999 года, калі штодня Масква нагадвала: «Да дня нараджэння паэта засталося ... дзён». Можа, Ён і насамрэч пакуль яшчэ не нарадзіўся?

***

Пушкін – верны пііт імперыі, за тое і ўмануменчаны. За тое ў многіх цяпер незалежных краінах колішняй імперыі помнікі Пушкіну могуць быць паваленымі. І прычына таго – не ў модным цяпер антырусізме, а ў непрыхаванай, нават ваяўнічай імперскай свядомасці растыражаванага пісьменніка:

*И воспою тот славный час,*
*Когда, почуя бой кровавый,*
*На негодующий Кавказ*
*Поднялся наш орёл двухглавый…*

«Арліна-двухгаловы» імперскі цень яскрава выявіўся не толькі ў пушкінскіх вершах ды паэмах («Палтава» і падобных), але і ў дзённікавых запісах.



Фота: www.ruvr.ru і livejournal.com

...1828 год. Царская Расія пачала ваенныя дзеянні на Каўказе. Што робіць Пушкін? Турбуецца лёсам сяброў-«дзекабрыстаў»? Ён падае Мікалаю І прашэнне накіраваць яго ў дзеючае войска... Пра вандроўку на Каўказ і Турцыю «з калёс» напісаў «Путешествие в Арзум». Праехаў Грузію, Арменію – і заваяваныя землі лічыў сваімі. І рассентыментальнічаўся, калі пабыў за «граніцай»: *«...никогда я еще не вырывался из пределов необъятной России. Я весело въехал в заветную реку* (каўказскі Арпачай. — А.А.), *и добрый конь вынес меня на турецкий берег. Но этот берег уже был завоёван: я всё еще находился в России».*

Які ўзорчык антыгуманнасці і мілітарызму! І шавінізму, і антысемітызму, калі ўжо згадваць усё. Наступная цытата з «Кішынёўскага дзённіка» – ці не адна з самых «мяккіх»: *«...я принял его за жида, и неразлучные понятия жида и шпиона произвели во мне обыкновенное действие: я поворотился спиною»...*

Сувораўскія забойствы беларусаў-ліцвінаў і палякаў («кичливых ляхов») Пушкіну бачыліся толькі «домашним... спором славян». Ягоная муза ганарліва скакала па руінах Польшчы, Украіны, Каўказу ды ашалела пяяла:

*Победа! сердцу сладкий час!*
*Россия! встань и возвышайся!*

Узвышайся... на касцях абрабаваных і паняволеных табой народаў?..

*Наш Киев дряхлый, златоглавый,*
*Сей пращур русских городов,*
*Сроднит ли с буйною Варшавой*
*Святыню всех своих гробов? –*

гэтае пытанне не давала пііту спакойна спаць, і на яго адказалі і Шаўчэнка з Міцкевічам, і памаладзелы памаранчавы Кіеў...

***

«Души прекрасные порывы» былі заўважаны, але ацэнены сціпла: *«1834. 1 января. ...я пожалован в камер-юнкеры (что довольно неприлично моим летам). ... Меня спрашивали, доволен ли я своим камер-юнкерством. Доволен, потому что государь имел намерение отличить меня, а не сделать смешным, – а по мне хоть в камер-пажи, только б не заставили меня учиться французским вокабукам и арифметике».*

Аднак жа прымушалі... Як афрыканскаму прыдворнаму блазну мянялі фракі ды «трохвуголкі»-шляпы, калі тыя не адпавядалі бальнаму ўбранству...

У дзённіку, які пішацца «для сябе», Пушкін спавядальна выказваўся ў сваёй ледзь не рабскай павазе расійскаму самадзержцу Мікалаю І: *«Государь позволил мне печатать "Пугачёва"; мне возвращена моя рукопись с его замечаниями (очень дельными). В воскресенье на бале, в концертной, государь долго со мною разговаривал; он говорит очень хорошо...».* І далей: *«Я ужасно люблю царицу, несмотря на то, что ей уже 35 лет и даже 36»; «Царь дал мне взаймы 20 000 на печатание "Пугачёва". Спасибо».*

А, па вялікім рахунку, цара варта было выклікаць на дуэль – хоць бы за чытанне паэтавых пісьмаў да жонкі, – да прыкладу, ад 22 красавіка 1834 г. Ліст быў перлюстраваны маскоўскім почт-дырэктарам і патрапіў да цара. Мікалай І абурыўся тэкстам (дзе гаварылася пра святкаванне паўнагоддзя царскага нашчадка) і меў адпаведную размову з В.Жукоўскім. Па сталіцы пайшлі чуткі, аднак Пушкін нават не падаў у адстаўку, застаўся камер-"пажом"! Хоць і пераказваў той эпізод балючa: *«...какая глубокая безнравственность в привычках нашего правительства! Правительство распечатывает письма мужа к жене и приносит их читать царю (человеку благовоспитанному и честному), и царь не стыдится в том признаться – и давать ход интриге...».*

***

Пушкін – першы не мастацкім талентам, а мастакоўскім прадбачаннем, планаваннем (па-сучаснаму – іміджмейкерствам).

Ён – першы, хоць да яго, народжанага 210 гадоў таму – у чэрвені 1799-а, былі С.Полацкі, Ламаносаў, Кантэмір, Хераскаў, Сумарокаў, Дзяржавін, Бацюшкаў, Жукоўскі... Але – ён, бо першым з'яднаў у гармоніі інь і янь літаратуры, яе змест і форму, сілабіку чытацкага чакання з тонікай дзяржаўнага жадання.

А – да ўсяго – патрапіў на ўрадлівы і дабрадатны (выйгрышны) літаратурны фон: побач з такім, як Баратынскі. Апошні (не з меншым талентам) пісаў раманы ў вершах, доўгія паэмы, варочаў земляныя глыбы – і застаўся апошнім. А Пушкін браўся за кідкае, запамінальнае, эфектнае, знакавае – як зрываў рамонкі й дарыў іх у гербарыі паненкам і царадворцам.

І – экзатычнае паходжанне, што адрэналініла пачуцці прыхільнікаў.

І – паэтычны лёс, кананічны лёс песняра: ганенні, раманы-закаханасці, дуэлі, ранняя смерць...

***

Мала хто бачыць тое, што і сёння ўзвышае Пушкінскую легенду. Гэта – трагізм жыццёвага фіналу. Не, не люта – як вучылі нас у школах – знішчанага на дуэлі таленту... Пушкін перажыў душэўнае пекла, і стаў каштоўны сваім саспелым ачышчэннем, якое б магло выліцца ў новыя тэксты. Аднак...

У свае 37 ён ужо і насыціўся, і прытаміўся. На рукапісе верша 1834 года «Пора, мой друг, пора!..» ён пакінуў наступныя спавядальныя радкі: *«Юность не имеет нужды в доме, зрелый возврасt ужасается своего уединения. Блажен, кто находит подругу – тогда удались он домой».* Ці зведаў сямейнае шчасце сам Пушкін? Жонка, Наталля Мікалаеўна, спакутавалася ад неперапыннай рэўнасці. А вясной 1834 года, калі пасля балу ледзь не памерла (быў выкідыш), па сталіцы пайшлі чуткі, што тое – ад мужавых пабояў...

Урэшце, донжуаністы муж мусіў і сам перажыць рэўнасць. Праз што і сыйшоў у магілу. У 1835-м разгараецца раман паміж Жоржам Дантэсам і Наталляй Пушкіной. Пасля іх сустрэчы ў доме Вяземскай Пушкін і атрымлівае ананімны пасквіль аб тым.

Дантэс – «незаконнанароджаны сын» галандскага дыпламата Геккерта, апошняму Пушкін і напісаў гнеўны ліст (які, зрэшты, так і не адаслаў): ***«Вы, представитель коронованной особы, вы отечески сводничали вашему незаконнорожденному... сыну... Вы подстерегали мою жену по углам, чтобы говорить о вашем сыне, а когда, заболев сифилисом, он должен был сидеть дома из-за лекарств, вы говорили, бесчестный вы человек, что он умирает от любви к ней...».*** Пушкін памыліўся толькі ў адным: не Геккерт кіраваў Дантэсам, а Дантэс прасіў тога аб дапамозе.

Пушкін пасылае выклік на дуэль. Дуэлі забароненыя, і ўдзел у ёй «отпрыска» дыпламата стаў бы закатам кар'еры. Геккерт кідаецца да прыдворца Жукоўскага, нястомнага апекуна Пушкіна. Расказвае аб тым, што сын насамрэч закаханы ў сястру паэтавай жонкі Екацярыну Мікалаеўну, што ён гатовы пажаніцца аб вясельных змовінах, калі Пушкін адумаецца.

Ні сябры, ні Жукоўскі не разумеюць шаленства Пушкіна, а той не можа патлумачыць: каб не зганьбаваць жонку і сябе. Лёс падрыхтаваў перад ім сямейна-маральны тупік: як жыць са шваграм, які не спыняе залётаў да жонкі?

Дуэль была найпрасцейшым і бяспройгрышным фіналам. Прынамсі, у паэтычнай гісторыі...

*P.S.*

Пушкін – гэта ўся краіна расійскай паэзіі, як выказаўся Бродскі. А гарады ў ёй – Вяземскі, Баратынскі, Жукоўскі, Фет, Цютчаў, Блок і г.д.

Да геніяльнага пісьменніка застаецца ўдзячнасць не толькі за напісанае, але і за тое, што ён нідзе не вывеў беларусаў як самае беднае племя разбойнікаў-папрашаек... Зрэшты, ці не ён першым у літаратуры і назваў нашае не ліцьвінскім ці заходнерасійскім, а беларускім – у тых жа сваіх дзённіках: *«...сын кормилицы Екатерины II ... некогда рассказал следующее. – Мать его жила в* ***белорусской*** *деревне, пожалованной ей государыней».*

Беларускія паселішчы ў пушкінскія часы не заваёўвалі – як чаркескія, асяцінскія, грузінскія, чачэнскія – іх, ужо забраныя, проста дарылі – разам з памяркоўным насельніцтвам...

ПАЛІЦА

# АГЛЯД НОВЫХ ВЫДАННЯЎ, ПРАПАНАВАНЫ РЭДАКЦЫЯЙ ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКАГА ЧАСОПІСА "ДЗЕЯСЛОЎ"

**Шапран С. Васіль Быкаў. Гісторыя жыцця ў дакументах, публікацыях, успамінах, лістах. – Мінск – Гародня, 2009. – 734 с.: іл. (Т.1-2). – Наклад не пазначаны.**




Даследаванне Сяргея Шапрана пра Васіля Быкава – творчы жыццяпіс народнага пісьменніка. Своеасаблівы дакументальны летапіс, складзены паводле ўсіх архіўных крыніцаў, занатаваны неабыякавым почыркам пільнага даследчыка. Сярод суаўтараў С.Шапрана – сотні сведкаў, сярод якіх імёны А.Адамовіча, Ч.Айтматава, В. Аскоцкага, В.Астаф'ева, Р.Барадуліна, Л.Лазарава, В.Някрасава, А.Твардоўскага, іншых беларускіх, расійскіх і сусветнавядомых творцаў. Па словах Рыгора Барадуліна, «можна смела назваць подзвігам працу Сяргея Шапрана ў справе збору матэрыялаў, аналізу творчасці Васіля Быкава. Гэта кніга фактычна — энцыклапедыя творчасці Васіля Быкава».

Завяршае двухтомнік прыпавесць Уладзіміра Някляева «Чмель і вандроўнік», прысвечаная Васілю Быкаву.

А яшчэ кніга, выдадзеная ў серыі «Бібліятэкі Бацькаўшчыны» — «Людзі Беларусі», – сведчанне таго, што маглі б зрабіць за гэты час калектывы дзяржлітаратуразнаўцаў. І – не робяць.

**Здзіслаў Сіцька. Утроп Літвы. – Баранавічы: Баранавіцкая гарадская арганізацыя ГА "ТБМ імя Ф.Скарыны", 2008. – 324 с.: іл. – Наклад 290 ас.**




Утроп – то бок услед, следам – старажытнай Літвы запрашае чытача прайсці аўтар даследавання. Кніга, прысвечаная светлай памяці Міколы Ермаловіча, распавядае пра нашую гісторыю ад першых курганоў да "зыходу" Літвы, пра Ваўкавыск, Гародню і Пінск, пра Навагарадскае княства, пра Рагвалодаў род, пра Мяндоўга і Войшалка, расказвае пра хаўтурныя абрады і жаночыя ўборы, прылады тагачаснай працы і зброю, каранацыю і геапалітыку, літоўскія летапісы і выдумкі.

Ліцьвінскі этнас годна працягвае пладзіцца ў беларускіх кнігах, і не спыніць яго, і не стрымаць.

**Пясецкі Сяргей. Каханак Вялікай Мядзведзіцы: Раман. Перакл. З польск. Ф.Янушкевіча. – Мінск: Выдавец Віктар Хурсік, 2009. – 352 с. Наклад 300 ас.**




Адзін з найбольш вядомых твораў народжанага ў Беларусі аўтара ўпершыню быў апублікаваны па-польску ў крывавы 1937 год – і быў вылучаны на Нобелеўскую прэмію. Беларускамоўнаму перакладу – чвэрць стагоддзя. Гэта і кантрабандысцкі дэтэктыў, і летапіс колішняга памежнага Ракава. Над радкамі – лёсы "парэзанага краю" і ягоных жыхароў, памкненні, задумы, страты, боль і радасці. І каханкі лёсу ды "воўчыя сцежкі", пратаптаныя ахоўнікамі бальшавіцкіх парадкаў.

**Мрожак Славамір. Дом на мяжы: Выбраныя творы / Уклад. У.Сіўчыкаў. – Мінск: "Радыёла-плюс"; Вроцлаў: Калегіюм Усходняй Еўропы імя Яна Новака-Езёраньскага, 2008. – 216 с. – Наклад 1000 ас.**




Кніга знакамітага польскага драматурга, яскравага прадстаўніка тэатра абсурду знаёміць беларускамоўнага чытача з яго лепшымі п'есамі ("Стрыптыз", "Танга", "Дом на мяжы") і апавяданнямі ("Леў", "Лебедзь", "Слон", "Апошні гусар", "У дарозе" і інш.). Захапляльны стыль, мелодыка думак і правакацый, дзе цесна не словам, а пачуццям. А да ўсяго – трыо выдатных перакладчыкаў: Лявон Баршчэўскі, Вячаслаў Ракіцкі і Марына Шода.

Кніга з "замежжа", але такая блізкая і родная, нібыта са свайго дому.

**Барадулін Рыгор. Выпаў грук у грома з рук: Лапатушкі, цвялілкі, бубнілкі, пацешкі – Мінск: "Радыёла-плюс", 2009. – 190 с.: іл. – 3500 ас.**




У чароўным паэтычным свеце Рыгора Барадуліна сонечна і гарэзліва, займальна і пазнавальна, летуценна і радасна – і ад узнёсласці, і ад гукапісання, і ад фантазіі, і ад звонкасці рыфмаў. І не толькі ад беларускіх: кніга для дзяцей складзена і з аўтарскіх перакладаў з літоўскай, латышскай, эстонскай, польскай, малдоўскай, грузінскай, армянскай, азербайджанскай, казахскай і таджыцкай моў.

Словам, годная анталогія дзіцячай паэзіі.

**Вольскі Артур. Выйшаў зайчык пагуляць:Вершы, загадкі. – Мінск: "Радыёла-плюс", 2009. – 190 с.: іл. – 3500 ас.**




Найлепшае за доўгія гады выбранае дзіцячага паэта, у якім не цесна і дажджу і сонцу, і жуку і вавёрцы, і пчале і зязюлі. Урэшце – і нашай Пагоні:

*У Пагоні*
*скачуць коні*
*У світальны час.*
*Гэта едзе*
*ў зянні-звоне*
*Сонейка да нас.*

Кніга змяшчае таксама і лепшыя пераклады паэта, а таксама можа стаць і вясёлай размалёўкай, калі да чорна-белых ілюстрацый далучаць летуценныя чытацкія алоўкі.

**Друкапісы. Вялікая імправізацыя: паэзія, проза. – Мінск: "Галіяфы", 2009. – 216 с. – 300 ас.**




Ці быў на Беларусі 90-х гадоў мінулага стагоддзя "ранні літаратурны авангард" – распавядае сваімі тэкстамі кніга. Як і праз каго – іншая рэч. Ці выказалі ўсё пра тое дзевяць аўтараў пад адной вокладкай – адказваць чытачу, які мае гонар вычытваць "друкапісы" наноў – з рукапісных і рукамалявальных старонак "першай авангардовай перыёдыкі беларускай літаратуры".

Бум-бам-літ, ды й толькі.

**Вайцяшонак Марыя. Серпень. Мінск: Логвінаў", 2009. – 96 с. – Наклад 300 ас. (Кнігарня "Наша ніва".)**




Найбольш арганічная кніга паэзіі года. Арганічная зместам, задумай, пафасам, настроем, гукапісам: бо напісаная за адзін руплівы месяц серпень – у адным месцы, у адзін час. Маланкі, гром, ранішнія песні, лясныя травы і вясковыя мужчыны, салавей у садзе, фіранка на вакне, стук яблыка аб зямлю і дарагія ўспаміны. Успаміны колішняга празаіка, спакушанага жыццёвай паэзіяй.

**Лёлік Ушкін. Левым вокам: Фэльетоны, гумарэскі, карыкатуры. – Вільня: Інстытут беларусістыкі, 2008. – 146 с. – Наклад 300 ас. (Кнігарня "Наша ніва".)**




Кніжны пачын "піянера беларускага анархісцкага руху", сатырыка і карыкатурыста стаў уадначас і мініанталогіяй "нашаніўскага" гумару. Нават мацней, чым гумару: пароды, карыкатуры. Яна можа стаць "смешнай" гісторыяй сучаснай Беларусі і яе блізкага замежжа. Таленавіта праілюстраванай і занатаванай – хоць і левым, але глыбокім вокам.

**Цвірка В. У. Кароткая граматыка шведскай мовы. – Мінск: "Радыёла-плюс", 2009. — 88 с. — Наклад 1000 ас. (Серыя "Беларускія ЕўраГраматыкі").**




Беларусь і Швецыя маюць даўнюю гісторыю ўзаемадачыненняў. У нашай краіне існуе нязменная цікавасць да шведскай культуры, а таксама да шведскай мовы, якая належыць да ўсходнескандынаўскай падгрупы сучасных германскіх моваў.

Той, хто цікавіцца шведскай мовай і хоча авалодаць ёю, патрапіць у свет шведскага алфавіту і гукаў, марфалогіі і сінтаксісу, а таксама шведскіх фразеалагізмаў...

Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА. Тэлефон для даведак: (8-017) 280-17-91. Мінск-25, а/с 91.
Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by

## 3 ліпеня, пятніца

**06.35** Першы канал віншуе Беларусь! "Ад Масквы да Брэста..." Канцэртная праграма.
**07.55** "Добрай раніцы, Беларусь!".
**09.00, 15.00, 18.00** Навіны.
**09.10, 11.25** "Беларусь. Гісторыя Перамогі".
**09.15** Прэм'ера. "Васіль Корж. Урокі жыцця". Дакументальны фільм ("Белвідэацэнтр").
**09.50** Франтавая кінааповесць "На вайне як на вайне" (СССР).
**11.30** Ваенны парад і спартыўна-моладзевае шэсце, прысвечаныя Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дню Рэспублікі). Прамая трансляцыя.
**13.10** Першы канал віншуе Беларусь! "Музыка для ўсіх". Канцэртная праграма.
**14.05** Прэм'ера. Мастацка-публіцыстычны цыкл "Аперацыя "Баграціён". Хроніка Перамогі". Фільмы 1-ы і 2-і.
**15.20** Першы канал віншуе Беларусь! Прэм'ера. "Анжаліка Агурбаш: Кахаю? Кахаю! Кахаю..." Відэафільм АТН.
**16.20** Першы канал віншуе Беларусь! Прэм'ера. Відэафільм АТН "Рэтраспекцыя" цыклу "Зямля беларуская".
**16.50** Відэафільм АТН "Архетыпы" цыклу "Зямля беларуская".
**17.15** Першы канал віншуе Беларусь! Прэм'ера. Ваенная драма "Дняпроўская мяжа" ("Беларусьфільм").
**20.00** Панарама.
**21.00** Першы канал віншуе Беларусь! Гала-канцэрт "Мы перамаглі!" ля абеліска "Мінск - горад-герой". Прамая трансляцыя.

**07.00** АНТ прадстаўляе: "Наша раніца".
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** "Песні Перамогі". "Сіняя хустачка".
**09.40** АНТ прадстаўляе: "Толькі для Вас...". Канцэрт.
**11.30** Ваенны парад і спартыўна-моладзевае шэсце, прысвечанае Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дню Рэспублікі). Прамая трансляцыя.
**13.10** АНТ прадстаўляе: "Свае". Дакументальны фільм.
**13.50** "Кінаметры вайны".
**14.20** "Чаклун і Румба". Мастацкі фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Ваенная драма "У чэрвені 41-га".
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Працяг фільма "У чэрвені 41-га".
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** АНТ прадстаўляе: "Песня мая". Канцэрт беларускага дзяржаўнага ансамбля "Песняры".
**22.55** Нашы навіны.
**23.15** Працяг канцэрту беларускага дзяржаўнага ансамбля "Песняры" "Песня мая".
**23.50** Фільм "Глыбокая плынь" да 01.35.

**06.00** Сямейнае кіно "Міколка-паравоз". СССР, 1956 г.
**07.30** "24 гадзіны".
**07.40** "Паўсталы з попелу". Хранікальна-публіцыстычны фільм.
**08.30** "Мы перамаглі!". Тэлемарафон, прысвечаны 65-годдзю вызвалення Беларусі.
**09.00** Фільм "Альпійская балада". СССР, 1965 г.
**10.30** "24 гадзіны".
**10.40** "Мінск і мінчане". Дакументальны фільм.
**11.15** "Мы перамаглі!". Тэлемарафон, прысвечаны 65-годдзю вызвалення Беларусі.
**11.30** Ваенны парад і спартыўна-моладзевае шэсце, прысвечаныя Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дню Рэспублікі). Прамая трансляцыя.
**13.10** "Мы перамаглі!". Тэлемарафон, прысвечаны 65-годдзю вызвалення Беларусі.
**13.30** "24 гадзіны".
**13.50** "Прарыў". Дакументальны фільм.
**14.10** Фільм "Гадзіны спыніліся апоўначы". СССР, 1958 г.
**16.00** "Мы перамаглі!". Тэлемарафон, прысвечаны 65-годдзю вызвалення Беларусі.
**16.30** "24 гадзіны".
**16.50** "Гісторыя аднаго фотаздымка". Дакументальны фільм.
**17.15** "Мы перамаглі!". Тэлемарафон, прысвечаны 65-годдзю вызвалення Беларусі.
**17.40** Фільм "Вайна пад дахамі". СССР, 1967 г.
**19.30** "24 гадзіны".
**20.30** СТБ прадстаўляе: канцэрт "Памяць сэрца", прысвечаны 65-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.
**22.30** "24 гадзіны".
**23.10** "Мы перамаглі!". Тэлемарафон, прысвечаны 65-годдзю вызвалення Беларусі.
**23.40** Фільм "Шчыт Айчыны". Беларусь, 2007 г.

**07.55** ЛАДная раніца.
**08.55** Дзіцячы прыгодніцкі фільм "Дзеці партызана" ("Беларусьфільм").
**10.15** Прэм'ера. Дак. фільм "Сэрца Перамогі" ("Белвідэацэнтр").
**10.45** "І зноў рану сэрца кранаючы..." Маналогі аб вайне.
**10.55** Прэм'ера. Дак. фільм "Чытаючы лісты з той вайны" ("Белвідэацэнтр").
**11.30** Ваенны парад і спартыўна-моладзевае шэсце, прысвечаныя Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дню Рэспублікі). Прамая трансляцыя.
**13.10** Канцэртная праграма.
**14.00** "Запал па культуры". Ток-шоў.
**14.45** Хранікальна-дакументальны фільм "Дзівертысмент Перамогі" (Беларускае тэлебачанне).
**15.10** Ваенная драма "Яго батальён" ("Беларусьфільм"). 1-я і 2-я серыі.
**17.30** Франтавая кінааповесць "Хроніка бамбавіка, што пікуе" (СССР).
**18.50** Экспедыцыя.
**18.55** "І зноў рану сэрца кранаючы..." Маналогі аб вайне.
**19.05** Канцэрт ансамбля народнай песні "Бяседа".




**20.05** Ваенны дэтэктыў "У жніўні 44-га..." ("Беларусьфільм" - Расія).
**22.15** "Цудоўная сямёрка". Канцэртная праграма.

### РОССИЯ

**007.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.20** Тэлесерыял «Карміліта».
**11.00** Весткі.
**11.30** Тэлесерыял "1941". 2009 г.
**12.25** Тэлефільм "ТАСС упаўнаважаны заявіць..." 5-я серыя.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** Тэлесерыял «Трое супраць усіх-2».
**15.15** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**15.50** "Інакенцій Смактуноўскі супраць князя Мышкіна". Дакументальны фільм.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** "Кулагін і партнёры".
**17.55** "Трымай мяне мацней". Тэлесерыял.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00**. Весткі.
**19.30** Тэлесерыял «Карміліта».
**21.20** "Юрмала". Міжнародны фэст гумарыстычных праграм.
**23.10** Навіны - Беларусь.
**23.20** Фільм "Вячэрні варыянт".
**01.00** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**06.00** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал "Сёння раніцай".
**09.05** "Масква-Ялта-транзіт".
**10.00** Сёння.
**10.25** Вострасюжэтны прыгодніцкі серыял "Афіцэры".
**13.00** Сёння.
**13.30** Вострасюжэтны прыгодніцкі серыял "Афіцэры" (працяг).
**16.00** Сёння.
**16.30** Вострасюжэтны прыгодніцкі серыял "Афіцэры" (працяг).
**18.30** "Агляд. Надзвычайнае здарэнне".
**19.00** Сёння.
**19.35** Прэм'ера. Вострасюжэтны серыял "Горад спакус".
**21.35** Драма "Жывы і памятай".
**23.35** Вострасюжэтны фільм "Галоўны калібр".
**01.20** Тэніс. Уімблдонскі турнір. Паўфінал. Мужчыны.

### EUROSPORT

**09.30** Веласпорт. "Планета Армстронг". Часопіс.
**10.00** Плаванне. Міжземнаморскія гульні. Пескара (Італія). Дзень 5.
**11.00** Веласпорт. Велагонка Крытэрыум Ліберэ Дафінэ. Францыя. Этап 7.
**12.30** Веласпорт. Велагонка Крытэрыум Ліберэ Дафінэ. Францыя. Этап 8.
**13.30** Веласпорт. "Планета Армстронг". Часопіс.
**14.00** Снукер. Сусветная серыя. Ірландыя. Дзень 2.
**16.00** Конны спорт. Concours Hippique International Officiel. Канкур. Аахен (Германія).
**17.45** Веласпорт. "Планета Армстронг". Часопіс.
**18.15** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд (Вялікабрытанія). Фінал.
**21.00** Самыя моцныя людзі планеты. Ліга чэмпіёнаў. Славенія.
**22.00** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**23.00** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Францыя. Прэзентацыя каманд.
**00.30** Самыя моцныя людзі планеты. Ліга чэмпіёнаў. Сербія.
**01.30** Веласпорт. "Планета Армстронг". Часопіс.
**02.00** Армрэстлінг. PAL/NAL.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.05** «Ранча», серыял.
**18.55** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс каналу "Нямецкая хваля").
**19.25** Форум (ток-шоу): Каму служыць беларускі чыноўнік.
**20.15** «400-годдзе князя Канстанціна Астрожскага», 2008 г., Польшча.
**20.40** Госць «Белсату».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Міндоўг» (спазнавáўчая праграма).
**21.30** «Happy New York», маст. фільм, 1997 г., Польшча.
**23.10** Жаўтуха (сатырычная праграма).
**23.40** Аб'ектыў.

## 4 ліпеня, субота

**06.35** Моладзевы серыял "Сэрца акіяну" (Францыя).
**07.00** Брытва Окама.
**07.30** Існасць.
**07.55** "Добрай раніцы, Беларусь!".
**08.45** Гатуем разам.
**09.00, 12.00, 15.00, 18.00** Навіны.
**09.05** Здароўе.
**09.40** Ранішняя хваля.
**10.15, 12.10** "Беларусь. Гісторыя Перамогі".
**10.25** Хранікальна-дакументальны відэафільм "На "Лініі Сталіна" цыклу "У інтарэсах нацыянальнай бяспекі" (Беларускае тэлебачанне).
**11.00** Мастацка-публіцыстычны цыкл "Аперацыя "Баграціён". Хроніка Перамогі". Фільмы 3-і і 4-ы.
**12.20** Камедыя "Максім Перапеліца" (СССР).
**14.05** Дакументальны цыкл "Мая праўда". Фільм "Леанід Быкаў. Прышэлец" (Украіна).
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.40** Вакол планеты.
**16.20** Відэафільм АТН.
**16.50** "Музыка для ўсіх". Канцэртная праграма.
**17.45** Відэафільм АТН "Навагрудак: ля вытокаў дзяржаўнасці" цыклу "Зямля беларуская".
**18.20** "Ваша лато".
**19.10** Латарэя "Пяцёрачка".
**19.20** Прэм'ера. Меладрама "Арфа для каханай" (Украіна).
**21.00** Панарама.
**21.45** Фільм тыдня. Прэмія "Оскар". Вострасюжэтны фільм "Касабланка" (ЗША).
**23.35** Уласнай персонай.

**07.00** АНТ прадстаўляе: "Суботняя раніца".
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** "Шчаслівыя разам". Камедыйны серыял.
**09.35** "Здароўе".
**10.20** "Смак".
**11.00** Фільм "Старэйшая сястра".
**13.15** "Вялікая розніца".
**14.15** "Кінаметры вайны".
**14.45** "Дачка камандзіра". Мастацкі фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Вялікая палітыка.
**16.50** Тэорыя неверагоднасці.
**17.25** Праект "Агульная справа".
**18.45** "Асабістае жыццё доктара Селіванавай". Шматсерыйны фільм.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. Драма "Жыццё ў ружовым колеры".




**23.40** Фільм "Ціскі" да **02.00**.

**06.35** Фільм "Прыдатны да нестраявой". СССР, 1968 г.
**07.50** "Новыя падарожжы дылетанта".
**08.20** Фільм "Сыны сыходзяць у бой". СССР, 1969 г.
**10.00** "Я - вандроўца".
**10.25** "Крокі да поспеху".
**11.20** СТБ прадстаўляе: канцэрт "Памяць сэрца", прысвечаны 65-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.
**13.10** Фільм "Чорны замак Альшанскі". СССР, 1983 г.
**15.30** "Ваенная таямніца".
**16.20** "Наша справа".
**16.30** "24 гадзіны".
**16.40** "Відзьмо-невідзьмо". Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**17.20** "Рэпарцёрскія гісторыі".
**17.50** Лірычная камедыя "Белыя росы". СССР, 1983 г.
**19.30** "24 гадзіны".
**20.00** "СТБ-спорт".
**20.10** Фільм "Снайпер. Зброя адплаты". Беларусь-Расія, 2009 г.
**22.15** Фільм "Пакуль мы жывыя". Беларусь, 2008 г.
**00.05** Фільм "Паміж жыццём і смерцю". Беларусь, 2003 г.

**07.30** Прыгодніцкі серыял "Тры талеры" (Белтэлерадыёкампанія-"Беларусьфільм"). 1-я і 2-я серыі.
**09.20** Таемны густ.
**09.50** Школа рамонту.
**10.45** "І зноў рану сэрца кранаючы..." Маналогі аб вайне.
**10.55** Невытлумачальна, але факт.
**11.55** "Лабірынты: Чарэя Оскара Мілаша".
**12.20** Хранікальна-дакументальны фільм "Андрэй Бембель: смерць, перамога, слава" (Беларускае тэлебачанне).
**12.50** Ваенны кінараман "Жывыя і мёртвыя" (СССР). 1-я і 2-я серыі.
**16.15** Фільм "Павозка" (СССР). 1-я і 2-я серыі.
**18.50** Футбол. Чэмпіянат Беларусі. БАТЭ - Тарпеда. Прамая трансляцыя.
**21.00** Жаночая ліга.
**21.30** Прэм'ера. Музычны фільм "Мяне тут няма" (ЗША- Германія).

### РОССИЯ

**07.00** Весткі.
**07.15** "За сям'ю пячаткамі".
**07.50** Мультфільмы.
**08.00** "Падарожжы музыкі".
**08.30** "Суботнік".
**09.10** "Ранішняя пошта".
**09.40** Фільм "Доўгі дзень".
**11.00** Весткі.
**11.15** Пакой смеху.
**12.15** Фільм "Шклянка вады". 1-я серыя.
**13.30** "Спецыяльны карэспандэнт".
**14.00** Весткі.
**14.20** Тэлесерыял "Каменская".
**15.20** "Вялікая таямніца вады". Дакументальны фільм.
**17.00** Фільм "Сяброўка мая".
**18.30** "Смехапанарама Яўгенія Петрасяна".
**19.00** Весткі ў суботу.
**19.40** "Суботні вечар".
**21.35** Фільм "Калі бракуе кахання". 2008 г.
**23.20** Баявік "30-га знішчыць".

### НТВ

**07.35** "Казкі Бажэнава".
**08.00** Сёння.
**08.20** "Рускія не здаюцца!".
**09.00** "Агляд".
**09.30** "Без рэцэпту".
**10.00** Сёння.
**10.25** "Галоўная дарога".
**10.55** "Кулінарны паядынак".
**11.55** "Кватэрнае пытанне".
**13.00** Сёння.
**13.25** "Асоба небяспечны!".
**14.00** "Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне".
**14.15** Ваенная драма "Радзіма або смерць".
**16.00** Сёння.
**16.25** "Жаночы погляд".
**17.00** Дэтэктыўны серыял "Закон і парадак. Аддзел аператыўных расследаванняў".
**18.40** "Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне".
**19.00** Сёння.
**19.25** "Прафесія-рэпарцёр".
**19.55** "Праграма Максімум. Скандалы. Інтрыгі. Расследаванні".
**21.00** "Рускія сенсацыі".
**21.50** "Ты не паверыш!".
**22.50** Крымінальная драма "Дамавік".
**00.45** Тэніс. Уімблдонскі турнір. Фінал. Жанчыны.

### EUROSPORT

**09.30** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг. Часопіс.
**10.00** Ралі. Чэмпіянат свету. Польшча. Агляд.
**11.00** Конны спорт. Concours Hippique International Officiel. Канкур. Аахен (Германія).
**12.00** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Францыя. Прэзентацыя каманд.
**13.30** Веласпорт. "Планета Армстронг". Часопіс.
**14.00** Снукер. Сусветная серыя. Ірландыя. Дзень 2.
**15.30** Аўтаспорт. Сусветная серыя Рэно. Сільверстоун (Вялікабрытанія). Гонка 1.
**16.30** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Манака. Этап 1.
**20.45** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд (Вялікабрытанія). Фінал.
**23.00** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Манака. Этап 1. Агляд.
**00.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.05** «Савецкая гісторыя», дак. фільм, 2008 г., Вялікабрытанія.
**19.35** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу "Нямецкая хваля").
**20.00** YoLife! (моладзевая праграма).
**20.20** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Кнопка», дак. фільм, 1994 г., Польшча.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.15** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Курганы» (спазнавáўчая праграма).
**21.20** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу "Нямецкая хваля").
**21:50** Чалавек-эпоха: «Маці знядоленых», дак. фільм, 2005 г., Італія.
**22.50** «Апошні сезон», серыял.
**23.40** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма).
**2350** Аб'ектыў.

ЦІКАВА

# НА АБАРДАЖ ЕЎРАПЕЙСКАЙ ПАЛІТЫКІ!

Алег Пятроў

**Сапраўдны фурор ва ўсім свеце, асабліва сярод маладых карыстальнікаў інтэрнэту, выклікаў поспех шведскай Партыі піратаў на выбарах у Еўрапарламент.**



За прыкладамі далёка хадзіць не трэба. 22 чэрвеня Йорг Таус, дэпутат Бундэстагу ад Сацыял-дэмакратычнай партыі Германіі, дэманстратыўна паклаў партбілет на стол. Ён вырашыў выйсці са складу сацыял-дэмакратаў, каб далучыцца да нямецкай Партыі піратаў. Па словах Йорга, ён не можа больш знаходзіцца там, дзе яго не разумеюць. У доказ прыхільнасці ідэям піратаў дэпутат нават сфатаграфаваўся на фоне сцяга з выявай Вясёлага Роджэра — сімвала партыі піратаў.

Усё пачалося ў 2005 годзе, калі шведскі праграміст Рыхард Фальквінг вырашыў заснаваць Партыю піратаў. Галоўны пункт партыйнай платформы — змены ў закон пра аўтарскія правы. Размова ішла пра закон, які быў уведзены ў Швецыі ў 2005 годзе. Сутнасць яго заключалася ў тым, што наяўнасць у кампутары кантрафактнай прадукцыі цягнула за сабой крымінальную адказнасць. "Піраты" выступалі за права скачваць любую інфармацыю з павуціння, карыстацца ёй і вольна капіраваць.

Другое патрабаванне Партыі піратаў — права на прыватнасць. Пасля падзей 11 верасня 2001 года спецслужбы атрымалі карт-бланш на нагляд за асабістым жыццём грамадзян на падставе таго, што ўсе людзі — патэнцыйныя тэрарысты. На думку піратаў, нагляд не павінны мець татальны характар.

Ніякай грамадскай рэакцыі навіна пра з'яўленне на палітычным полі "піратаў" не мела. У тым ліку таму, што прыблізна ў той жа час дэпутаты прадстаўленых у парламенце партый левых і лібералаў патрабавалі лібералізаваць заканадаўства аб праве капіраваць інфармацыю з інтэрнэту.

У пачатку 2006 года "піраты" ўпершыню паспрабавалі свае сілы на выбарах у нацыянальны парламент. Іх дасягненні былі больш чым сціплыя. За іх галасавалі ўсяго 0,6 працэнта выбаршчыкаў, што прынесла толькі дзесятае месца сярод 40 партый, якія балатаваліся ў галоўны заканадаўчы орган Швецыі.

Аднак, з іншага боку, такая лічба прымушала заснавальнікаў партыі застацца ў палітыцы. Па шведскіх законах, калі партыя атрымлівае хаця б адзін працэнт галасоў, яна можа разлічваць на фінансавую падтрымку дзяржавы.

Усё, па сутнасці, пачалося 31 мая 2006 года, калі паліцыя правяла рэйд супраць уладальнікаў хостынгу *The Pirate Bay*, сярод якіх было шмат сяброў Партыі піратаў. На сайце *The Pirate Bay* выкладаліся скрадзеныя з сеціва матэрыялы. Арышт выклікаў вялікія пратэсты сярод простых юзераў — масавую падачу заяў на сяброўства ў Партыі піратаў.

У выніку літаральна за адзін тыдзень колькасць сяброў партыі вырасла з 500 чалавек да 2500. 3 чэрвеня 2006 года "піраты" арганізавалі ў цэнтры Стакгольма дэманстрацыю ў абарону арыштаваных па справе *The Pirate Bay*. Моладзевыя секцыі прадстаўленых у парламенце партый лібералаў, зялёных і левых падтрымалі акцыю. Дзякуючы гэтаму яна трапіла ў фокус нацыянальных, а пазней і міжнародных СМІ.

На наступны дзень сайт "піратаў" наведалі больш за мільён чалавек. 500 (!) англамоўных радыё-станцый перадалі ў эфір інфармацыю пра партыю і распавялі пра яе праграму. Парадаксальна, што самі лідэры не былі гатовыя да такога выбуху цікавасці. Старшыня партыі нават не змог лагічна растлумачыць журналістам, што завіталі да яго дахаты, чаго канкрэтна дамагаюцца "піраты".

Судовы працэс закончыўся для "піратаў" на першы погляд катастрафічна. Кожны з падсудных быў прызнаны вінаватым і мусіў заплаціць штраф агульным памерам у 900 тысяч долараў ЗША. Аднак сярод грамадзян вердыкт быў трактаваны інакш.



Рашэнне Феміды выклікала хвалю салідарнасці ў выглядзе росту колькасці заяў на ўступленне ў партыю. За сем гадзін пасля абвяшчэння судовага вердыкту партыя папоўнілася тысячамі новых сяброў (напярэдадні вердыкту іх было ўжо 15 тысяч). Хутка іх стала 42 тысячы. Такім чынам, "піраты" сталі трэцяй партыяй у краіне.

Думаецца, якраз дзякуючы гучнаму працэсу, які закончыўся напярэдадні выбараў, партыя абавязана вялікаму ўраджаю галасоў, якія былі пададзеныя за яе на выбарах у парламент ЕС.

Так ці інакш, цяпер "піраты" знаходзяцца на хвалі поспеху. Толькі за апошні тыдзень у трох краінах Еўропы ўзніклі філіялы партыі. Яшчэ ў 2007 годзе ў Вене быў створаны іх піцкі Інтэрнацыянал. Заснавальнікамі выступілі "піраты" Швецыі, ЗША, Аўстрыі, Германіі, Даніі, Польшчы, Аргенціны, Аўстраліі.



Прычым цяпер іх фундатарамі выступаюць не аматары, а салідныя людзі. Так, заснавальнікамі чэшскіх "піратаў" на мінулым тыдні сталі пяць дырэктараў фірмаў, якіх звязаны з кампутарным бізнесам. Хаця фармальным старшынёй партыі выступае Каміл Хоркі — юзер, які быў асуджаны ў красавіку за парушэнне закону ад аўтарскіх правах.

Што далей? Шмат што будзе залежыць ад галасавання ў Германіі на выбарах у Бундэстаг у верасні гэтага года. Тут за межамі Швецыі "піраты" выступаюць лепш за ўсё. У 2008-м у нямецкай зямлі Гесен "піраты" ўпершыню выставілі свой спіс на рэгіянальныя выбары. Спіс атрымаў усяго 0,3 працэнта галасоў. На выбарах у парламент ЕС у чэрвені нямецкія "піраты" мелі ўжо 0,9 працэнтаў. Калі папярэдняя дынаміка захаваецца, то ўвосень нас чакае сенсацыя.

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Лукашэнка вядомы сваёй тактыкай шантажу. Калі Аляксей Кудрын паставіў пад пытанне здольнасць Беларусі плаціць па пазыках, Лукашэнка нанёс удар у адказ: байкатаваў апошнюю сустрэчу АДКБ. Як толькі АДКБ перастала існаваць як сімвал лаяльнасці Расіі і пачала вырашаць канкрэтныя задачы, стала відавочна, наколькі мала гэта арганізацыя адпавядае рэальным інтарэсам яе сяброў.

**"ХПрэса" (Расія)**

Беларускае малако расіяне здолелі ўсё роўна набываць, паколькі Лукашэнка пайшоў ва-банк. Даў зразумець, што можа пакінуць АДКБ. А гэта азначае для Масквы тое, што беларускія супрацьпаветраныя сілы не будуць прыкрываць яе з захаду. Адсюль каласальныя выдаткі на стварэнне новай сістэмы супрацьпаветранай абароны. У выніку крамлёўскія мядзведзі засталіся пры сваім, а Лукашэнка ўзмацніў пазіцыі як сярод беларусаў, так і ў Еўрасаюзе.

**"Газета по-киевски" (Украіна)**

Аляксандр Лукашэнка будзе трымацца палітыкі балансавання паміж Захадам і Усходам да таго часу, пакуль гэта будзе магчыма. Менавіта ў гэтым устойлівасць яго пазіцыі. У той жа час эксперты адзначаюць, што палітыка адкрытага ціску, якую сёння выкарыстоўвае Расія ў адносінах да Беларусі, менш эфектная, чым мяккая адаптацыя да еўрапейскіх працэсаў — тактыка Еўрасаюза. У сувязі з гэтым на сучасным этапе будзе назірацца яскравы дрэйф Беларусі ў бок Захаду.

**"Независимая газета" (Расія)**

Брусель гатовы даваць крэдыты Беларусі выключна пад заклад прыватызацыі яе самых буйных заводаў. Таксама ЕС цікавяць старобінскія залежы калійнай солі. Паколькі крэдыт аддаваць не будзе чым, Беларусь рызыкуе застацца без вытворчасці і прыродных рэсурсаў. Калі параўнаць адносіны з Мінскам і Кішынёвам, не зразумела, чаму Лукашэнка не зрабіў, як Варонін, які атрымаў ад Расіі крэдыт памерам у 500 мільёнаў долараў. Здаецца, уся праблема ў амбіцыях. Можа, ужо час мінскаму Бацьку трошкі забыцца на свае амбіцыі і згадаць пра адзінства рускага і беларускага народаў?

**"Доброе утро" (Расія)**

Параўнаць Лукашэнку з Франка, які нягледзячы на падтрымку Гітлера змог пасябраваць з Захадам, было б вельмі шыкоўна, аднак прысутнічае тэхнічнае падабенства знешнепалітычных задач. Па-першае, Лукашэнка, як і Франка, трэба было давесці, што ягоны рэжым стабільны. Па-другое, трымаць дыстанцыю ад не вельмі супярэчнага саюзніка. Адпаведныя сігналы на Захад Лукашэнка зрабіў, не прызнаўшы Абхазію і Паўднёвую Асецію. Па-трэцяе, зацікавіць патэнцыйна моцнага саюзніка. Захад пачаў супрацоўніцтва з Франка таму, што баяўся прыходу да ўлады левых і пераарыентацыі краіны на СССР. У гэтым плане Лукашэнка мае лепшую сітуацыю. Ён можа прапанаваць ЕС стаць апошнім ланцужком санітарнага поясу вакол РФ. Плюс некаторы эканамічны патэнцыял, які цікавы для заходняга капіталу.

**АПН (Расія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### ГЕРМАНІЯ. АХМАДЗІНЕДЖАД – СЁННЯ ТОЙ ЖА ШАХ

Група арганізатараў і ўдзельнікаў славутай дэманстрацыі пратэсту 2 чэрвеня 1967 года супраць візіту ў Заходні Берлін іранскага шаха прыняла спецыяльную заяву. Нагадаем, што прыезд шаха, рэжым якога быў адказны за парушэнні правоў чалавека, катаванні апазіцыі, узняў усю прагрэсіўную грамадскасць. Студэнты (як правіла, левых поглядаў) выйшлі да будынка Нацыянальнай оперы, якую планаваў наведаць шах. Паліцыя і агенты сакрэтнай шахскай службы атакавалі пратэстантаў. Адзін са студэнтаў быў забіты. Тыя падзеі палітызавалі шмат моладзі. Так ці інакш, амаль праз 40 гадоў удзельнікі той дэманстрацыі ўзгадалі маладосць і палічылі патрэбным прыняць спецыяльную рэзалюцыю салідарнасці з іранцамі, якія сёння змагаюцца за дэмакратыю. Як гаворыцца ў рэзалюцыі, цяперашні рэжым у Тэгеране нічым не адрозніваецца ад шахскага. Сярод тых, хто падпісаў рэзалюцыю, такія славутыя нямецкія асобы, як Бомі Бауман (заснавальнік руху кааператываў) і Хрысціян Штробеле (дэпутат Бундэстагу ад Партыі зялёных).

**Па матэрыялах "Tageszeitung" (Германія)**

### ВЕНЕСУЭЛА. ПАСОЛ ЗША ВЯРТАЕЦЦА Ў КАРАКАС

Урад Венесуэлы афіцыйна пацвердзіў, што нармалізуе адносіны са Злучанымі Штатамі. Яны сапсаваліся пасля таго, як 11 верасня мінулага года Чавес выслаў з краіны амерыканскага пасла ў знак салідарнасці з балівійскім прэзідэнтам Эва Маралесам. Апошні заявіў, што ЗША ўмешваюцца ва ўнутраныя справы яго краіны. Вашынгтон на выхадку Чавеса адказаў той жа манетай — выставіў венесуэльскага пасла. Лічыцца, што бліжэйшымі днямі пасол ЗША зноў зможа працаваць у Венесуэле. Мяркуюць, што пацяпленне кантактаў пачалося пасля сустрэчы Барака Абамы і Уга Чавеса падчас саміта краін Арганізацыі амерыканскіх дзяржаў. Праўда, да канца не вядома, якім чынам усё будзе адбывацца. Дыпламатычны пратакол вымагае, каб лідэр краіны, якая выслала амбасадара, прынёс яму асабістыя прабачэнні. Між тым, вядома, што прызнаваць свае памылкі Чавес не любіць.

**Па матэрыялах "El Pais" (Іспанія)**

### ВЯЛІКАБРЫТАНІЯ. ТОРЫ ВЫХОДЗЯЦЬ З ІНТЭРНАЦЫЯНАЛУ ХРЫСЦІЯНСКІХ ДЭМАКРАТАЎ

Дэвід Камерун, лідэр Партыі кансерватараў, усё ж прыняў рашэнне. Насуперак крытыцы з боку былых лідэраў партыі, торы выходзяць са складу фракцыі Народнай партыі ў Еўрапарламенце, якая аб'ядноўвае дэпутатаў-сяброў правацэнтрысцкіх партый. Брытанскія кансерватары разам з польскай партыяй "Права і справядлівасць" і чэшскімі грамадзянскімі дэмакратамі вырашылі заснаваць новую фракцыю. Група будзе называцца Кансерватары-рэфармісты. Сярод галоўных задач новай фракцыі — барацьба з Лісабонскім варыянтам канстытуцыі ЕС, а таксама наогул з любымі спробамі цэнтралізацыі ЕС. Стварэнне новай групы зрабіла яшчэ больш непрадказальнымі выбары старшыні Еўракамісіі. Цяпер у сацыялістаў і зялёных у Еўрапарламенце разам больш галасоў, чым у Народнай партыі, якая паспрабуе пераабраць на гэту пасаду цяперашняга старшыню Еўрапейскай камісіі Барозу. Без галасоў еўраскептыўкаў гэта будзе цяжка.

**Па матэрыялах "Le Monde" (Францыя)**

### РАСІЯ. ГРЫЗЛОЎ СТАЎ СУПЕРГЕРОЕМ КОМІКСАЎ

Галоўнай навіной у расійскім палітычным жыцці стала з'яўленне ў сеціве коміксаў, героем якіх выступае цяперашні спікер Дзяржаўнай думы Барыс Грызлоў. Коміксы з'явіліся на сайце, які зарэгістраваны ў Канадзе. Персанаж графічнага Грызлова вельмі падобны да супергероя. Пасля заканчэння пасяджэння Дзяржддумы Грызлоў займаецца тым, што змагаецца са злачынцамі, якія арганізуюць тэракты і катастрофы. За ўсімі гэтымі злачынствамі стаіць нехта Ч.О. (Чорны алігарх). У першай серыі наш герой пасля толькі разабрацца з яго агентам у адміністрацыі Крамля. Думаецца, у наступнай ён дабярэцца і да гэтага Ч.О. Назіральнікі разышліся ў меркаваннях, хто мог зрабіць з Барыса супергероя. Адны бачаць тут нейкую іронію. Іншыя лічаць, што комікс замовіў нехта з атачэння спікера, каб зрабіць яму прыемнае.

**Па матэрыялах "Независимой газеты" (Расія)**

ПАЎСТАННЕ



# НА СЦЯЖЦЫ ВАЙНЫ ЗА ЭКАЛОГІЮ

**Раманы пра індзейцаў быццам ажываюць у Перу. Тут пачалося сапраўднае паўстанне індзейцаў. Пра яго ход і прычыны журналіст "НЧ" Алег Новікаў размаўляе з перуанскім левым актывістам Анхелем Санчасам.**

***— Перш за ўсё, калі ласка, раскажыце ў агульных словах, што адбываецца апошнім часам у Перу?***

— На пачатку красавіка з'явілася інфармацыя пра тое, што індзейцы Амазоніі пачынаюць выступленне супраць двух дэкрэтаў ураду, якія рэгулююць эксплуатацыю прыродных рэсурсаў на гэтай тэрыторыі. Пратэстам быццам кіравала арганізацыя "Унутраны саюз за развіццё перуанскіх трапічных лясоў". Такая арганізацыя сапраўды існуе і вядомая сваёй экалагічнай барацьбой. Пратэст, калі верыць крыніцам, праходзіў у форме мірных дэманстрацый. Індзейцы блакіравалі рэкі, каб не дазволіць праход караблёў кампаній, якія займаюцца здабываннем карысных выкапняў. Навіну пра паўстанне СМІ спачатку ўспрынялі пасіўна. У пачатку чэрвеня нечакана стала вядома, што паліцэйскія забілі трох удзельнікаў акцыі. Пасля гэтага падзеі пачалі развівацца вельмі дынамічна. Індзейцы выкапалі тамагаўкі і забілі 40 паліцэйскіх. Улады таксама не цырымоніліся. Салдаты забілі 20 паўстанцаў.

***— Што сабой уяўляе індзейская грамада Перу? Я маю на ўвазе рэгіён Басоа, дзе пачалося паўстанне.***

— Індзейская грамада жыве вельмі аўтаномна. Фактычна гэта дзяржава ў дзяржаве. Нягледзячы на тое, што ўсе індзейцы — грамадзяне Перу, яны вельмі пасіўна карыстаюцца сваімі грамадзянскімі правамі. Жывуць дастаткова ізалявана, мала цікавяцца палітыкай. Закон дазваляе ім мець органы самакіравання, прадстаўнікі якіх кантактуюць з адміністрацыяй губернатара, калі на гэта ёсць патрэба. Парадаксальна, але насуперак сітуацыі ў суседняй Балівіі, дзе індзейцы актыўныя ў палітычным жыцці (індзеец Эва Маралес нават стаў прэзідэнтам), нашы індзейцы быццам свядома цураюцца палітыкі.

***— Якое матэрыяльнае становішча перуанскіх індзейцаў?***

— Вельмі нізкае. Сярэдні заробак у Перу ўвогуле невялікі. Прыкладна 150 долараў ЗША. Думаю, што індзейцы зарабляюць у некалькі разоў менш. Аднак трэба адзначыць, што сэнс іх жыцця — не накапленне матэрыяльных каштоўнасцяў для сябе або сваёй сям'і. У тубыльцаў іншая этыка, іншае разуменне сэнсу жыцця. Яны не вымяраюць поспех узроўнем заробку. Лічаць сябе шчаслівымі проста так.

***— Што канкрэтна не спадабалася індзейцам у дэкрэтах пра развіццё рэсурсаў Амазоніі?***

— Яны прыняты ў рамках праекту адзінай эканамічнай зоны, якую лабіруюць ЗША. Аднак я думаю, што індзейцам не спадабалася тое, што іх праігнаравалі падчас разгляду і прыняцця дэкрэтаў. Фактычна за іх вырашылі іх лёс. Рэалізацыя любых праектаў у зоне адаб'ецца на жыцці кожнага індзейца. Мяркую, што ўлады павінны папросту растлумачыць, у чым сэнс заканадаўчых актаў.

***— Пратэсты індзейцаў прывялі да дыпламатычнага канфлікту паміж Перу і Балівіяй. Паколькі на бок Балівіі стаў яе саюзнік Уга Чавес, канфлікт выйшаў за рамкі перуанскага, перайшоў на міжнародны ўзровень. Чаму Ла-Пас умяшаўся ва ўнутраны канфлікт, прычым вельмі адкрыта і жорстка? Эва Маралес назваў тое, што адбываецца ў Перу, "генацыдам".***

— Мяркую, што Эва Маралес як першы на кантыненце прэзідэнт-індзеец лагічна лічыць, што нясе адказнасць за індзейскае пытанне. Менавіта таму ён раскрытыкаваў учынкі перуанскіх уладаў. Апошнія, натуральна, заявілі, што падобныя заявы — умяшанне ва ўнутраныя справе іншай дзяржавы. Аднак я думаю, што эскалацыі крызісу ў адносінах дзвюх дзяржаў не будзе. Перу і Балівія традыцыйна ставяцца адна да адной мірна. Яны нават былі часткамі адзінай дзяржавы. Акрамя таго, у Ліме і Ла-Пасе каля ўлады знаходзяцца левыя партыі. Хаця прэзідэнт Перу Алан Гарсіа крытычна ставіцца да балiварскага эксперыменту Чавеса.

***— Як вядома, у 1980-я гады Перу была цэнтрам партызанскіх дзеянняў левых радыкалаў. Ці засталіся тыя групоўкі і ці спрабуюць яны выкарыстаць канфлікт у сваіх мэтах?***

— Самыя вядомыя партызанскія фармацыі — Сэндэра Луменоса і Патрыятычны Рух імя Тупака Амару — былі разбітыя ў 1990-я. З тых часоў пра іх мала што чуваць. Хаця апошнім часам баевікі Сэндэра далі пра сябе ведаць. Аднак наўрад ці яны робяць стаўку на індзейцаў. Мясцовыя індзейцы, калі хацелі змагацца вайсковымі метадамі, ішлі ў Патрыятычны рух імя Тупака Амару. Гэты рух — не што іншае, як даўні аскепак кіруючай цяпер у краіне партыі Амерыканскі народны рэвалюцыйны альянс (APRA), якая прытрымліваецца сацыял-дэмакратычнай арыентацыі.

***— Якія перспектывы развіцця цяперашняга канфлікту?***

— Думаю, што ўрад паспрабуе замяць праблему. Нікому не патрэбны гвалт, тым больш прэзідэнту Алану Гарсія. На днях кангрэс адмяніў два дэкрэты, прынящце якіх фармальна і выклікала паўстанне. У сваю чаргу, індзейцы віталі такое рашэнне. Дэлегацыя прадстаўнікоў індзейскіх абшчын дамовілася, што армія і паліцыя пакінуць іх рэгіён. Акрамя таго, лідэр паўстанцаў, пасля таго, як ягоныя падначаленыя пачалі забіваць паліцыянтаў, збег на тэрыторыю пасольства Нікарагуа і папрасіў там палітычнага прытулку.

Аднак правакацый выключаць нельга. Хаця б таму, што ў ліпені адбудзецца саміт кіраўнікоў краін, якія ўваходзяць у праект ALBA (спроба Чавеса стварыць эканамічны блок краін Лацінскай Амерыкі, якія хочуць будаваць сацыялізм).

ПРАТЭСТ

# ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, БЯРЫЦЕ ПРЫКЛАД З ПІКАЛЁВА

**Цяпер слова Пікалёва на вуснах усіх расіян. Пікалёва — невялікі гарадок у Ленінградскай вобласці — прагрымеў на ўсю краіну, дзякуючы акцыі сацыяльнага пратэсту. 2 чэрвеня працоўныя мясцовага цэментнага заводу перакрылі федэральную трасу, патрабуючы выплаты зарплаты. Пробка расцягнулася на 400 кіламетраў. Каб супакоіць пікалеўскі бунт, спатрэбіўся візіт самога Пуціна. Ці з'яўляецца Пікалёва світанкам новых сацыяльных пратэстаў у Расіі? З гэтымі і іншымі пытанні карэспандэнт "НЧ" Алег Новікаў звярнуўся да Дзмітрыя Касценкі, супрацоўніка расійскага інстытута "Справядлівы свет".**






***— Пратэст у Пікалёва — самая маштабная акцыя працоўных за час крызісу — быў спантанным ці ўсё ж арганізаваным прафсаюзнымі актывістамі?***

— Здаецца, нейкі прафсаюз там дзейнічаў, аднак адметнай ролі ў гэтай гісторыі ён не адыграў. Дарэчы, прафсаюзны рух увогуле выпаў з працэсу. Усе больш-менш прыкметныя акцыі незадавальнення за час крызісу ўзнікалі спантанна. Аднак элемент арганізацыі ў Пікалёва прысутнічаў. Дэтанатарам выбуху паслужыла ананімная ўлётка з заклікам да працоўных перакрыць федэральную трасу на знак пратэсту супраць нявыплаты заробкаў. Улёткі нехта раскідаў на тэрыторыі заводу. Трыста чалавек падтрымалі заклік ананіма. Натоўп перакрыў федэральны аўтабан на ўчастку Новая Ладага — Волагда. Папросту прыйшлі і заблакавалі рух. Паколькі ў пікеце было шмат жанчын (іх паставілі ў першы шэраг) кіроўцы не рызыкнулі ісці на прарыў.

***— Як улады рэагавалі на акцыю?***

— Сітуацыя на заводзе была напружанай даўно. Запазычанасць па зарплаце складае 40 мільёнаў расійскіх рублёў. Дарэчы, завод належыць вядомаму алігарху Алегу Дзерыпаску. Яшчэ ўвесну сюды прыязджаў губернатар і абяцаў уладкаваць усіх на працу на АЭС, якая знаходзіцца па суседству. Але працоўныя адмовіліся ад такога варыянта, паколькі іх маглі папросту "кінуць" — звольніць і не аддаць доўг. Як толькі трасу перакрылі, на месца пратэсту прыехаў атрад АМАПу. Аднак калі праваахоўнікі пабачылі жанчын у пікеце, атакаваць пратэстуючых адмовіліся. Зноў з'явіўся губернатар. Але працоўныя размаўляць з ім адмовіліся: заявілі, што будуць размаўляць толькі з Пуціным.

***— Ці не было спроб палітызаваць пратэст?***

— Удзельнікі акцыі на трасе спявалі "Інтэрнацыянал". Але кампартыя з імі працаваць не спрабавала. Апазіцыя сядзіць у Маскве. Яна не здольная аператыўна рэагаваць на такія падзеі. У гэтым іх самае слабае месца. Усё было вельмі спантанна і абмежавана мясцовай тэматыкай. Гэта дазваляе ўладам лёгка лакалізаваць канфлікт, ужыўшы прыём: "Цар — добры. Губернатары — дрэнныя". Піпл, як кажуць, хавае.

***— Аднак у любым выпадку працоўныя перамаглі. Заробкі выплачаныя. Завод пачаў працаваць. Ці не падштурхне гэты прыклад іншыя працоўныя калектывы на арганізацыю пратэстаў?***

— Такая сітуацыя, як у Пікалёва, сапраўды, характэрна для шматлікіх расійскіх гарадоў. Улады гэта разумеюць і зараз актыўна адсочваюць сітуацыю, каб не дапусціць падобных падзей. Так, пачалі вырашаць пытанне на заводзе "Расійскі вальфрам" у Прымор'і. Там ужо 5 месяцаў замест заробку даюць пакеты з гуманітарнай дапамогай. Палепшылася сітуацыя на Байкальскім цэлюлозным камбінаце, дзе 63 працаўніка абвясцілі галадоўку, патрабуючы заробкаў. Цяпер там паступова пачынаюць выплачваць зарплату. Увогуле, Мядзведзеў заявіў, што губернатары, якія не будуць кантраляваць пытанне з выплатай заробкаў, будуць звольнены.

***— Ці значыць гэта, што дзяржава будзе актыўней умешвацца ў бізнес?***

— Так. Узнікае мадэль карпаратыўнай дзяржавы а-ля Мусаліні, калі ўрад дапамагае прадпрымальніку і працоўным шукаць кампраміс. Працоўным прапануюць спыніць бунт у абмен на частковую ліквідацыю даўгоў па заробках. Грошы на кампенсацыі часткова дае дзяржава, часткова прадпрымальнік. Бізнес вымушаны падпарадкоўвацца. Дадатковы аргумент — ініцыятыва фракцыі "Адзінай Расіі" нацыяналізаваць усе праблемныя прадпрыемствы. Зараз яна разглядаецца ў Думскім камітэце. Такі закон наўрад ці прымуць, аднак бізнес-колы ён, натуральна, прымусіць быць больш лаяльнымі. Аднак, па вялікім рахунку, гэта не стратэгія барацьбы з крызісам. Ідзе папросту латанне дзірак. Хаця нельга не прызнаць, што такое "латанне" ўзняла рэйтынг Пуціна. Менавіта яму як прэм'еру трэба ехаць на месцы, каб караць нядбайных чыноўнікаў, раздаваць народу бонусы. Людзям гэта падабаецца.

***— Якое месца займае Пікалёва ў цяперашнім глабальным палітычным жыцці?***

— Вельмі важнае. Блакада трасы ў Пікалёва прыпала па часе на актывізацыю сепаратысцкага руху на Паўночным Каўказе. Мова пра замах на прэзідэнта Інгушэціі і забойства кіраўніка дагестанскага МУС. Гэта значыць, што Расія хуткімі тэмпамі губляе стабільнасць, якую набрала за восем пуцінскіх гадоў. Цэнтр не мае механізму кантролю над сітуацыяй у рэгіёнах. Кантроль абмяжоўваецца крыкамі на адрас службоўцаў сярэдняга звяна. Нервознасць яшчэ больш узрастае з-за апошніх падзей у эканоміцы. Прыкладна з пачатку сакавіка быццам пачала назірaецца нейкая стабільнасць. Перастаў падаць рубель, ажывіліся некаторыя сектары вытворчасці. Раптам сітуацыя зноў рэзка пагоршылася. На мінулым тыдні абваліўся фондавы рынак, упалі кошты на нафту. Між тым, рэсурсаў у казне ўсё менш і менш. Ніхто не ведае, як доўга дзяржава здолее трымаць рубель. Альтэрнатыва гэтаму — дэфолт або крэдыт на Захадзе, што, па расійскіх мерках, азначае нацыянальную здраду.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ



### ІЛЬХАМ АЛІЕЎ

Прэзідэнту Азербайджана, які лічыцца абсалютным гаспадаром у краіне, кінулі выклік сябры групоўкі "Лясныя браты", якія актывізавалі сваю дзейнасць на поўдні. На днях падчас спробы нелегальнага пераходу мяжы яны забілі аднаго і паранілі двух памежнікаў. Праўда, самі тэрарысты таксама былі забітыя. Групоўка "Лясныя браты" ўзнікла пасля другой чачэнскай вайны і дзейнічала галоўным чынам у зоне расійска-азербайджанскай мяжы. У 2007 годзе паліцыя арыштавала 17 "братоў" у Сумгаіце. Аднак хутка арганізацыя адрадзілася. Як кажуць эксперты, галоўным фактарам хуткага кадравага абнаўлення з'яўляецца тое, што ў групоўку прымаюць выключна вахабітаў, якія, у сваю чаргу, маюць сваю падпольную сетку. Акрамя таго, вахабіты атрымліваюць фінансавую дапамогу з Саудаўскай Аравіі. Частка грошай ідзе ў фонды "Лясных братоў". МУС Азербайджана, каментуючы апошнія падзеі, кажа, што "Лясныя браты" выконваюць заданне звонку — "дэстабілізаваць сітуацыю ў краіне і стварыць ісламскую дзяржаву". Аднак, па словах галоўнага паліцэйскага, іх спробы марныя, паколькі "Лясны браты" не маюць масавай падтрымкі насельніцтва. Тым не менш, з'яўленне "братоў" на поўдні, дзе іх ніколі не бачылі, дае падставу казаць пра пашырэнне зоны актыўнасці і павелічэнне цікавасці грамадства да радыкальных дактрын.

### АЛАН БЕРКМАН

Адзін з самых вядомых у ЗША абаронцаў правоў чалавека памер на 63-м годзе жыцця. Алан нарадзіўся ў 1945 годзе ў Нью-Йорку ў сям'і габрэяў-эмігрантаў. Яго сям'я была моцна звязаная з габрэйскім рухам (бацька займаўся кантрабандай зброі для перасяленцаў у Палесціну). Аднак сам Алан у юнацтве захапіўся вобразам Чэ Гевары, які неяк сказаў, што лепшая прафесія для рэвалюцыянера — медык. Беркман пайшоў на медфак Калумбійскага універсітэта і стаў адным з лідэраў студэнцкага руху супраць вайны ў В'етнаме. У пачатку 1970-х ён становіцца праваабаронцам і абараняе ахвяр самых славутых спраў, так ці інакш звязаных з палітыкай, — феміністак, левых тэрарыстаў, пацыфістаў. Менавіта яго група займалася справай індзейцаў, якія ў 1971 годзе ўзнялі паўстанне ў пасёлку Вундэн Дні, пратэстуючы супраць дыскрымінацыі. Сувязі з радыкаламі каштавалі яму свабоды. У 1981 годзе за кантакты з тэрарыстычнай групоўкай "Сіноптыкі" Алану далі 10 гадоў турмы. Яго вызвалілі датэрмінова. Пасля чаго Беркман заняўся правамі ахвяр СНІДу. Ён і яго аднадумцы дабіліся ад адміністрацыі Клінтана рэвалюцыйнай рэформы мытнага заканадаўства, якая дазволіла імпарт у краіну больш танных лекаў для хворых на СНІД. Беркман да канца жыцця змагаўся за нізкія кошты гэтых лекаў, сцвярджаючы, што на самой справе пакет каштуе не больш за 150 долараў.

### АБДЭЛЬ АЗІЗ БУТЭФЛІКА



Прэзідэнт Алжыра захапіўся палітычнай мадэллю Сірыі, Егіпта або Лівіі, дзе нягледзячы на рэспубліканскі дзяржаўны лад, улада фактычна перадаецца па кроўнай лініі: ад кіраўніка дзяржавы да ягонага сына або іншага блізкага родзіча. У якасці нашчадка алжырскі прэзідэнт, калі верыць грэчаскай прэсе, абраў свайго брата Саіда, якому ўсяго толькі 54 гады. Апошні, сапраўды, актывізаваўся. Саід заявіў пра намер стварыць уласную партыю "Вольная генерацыя", якая пойдзе на выбары 2012 годзе асобна. Каб неяк залагодзіць шок грамадства ад відавочнага лабіравання на пасаду кіраўніка дзяржавы свайго родзіча, прэзідэнт вырашыў заручыцца падтрымкай ісламістаў. Чакаецца, што бліжэйшым часам у краіне будзе абвешчаная амністыя для баевікоў ісламскіх экстрэмісцкіх груповак, якія былі актыўнымі ў краіне ў 1990-я гады. Праўда, апошняя буйная атака ісламскіх тэрарыстаў, падчас якой былі забіты 24 жандары, сведчыць, што самі экстрэмісты далёкія ад ідэі кампрамісу з дзяржавай. Саід, дарэчы, з 1999 года працуе ў адміністрацыі прэзідэнта. Цікава, што раней Абдэлаіз Бутэфліка дабіўся змен у канстытуцыі, якія б дазвалялі яму балатавацца бясконцую колькасць разоў. Аднак салідны ўзрост (72 гады) і хваробы змянілі першапачатковыя планы.

ПОСТАЦІ

# МАСТАК СТАГОДДЗЯ З АСТРАВЕЧЧЫНЫ

Сяргей Гваздзёў

**28 студзеня 1995 года ў лонданскім хоспісе святога Крыстафера памёр жывапісец, матэматык, аўтар шэрагу кніг Мар'ян Богуш-Шышка, па вызначэнні крытыка Эрыка Ньютана — мастак стагоддзя.**

## КАЗКА

Золак жыцця будучага мастака быў бясхмарна-лагодным. Мар'ян быў народжаны ў сям'і Антона Богуша-Шышкі і Станіславы (з Козелаў-Паклеўскіх) 16 лютага 1901 года ў Тракеніках, у якіх 40 кіламетрах ад сталіцы, і ахрышчаны ў Быстрыцкім касцёле. Заможныя гаспадары сядзібы, што вялі свой род ад старой беларускай шляхты, атулялі сына клопатам і пяшчотай. Жыў хлопчык нібы ў казцы.

Маленькага Мар'яна выхоўвала гувернантка-француженка, але, пэўна ж, чуў ён легенды ды паданні роднага краю пра зачараваныя скарбы, пра блізкае ад іх сядзібы возера з дзіўнай назвай Бык. Хоць дзяржаўнай мовай і была на той час руская, на Астравеччыне, як амаль і на ўсёй Віленшчыне, паўсюдна гаварылі ды спявалі па-беларуску.

Сямейныя паходы да касцёлу ў нядзелю, прагулкі на конях разам з бацькам па алеях старога парку, хатнія канцэрты па вечарах, агромністыя (на дзіцячае ўспрыманне) муры бацькоўскай сядзібы, блакіт рачулкі ды таямнічая гамана чорнага лесу, бясконцая сінь нябёсаў, працавіты гул чмялёў над кветкамі і сакатанне конікаў у траве, нясцерпная зыркасць палаючага золатам сонца — усё чаравала моцнымі і чыстымі фарбамі. Свет наваколля перапаўняў прагна-чуйную душу дзіцяці. У чатыры гады Мар'ян спазнаў сапраўднае шчасце — пачаў маляваць.

Казка жыцця. Казка дзяцінства. Але ўсе казкі заканчваюцца... Калі разышліся бацькі, яму было восем. І хоць дзіця не засталося занядбаным і пакінутым без увагі — у Нарачанскім краі, у Верачаце (70 кіламетраў ад Тракенікаў) у сядзібе дзядоў ім апекаваліся Канстанцін і Філіпіна Козел-Паклеўскія, — але ўзнікла шчымлівае адчуванне адзіноты душы. Не надта ўтульна Мар'яну было ў Рускай гімназіі, у Вільні, куды яны пераехалі з дзедаўскай сядзібы ў 1912 годзе.

Падчас германскага наступлення 1915 года Мар'ян зноў вярнуўся ў Верачату. Жыццё не песціла юнака, але прыродныя здольнасці і працалюбства, упартасць ратавалі ў няпростых жыццёвых варунках. Маючы на мэце стаць мастаком, ён паспяхова засвойваў матэматыку. Падчас першай сусветнай, па смерці дзеда і па ад'езду маці з айчымам, менавіта прыватныя ўрокі па матэматыцы, якія Мар'ян будзе даваць, выратуюць сям'ю бабулі ад голаду.

## ЧАС І РЭАЛІІ ЖЫЦЦЯ

Час і рэаліі жыцця з усёй непазбежнасцю ўцягнулі яго ў вір пераменаў і адбіліся на лёсе мастака. Юначая прага сапраўднага дзеяння павяла па неабсяжнаму колу моладзевых грамадскіх і рэлігійных арганізацыяў.

У студзені 1919 года вучань 7-га класа Мар'ян — сябра вайсковай арганізацыі, у складзе групы самааховы, поўны рашучасці бараніць Вільню ад бальшавіцкай навалы. Але, выконваючы загад, мусіць адправіцца ў Варшаву... давучвацца.

У красавіку 1919-га адбылася амаль выпадковая сустрэча з бацькам у Варшаве, якая, зрэшты, сталася і апошняй: той неўзабаве памёр.

Улетку 1920 года камандзір харцэраўскага ўзвода, сяржант Богуш-Шышка быў паранены ў баі на Нёмане пад урочышчам Пышкі (зараз раён Гродна). Рана неўзабаве загаілася, і Мар'ян з баямі вярнуўся ў Вільню.



Дзедаўская сядзіба ў Верачаце

## МІЖВАЕННЫ ПЕРАДЫХ

Па заканчэнні вайны з бальшавікамі сяржант запасу Мар'ян Богуш-Шышка, з двума баявымі крыжамі на грудзях, у студзені 1921 года бліскуча вытрымаў іспыты і зрабіў крок насустрач сваёй мары — паступіў на мастацкі факультэт Віленскага універсітэта імя Стэфана Баторыя. Як і Сергіевіч, і Жынгель, ён трапіў на навучанне да прафесара жывапісу Фердынанда Рушчыца. А неўзабаве, у 1923 годзе, за акадэмічныя поспехі быў накіраваны ў добра вядомую ў Еўропе Кракаўскую акадэмію мастацтва.

Працаваў на той час у горадзе і брат ягонага бацькі, знаны архітэктар Адольф Богуш-Шышка, творца сімфоній "застылай музыкі" ў Львове і Кракаве.

Па першай сусветнай вайне ў мастакоўскіх колах Польшчы чуўся подых новых пластычна-выяўленчых павеваў, абумоўленых узаемнасцю дынамікі ўнутранага развіцця выяўленчага мастацтва і эстэтычным водгукам радыкальных падзеяў у Расіі і Германіі.

Кракаўская акадэмія, знаная класічнымі традыцыямі — рэлігійным ды гістарычным жывапісам, сцверджаным яшчэ Матэйкам, — вядома, захоўвала свой "твар". Але і тут, нават у межах біблейскай тэматыкі ("П'ета", "Уцёкі да Егіпту", "Пакладанне ў труну", "Адам і Ева") — быў відавочны пошук новых выяўленчых формаў.

Маладога мастака, схільнага да эксперыменту і ад самага пачатку зарыентаванага на рэлігійны жывапіс, гэта, відаць, задавальняла. У яго творчасці знаходзілі сабе месца розныя жанры: партрэты сяброў-аднакашнікаў і знаёмых, краявіды, нацюрморты, кампазіцыі. У пошуках уласнай творчай манеры зазнаў Богуш-Шышка і ўплывы вядучых кірункаў тагачаснага еўрапейскага мастацтва. Дамінуючым жа творчым прыёмам Мар'яна наканавана было стаць своеасабліваму, экспрэсіўна-абагульненаму рэалізму.

Жанравы абсяг мастака шырокі. Першаасновай, стрыжнем творчасці, цягам усяго жыцця сталіся сюжэтныя кампазіцыі на рэлігійныя тэмы. І няма выпадковасці ў тым, што для выканання дыпломнай працы Мар'ян абраў вечную для хрысціянскіх творцаў, эпічную, трагічную і аптымістычную падзею — "Укрыжаванне", якую мусіў увасобіць у шматфігурнай кампазіцыі.

У 1927 годзе, закончыўшы Кракаўскую акадэмію, але яшчэ не абараніўшы дыпломную працу, Мар'ян разам з жонкай Сафіяй едзе ў гарадок на рэчцы Мухавец, цэнтр Палескага ваяводства — Кобрын, каб працаваць настаўнікам малявання ў гімназіі. Тут ён — асоба спелая і загартаваная "вайной і мірам" — нечакана для сябе зрабіў лёсавызначальнае адкрыццё. Прыйшло разуменне, што дзеці, якія не бачылі шырокага свету, неадукаваныя, не пеставаныя і не разбэшчаныя, здольны адчуваць, бачыць, усведамляць і перадаваць свет фарбамі больш шчыра, эмацыйна і натуральна, чым іх адукаваныя настаўнікі.

З даследчанага мастака і педагога Мар'ян пертварыўся ў іх вучня. І, відаць, адчуваў, што асноўнае для мастака, які шмат зведаў і адтаптаў дзесяткі дарог, — выйсці на шлях гэтай дзіцячай шчырасці і непасрэднасці. Бо дзеці яшчэ захоўваюць сваю непарыўнасць з космасам, трымаючца пад Боскім апякунствам. Заварожаны ўласным адкрыццём, ён ашчадна захоўваў дзіцячыя малюнкі, экспанаваў іх у 1934 годзе ў Варшаве на конкурсе "Дзіцячае мастацтва".

## РОСТАНІ ЖЫЦЦЯ

Скразная дарога Масква — Варшава, пабудаваная ў XIX стагоддзі, прывяла яго ў 1929 годзе на нейкі час з Кобрына ў невялічкі польскі гарадок Выбжаз.

У 1932-м у Гданьску, дзе Мар'ян тады жыў і працаваў, адбылася яго першая персанальная выстава, прыхільна сустрэтая гледачамі і станоўча ацэненая крытыкай. Гэта была першая ластаўка, бо да верасня 1939 года мастак правёў 18 паказаў сваіх твораў — у Гданьску, Любліне, Гдыні, Кракаве, Варшаве. Рытм жыцця быў значна больш напружаны, чым можна ўявіць. Пэўны час Мар'ян у якасці "вольнага слухача" наведваў лекцыі і заняткі ў Варшаўскай акадэміі мастацтваў, дзе атрымаў яшчэ адзін дыплом. Здаў дзяржаўны экзамен на права выкладання мастацтва ў школах і гімназіях, багата працаваў творча.

У 1933 годзе ў Мар'яна з'явіўся нашчадак, ахрышчаны Андрэем, — будучы архітэктар, рэстаўратар палацу на Вавелі ў Кракаве. Нягледзячы на вадаспад прыемна-адказных падзеяў і клопатаў, Мар'ян напружана працаваў. Закончыў кампазіцыю, якой аддаў больш за сем гадоў жыцця, — "Укрыжаванне". Апрача жывапісу, не пакідаў ён і заняткі матэматыкай.



Мар'ян Богуш-Шышка. Лондан 1978 г.

## ПАЛОН

Напярэдадні 1939 года Мар'ян працаваў настаўнікам матэматыкі і мастацтва ў ліцэі Гданьску, адкуль і быў мабілізаваны 24 жніўня 1939 года ва ўзвод марской пяхоты. Пасля нядоўгіх, але крывавых баёў з фашысцкімі войскамі, Польшча вымушана была капітуляваць. Богуш-Шышка трапіў у палон.

Пяць з паловай гадоў — ад верасня 1939-га да мая 1945-га, — якія мастак правёў у нямецкіх лагерах, былі цяжкімі, але і не страчанымі дарма.

З дазволу лагернай адміністрацыі, Мар'ян наладзіў дзейнасць матэматычнага гуртка. Праводзіў лекцыі для нявольнікаў, што не згубілі цікаўнасць да жыцця. Адкрыў мастацкую студыю. Уражвае плён дзейнасці Богуша-Шышкі: апрача заняткаў па малюнку і жывапісу, за гэты час ён прачытаў больш за 200 лекцый па гісторыі і тэорыі мастацтва! Уласны даробак — каля 400 алоўкавых і жывапісных партрэтаў сяброў-нявольнікаў, пабытавыя эпізоды з лагернага жыцця, накіды кампазіцый да Хрысталагічнага і Марыянскага цыклаў.

Духоўнае і творчае жыццё мастака не ўпадала ў летаргію бяздзейнасці і безнадзейнасці. Гэты перыяд у жыцці Мар'яна Богуша-Шышкі краязнаўца і даследчык Алесь Юркойць вызначае як "аналітычны рэалізм".

Гады няволі сталіся часам выпрабаванняў і далейшага гарту душы, дапамаглі адкарэктаваць уласную шкалу маральных вымярэнняў, пераканалі, што "самы вялікі дар, які чалавек можа даць другому чалавеку — гэта сяброўства". Вызваленага 2 мая 1945 года амерыканскімі войскамі з лагера Мар'яна ў жніўні таго ж года

запрасіў у Італію яго стрыечны брат — генерал Зыгмунт Богуш-Шышка, намеснік начальніка штаба ІІ Польскага корпусу (паводле сведчання гісторыка Ю. Грыбоўскага, праз гэты корпус прайшло да 6 тысяч беларускіх жаўнераў).

## НА ДРУГІМ БЕРАЗЕ

Сонечная Італія з яе гістарычнымі мясцінамі, помнікамі антычнай архітэктуры, жывапісам і скульптурай геніяў Адраджэння, радзіма гуманістычнага ўсведамлення чалавека, не магла не ўразіць мастака. Па загадзе галоўнакамандуючага генерала Уладзіслава Андэрса, Мар'ян узначаліў мастацкае аддзяленне ў дэпартаменце культуры ІІ Польскага корпуса. Пазней, з прапановы падпаручніка ваеннага часу Гедройца, Андэрс аддаў загад пра стварэнне Літаратурнага інстытута і рэдакцыі часопіса "Культура", дазволіў распаўсюджваць сярод жаўнераў газету "Беларускія навіны".

Апрача абавязковых прапагандысцкіх заданняў камандавання, арганізацыйна-адміністрацыйных клопатаў, Богуш-Шышка выкладаў малюнак і жывапіс у студыі для жаўнераў, праводзіў практычныя заняткі і чытаў лекцыі па гісторыі мастацтва для афіцэраў, ладзіў экскурсіі для вайскоўцаў па гістарычных мясцінах. Знаходзіў ён і час для творчай працы. Паказваў свае творы ў Рыме і Фларэнцыі, дзе здабыў ўзнагароды.

Час, праведзены ў Італіі, па прызнанні мастака, быў варты "пяці акадэміяў мастацтва".

У кастрычніку 1946 года ІІ Польскі корпус, які ад пачатку існавання быў уключаны ў склад узброеных сілаў Вялікабрытаніі, перакінулі ў Англію і пачалі дэмабілізацыю асабовага складу. 11 лістапада 1946 года мастак пераехаў у шатландскі горад Глазга, каб праз які тыдзень назаўжды перабрацца ў Англію.

## АНГЛІЯ

Другую палову жыцця ён стала пражыў у гэтай арыстакратычнай краіне Старога свету. Пражыў не абы як, узняўся ў творчасці на прыступачку дзіцячай шчырасці ўспрымання і непасрэднасці мастацкага выражэння. У мастацкае жыццё многіх адкрытых краінаў таго часу ўваходзілі новыя творчыя накірункі, метады і напрамкі. Заваёўвала сваё права на існаванне канцэптуальнае мастацтва. З-за акіяна даносіўся голас Джэксана Полака, які абвяшчаў у чарговы раз пра "смерць станковай карціны". Абстрактныя экспрэсіяністы цураліся рэалістычных выяваў.

Мар'ян Богуш-Шышка быў прыхільнікам фігуратыўнага і рэалістычнага (хоць і не класічнага-акадэмічнага) жывапісу. Ахвяраваў жыццё на ўвасабленне вечных тэмаў. Тых тэмаў і сюжэтаў, што з'явіліся задоўга да Мар'яна і будуць прысутнымі ў свеце па завяршэнні яго ўласнага зямнога існавання.

Здзяйсняючы ўласны творчы пошук, Богуш-Шышка доўгі час кіраваў школай станковага і рэалістычнага жывапісу, якую скончылі многія славутыя майстры. Персанальныя выставы Мар'яна ў пасляваенныя часы, апрача Лондана, праходзілі ў Парыжы, у Гамбургу. Крытыкі былі ў захапленні. Пра мастака Богуша-Шышку пісалі ў шматлікіх тагачасных еўрапейскіх выданнях, прыглядаліся да яго акадэмічныя гісторыкі мастацтва (Лонданская галерэя Дрыян у 1977 годзе выдала альбом "Marian Bohusz"; найбольш поўны індэкс артыкулаў, прысвечаных мастаку, укладзены ягоным біёграфам Я. Сянкевічам у кнізе "Marian Bohusz-Szyszko", Lublin, 1995).

І ўсе гэтыя гады мастак па-ранейшаму не здраджваў матэматыцы, па вызначэнню Леанарда да Вінчы, "самай дакладнай і самай матэрыялістычнай навукі". Выкладаў матэматыку ў розных навучальных установах, атрымаў навуковую ступень, друкаваў артыкулы ў часопісах для адмыслоўцаў, выдаў падручнік па матэматычным аналізе.


Сонца 1988. М. Богуш-Шышка

## СПАДЧЫНА

Творчы здабытак Богуша-Шышкі значны і разнастайны, але, як і трэба было чакаць, расцярушаны па свеце. Яго жывапісныя творы ёсць у дзяржаўных і прыватных музейных сховішчах розных краін: Польшчы, Германіі, Італіі, Бельгіі, Францыі. Калекцыя акварэляў, малюнкаў і літаграфій, сямейны фотаархіў, асабістыя рэчы зберагаюцца ў сям'і сына ад першага шлюбу і ўнучкі Алы Богуш-Добаш, якія стала жывуць у Кракаве. Гэтая частка спадчыны будзе перададзена ў музей сям'і Богуш-Шышкаў у прадмесці Кракава, у Пшэгажалах. Найбольш жа цэласнае ўяўленне пра творчую манеру майстра, яго пластычныя здабыткі можа даць вялікая калекцыя (каля 60 твораў жывапісу), якая сваёй жыццядайнай энергетыкай падтрымлівае жыхароў хосціса св. Крыстафера.

Спадар Мар'ян пакінуў і немалую літаратурна-мастацтвазнаўчую спадчыну, цікавую ды актуальную і сёння.

Напрыклад, манаграфія "Леанарда да Вінчы" была, імаверна, вынікам імкнення Богуша-Шышкі разгадаць шматгранны геній тытана Адраджэння, універсальнай асобай якога ён быў захоплены з юнацтва, а таксама


Галава генерала Андэрса. 1970. М. Богуш-Шышка

сталася спробай спасцігнуць гуманістычны дух часу, суаднесці яго з ХХ стагоддзем. Тут нельга не адзначыць, што Мар'ян стварыў палатно "Тайная вячэра". Мяркуючы па рэпрадукцыі, спакусліва зрабіць выснову, што экспрэсіўна-выразная, з глыбокім філасофскім гучаннем, светланосная кампазіцыя, увасобленая ў індывідуальнай, "богуш-шышкаўскай" манеры, па сваёй будове паўтарае загінулы манументальны твор вялікага папярэдніка 1497 года.

Зборнік крытычных артыкулаў і эсэістыкі "Аб мастацтве" прыадчыняе таямніцы роздумаў мастака пра сутнаснае прызначэнне творчасці. Пра "залатое сячэнне" жывапісу — суадносіны колераў, патэнцыйную мажлівасць матэматычна абгрунтаваць колеравую гармонію, правамоцнасць існавання розных творчых накірункаў (ад гісторыка-рэалістычнага жывапісу Матэйкі да сезанізму і пошукаў Пікаса). Роздумаў мастака пра тое, што нават таленту немажліва пазбегнуць уплыву сваёй эпохі, бо "яго фарміруе асяроддзе, час і рэаліі жыцця". У зборнік улучаны матэрыялы пра мастакоў сучаснікаў, ураджэнцаў Віленскага краю, а таксама агляды, рэцэнзіі на выставы, крытычныя артыкулы, якія дапамагаюць больш выразна ўявіць мастацка-культурны рух у Англіі і шырэй.

"Нарыс гісторыі выяўленчага мастацтва на землях Вялікага княства Літоўскага" — зварот мастака да гістарычнай памяці, духоўнай повязі з ліцвінскай культурай. Гэта яшчэ адна вяршыня вялікага мастака з Астравеччыны, які пераступіў дзяржаўныя, этнічныя, эстэтычныя межы свайго часу, узвысіўся па-над тэмамі ХХ стагоддзя, узняўся да тэмаў "вечных". Багатая і разнабаковая мастакоўская спадчына абавязвае нас, яго нашчадкаў, перадусім да перакладаў мастацтвазнаўчых прац Богуша-Шышкі, да руплівага вывучэння і асэнсавання і папулярызацыі не спазнанай беларусамі спадчыны творцы.

## СУПРАЦА, ЯКАЯ НЕ АДБЫЛАСЯ

Некалькі прац мастака ёсць і ў Беларусі. Не цудам яны тут апынуліся.

Адам Мальдзіс, які адкрыў у 1993 годзе знанага ў Еўропе мастка з Астравеччыны, з вялікім імпэтам узяўся за справу "вяртання" яго імя на Радзіму. Дзейнасць па прапрацоўцы ідэі стварэння музея ў Тракеніках, натуральна, пачалася з ліставання і тэлефонных перамоваў са спадчыннікамі мастака. Са шчырай цікаўнасцю і адкрытымі сэрцамі далучыліся да справы нашчадак князёў Мсціслаўскіх і Заслаўскіх Анджэй Цеханавецкі і тагачасны амбасадар Беларусі ў Аб'ядналым Каралеўстве Уладзімір Шчасны, які паабяцаў ад імя беларускай амбасады "аказаць любую магчымую дапамогу". Зацікаўлена і добразычліва паставілася да гэтай ідэі ўдава мастака, пані Сісіль Саўндэрс. Прыхільна ідэя была сустрэта і астравецкімі ўладамі.

З ласкі ўдавы і дзякуючы непасрэдным высілкам Уладзіміра Шчаснага ў Беларусь была перададзеная невялічкая калекцыя твораў Богуша-Шышкі. У Тракеніскай бібліятэцы экспануюцца "Святы Хрыстафор", "Маці Боская", "Трыпціх" (Нараджэнне, Укрыжаванне, Уваскрэсенне) ды філасофска-алегарычная кампазіцыя "Птушкі" з касцёлу ў Быстрыцах. Навукова-даследчаму Цэнтру імя Францыска Скарыны быў прэзентаваны "Аўтапартрэт". У астравецкую бібліятэку, трапіла экспрэсіўная кампазіцыя "Сонца". Выбухова-жыццядайнае святло, што рытмічна пульсуе з невялічкага палатна, скіроўвае душу гледача да часоў, у якія паўстаў аддзелены ад цемрадзі Свет. Амаль умоўна азначаныя і перададзеныя, на першы погляд, хаатычнай віхурай фарбаў: і сінь неба, і бурштынавыя ствалы соснаў, і сакавітасць маладой травы. Усё гэта западае ў душу з дзяцінства, утварае дзівосную сімфонію Быцця. Нараджае адчуванне еднасці ўсяго з усім. Перадусім — чалавека з Небам. Усё проста, гэта такая малітва ў фарбах.

Пытанне стварэння музея ў Тракеніках некалькі разоў уздымалася на пасяджэннях беларуска-польскай камісіі па абмену мастацкімі каштоўнасцямі, якая таксама вітала ініцыятыву. Але сям'я мастака мусіла была быць упэўнена, што такі музей паўстане, што сядзіба ў Тракеніках стане адкрытым цэнтрам культурнай супрацы народаў-спадчыннікаў Вялікага княства Літоўскага. Трохі насцярожана паставілася да ініцыятывы ўнучка мастака з-за таго, што "Мар'ян Богуш-Шышка будзе прадстаўлены не як польскі, а як беларускі мастак". З'явіліся супярэчнасці ў меркаваннях прадстаўнікоў розных галінаў спадчыннікаў. Але і гэта не асноўнае. Паўсталі і іншыя праблемы. Як сказала тагачасная загадчыца аддзела культуры райвыканкама Данута Францаўна Чарнушэвіч, "надта непрэзентабельныя быў стан саміх Тракенікаў", грамадска-палітычная няпэўнасць, і, як заўжды, адсутнасць грошай. Сукупнасць гэтых праблемаў, а галоўнае — "адсутнасць рухавіка з беларускага боку", зрэшты, і прывяла актуальную ініцыятыву да "каматознага" стану.

На зыходзе ліпеня 1996 года англійская арыстакратка больш чым шаноўнага ўзросту, баранеса Сісіль Саўндэрс, насуперак кракаўскім спадчыннікам, наведала Тракенікі. Вядомая ў Англіі як доктар медыцыны, аўтар шэрагу навуковых прац і апякунка хосціса святога Крыстафера, чыёй нястомнай дзейнасцю гэтая медычная ўстанова стала лепшай у Еўропе, спадарыня Саўндэрс агледзела радавую сядзібу Богуш-Шышкаў, наведала Быстрыцкі касцёл, дзе ксёндз Пікула справіў імшу па мастаку, пакінула каменьчык з магілы мастака, узяла памятку з яго Радзімы і з'ехала. Няўжо ўсё?

Вяртаюся да пагруднага "Аўтапартрэта" (40х30) на фоне амаль прывіднага інтэр'еру, выкананага каляровымі алоўкамі на паперы. Намаляваны ў чэрвені 1985 года, калі мастаку ішоў дзевяты дзесятак, але ў карціне адчуваецца прысутнасць маладой і бадзёрай душы. Выява зроблена лёгка, "гуляючы", амаль імпрэсіяністычна, у кранальна-адухоўленай каларыстыцы. Спалучэнне пяшчотна-травяністых і блакітных колераў вопраткі і фону з залаціста-бурштынавай нотай твару героя надае выяве высакароднасць і цеплыню. Спярэшчаны зморшчынамі твар мастака — яго біяграфія і жыццёвыя шляхі. Моцная лепка і добрая прапрацоўка галавы, амаль "скульптурны" высокі лоб старога выкрывае ў ім філасофа, перадае высокі інтэлект асобы, гарт яго характару.

Інтэлігентнага выгляду стары джэнтльмен глядзіць на нас скрозь тоўстае шкло акуляраў. Глядзіць годна, пільна і думна. Але разам з тым і зусім па-дзіцячаму. З інтрыгуючай хітрынкай. А мо з лёгка-іранічнай весялосцю. Быццам даўно збіраецца штось запытаць у нас, беларусаў.

МІНУЎШЧЫНА

# ЛЕГЕНДЫ І ПАДАННІ НАШАГА КРАЮ

◂ **Працяг. Пачатак у № 22 (150)**

## Каменны Брод

Захацеў аднаго разу вішоўскі чорт перабрацца ў Нежкаў. Але на ягоным зламысным шляху паўстала рэчка. А чэрці, як усім вядома, не любяць рачной вады. Таму і вырашыў вішоўскі чорт загаціць Вабіч. Ён прывалок воз каменя, але калі скідваў яго ў ваду, сам затапіўся.

І цяпер, кажуць вяскоўцы, калі хто будзе ісці праз Каменны Брод ноччу, дык пачуе, як крычыць з таго свету вішоўскі чорт.



## Чаму знікла рэчка Цех?

Даўным-даўно праз месца, дзе сёння стаіць Цяхцін, працякала рачулка Цех. Абапал яе берагоў раслі вербалозы, галіны якіх, нізка схіляючыся, купаліся ў вадзе. Па рэчцы плавалі белыя гарлачыкі, у ёй любілі купацца дзеці і дарослыя. І трэба ж было аднойчы такому здарыцца: купаючыся ў рэчцы Цех, утапіўся сын вядзьмаркі.

З гора яна пракляла раку і ў знак свайго праклёну кінула ў Цех камень. З таго часу знікла рэчка, але ходзіць паганоска сярод старых людзей: калі знайсці і выкапаць той камень з зямлі, Цех зноў стане ракой.

## Асавец

Гэта здарылася вельмі даўно, калі не было яшчэ самой вёскі, а на месцы яе стаяў хутар. Належаў ён маладому і вельмі прыгожаму пану. А на панскай гаспадарцы працавала няпісаная прыгажосць дзяўчына Ася.

Малады паніч, якога звалі Вацлаў, і Ася пакахалі адзін аднаго. Ды бацькі Вацлава не дазволілі ім пабрацца шлюбам. І маладыя вырашылі: лепей памерці разам, чым жыць не сумесна.

Аднойчы на світанні, калі сонейка толькі-толькі пачало ўзыходзіць, яны, узяўшыся за рукі, пайшлі няведама куды. Болей іх ніхто не бачыў і нічога пра іх не чуў.

Мясцовыя людзі вельмі любілі іх, часта ўспаміналі пра іх нешчасліваю долю. Каб ушанаваць памяць пра закаханых, склалі разам іх імёны — Асавец — і далі найменне сваёй вёсцы.

## Княгіня

Праз вёску Каліноўка працякае невялічкая рачулка, якая называецца Княгіня. Старыя людзі апавядалі, што ў праікаветныя часы тут жыла вельмі прыгожая дзяўчына. Настолькі прыгожая, што ўсе называлі яе Княгіняй, хоць яна нарадзілася ў простай, беднай сям'і. Дзяўчыну гэту вельмі любілі. Любілі і за яе прыгажосць, і за сціпласць, працавітасць ды ўважлівасць.

Аднойчы ў вёсцы здарылася няшчасце — дзяўчына-прыгажуня ўтапілася. Чаму — ніхто тое не ведаў і не ведае. І вось у гонар яе і празвалі людцы рэчку тую Княгіняй.

## Домса

Жыла некалі ў Малым Кудзіне вядзьмарка са сваёй дачкой. Звалі яе Домсай.

Аднаго разу Домса пайшла купацца і… ўтапілася. Маці вельмі плакала-гаравала і выкляла рэчку.

З таго часу і стала рэчка мялець.

## Крыкуны

За вёскай Малы Кудзін, побач з шашой, што вядзе ў бок старажытнага Галоўчына, з левага боку размешчаны могілкі. А насупраць іх знаходзіцца паселішча Крыкуны.

Паходзіць найменне яго ад слова крычаць. А чаму крычалі людзі? Ды так, што ажно крык той іхні захаваўся ў памяці — у найменні паселішча?

Пасля рэвалюцыі, калі людзі дзялілі панскую зямлю, жыхары паселішча вельмі крычалі. Іх лямант і разносіўся на ўсё наваколле. Крычалі. Крыкуны, ды і толькі.

КАНФЕРЭНЦЫЯ

# «МІЛЕНІУМ ЛІТВЫ»: НАВУКОВЫ АНАЛІЗ

Аляксей Хадыка

**19 чэрвеня ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Коласа НАН Беларусі прайшла Міжнародная навуковая канферэнцыя «Міленіум Літвы», арганізаваная Грамадскім камітэтам святкавання вынесенай у тытул падзеі.**

У камітэт «Міленіум Літвы» ўваходзяць дактары гістарычных навук Анатоль Грыцкевіч і Алесь Краўцэвіч, медыцынскіх навук Алесь Астроўскі, біялагічных навук Аляксей Мікуліч, археолаг Эдвард Зайкоўскі, мастак і грамадскі дзеяч Мікола Купава, рэдактар манархічнай газеты "Litwa" Аляксандр Стральцоў-Карвацкі, святар Леанід Акаловіч, даследчык Здзіслаў Сіцька. У шэрагу мерапрыемстваў, запланаваных на юбілейны 2009 год, калі адзначаецца 1000-годдзе першай летапіснай згадкі наймення Літва, сярод якіх прэзентацыі кніг ("НЧ" пісаў пра шыкоўны фаліянт "Кніга Вялікага княства Літоўскага"), мастацкія выставы, канцэрты, гэтая падзея мела не столькі святочны, колькі навуковы характар. Таму і адбывалася ў адной з галоўных навуковых бібліятэк краіны, супрацоўнікі якой упрыгожылі залу выставай беларускіх, літоўскіх, польскіх і іншых замежных выданняў па гісторыі ВКЛ — навуковых прац, зборнікаў, мапаў, публікацый дакументаў.

Запрошаныя да ўдзелу гісторыкі, філолагі, культуролагі, спецыялісты па геральдыцы, абмеркавалі litзнабаковыя пытанні: этнагенез беларускага і літоўскага народаў, раўнапраўных спадчыннікаў гістарычнай Літвы; паходжанне тэрміну і станаўлення гістарычнай Літоўскай дзяржавы, а таксама вобраз Літвы ў літаратурных помніках і працах палітычнай і філасофскай думкі — ад часоў стварэння "раманскай" генеалагічнай міфалогіі ў эпоху Рэнесансу (даклад Ігара Клімава) да фармавання на мяжы XIX–XX стагоддзяў "краёвай ідэі", у межах якой ліцвіны, палякі, русіны разглядаліся як карані адзінага палітычнага літвінскага народу (Аляксандр Стральцоў-Карвацкі). Адна са скразных тэм канферэнцыі — геапалітычнае самавызначэнне нашых продкаў. Вядучы лацініст Беларусі Алесь Жлутка дэталёва прааналізаваў ролю "заходняга" хросту Літвы святым Бруна. А прафесар Алесь Краўцэвіч з Гродна казаў пра Каралеўства Літву Міндоўга і паварот да заходнееўрапейскай палітычнай арыентацыі ў гэты час. "Палонус", "літуанус", "рутэнус" — тэму складанага перапляцення палітонімаў і этнонімаў у лацінамоўнай літаратуры ВКЛ закранула Жана Некрашэвіч-Кароткая, а Надзея Старавойтава аднавіла на канферэнцыі паэтычны свет перакладной рыцарскай літаратуры XVI стагоддзя. Бліскуча і актуальна прагучаў даклад Ірыны Лаўроўскай, доктара архітэктуры з Брэста. Цытуючы заснавальніка Віленскага ўніверсітэта Пятра Скаргу, яна прадэманстравала, як практычная хрысціянская міласэрнасць увасаблялася ў фундацыі храмаў і нагадвала пра сябе дамінантамі горабудаўнічых ансамбляў. Непаўторны беларускі ландшафт, які імкліва губляўся з XIX стагоддзя (катастрофа старога Бярэсця, зруйнаванага дзеля пабудовы расійскай крэпасці) і ці не наўмысна надалей знішчаецца да сёння, быў важным фактарам фармавання хрысціянскіх этычных якасцяў беларускай душы. Філолаг, перакладчык, паэтка Інэса Кур'ян ярка і эмацыйна нагадала прысутным пра "літоўскасць" Адама Міцкевіча, якая яшчэ далёка не спасцігнута і асэнсавана ў Беларусі на карысць уласнай культуры.

Увечары ўдзельнікі канферэнцыі ўсклалі кветкі да магілы Васіля Быкава на Усходніх могілках, ушанаваўшы 85-годдзе пісьменніка, а на наступны дзень накіраваліся ў аўтобусную вандроўку па мясцінах гістарычнай Літвы.

ВАНДРОЎКА

# ПА ГІСТАРЫЧНЫХ МЯСЦІНАХ

Святлана Зянковіч

**20 чэрвеня ўдзельнікі канферэнцыі "Міленіум Літвы", аматары гісторыі і журналісты выправіліся на экскурсію па тэрыторыі гістарычнай Літвы. У планах падарожнікаў было наведаць вёскі Літву Маладзечанскую, Літву Рубяжэвіцкую, Літву Ляхавіцкую, Літоўку, Гарадок, Гарадзішча, а таксама Мір і Наваградак. Але, як часта здараецца, падчас вандроўкі праграму давялося крыху змяніць.**



Першы прыпынак зрабілі ў Гарадку Маладзечанскага раёна, дзе ў паўночнай частцы вёскі на левым беразе ракі Бярэзіны выдатна захаваліся рэшткі земляных умацаванняў XIV–XVIII стагоддзя. Пасля экскурсанты зазірнулі ў вёску Літва Маладзечанскага раёна і сфатаграфаваліся каля шыльды з надпісам "Літва". Гісторык, журналіст і краязнавец Здзіслаў Сіцька, які праводзіў экскурсію, распавёў, што вёска вядомая яшчэ з XV стагоддзя, а мясцовыя жыхары спрадвеку называлі сябе "літоўцамі". Побач з вёскай захавалася вузкакалейка, адметная тым, што старыя рэйкі ўжо шмат гадоў былі ўмантаваныя непасрэдна ў сучасны асфальт. Але, відаць, мы былі апошнімі, хто пабачыў гэта дзіва, бо дарогу якраз рамантавалі, а рэйкі выкапалі ды рыхтаваліся вывезці на сметнік.

Пра надзвычай нядбайнае стаўленне да гістарычных помнікаў падчас экскурсіі давялося, на жаль, пачуць яшчэ не раз. У Навагрудку, стоячы на Замкавай гары, побач са зруйнаванымі мурамі, мы даведаліся, што раней тут было яшчэ вышэй — пры раскопках метры два зямлі папросту знялі. У 60–70 гады лічылася, нібы гістарычны пласт XIII–XIV стагоддзя — "час панавання польска-літоўскіх феадалаў" — не ўяўляе ніякай навуковай цікавасці, таму каб хутчэй правесці раскопкі і, не марнуючы часу, дабрацца да пласту X–XII стагоддзяў, першыя некалькі метраў зямлі папросту скопвалі бульдозерамі. Гэта адбывалася не толькі ў Наваградку, але і ў большасці гарадоў, якія раскопвалі ў тыя часы.

Побач з Наваградкам мы спыніліся ля неверагоднай па прыгажосці рэчкі Літоўка, што каля вёскі Літоўка (якая атрымала назву ад рэчкі) утварае стаў. На гэтым беразе, як мяркуе даследчык-лацініст Алесь Жлутка, адбывалася каранацыя Міндоўга. А па дарозе ў Мінск прыпыніліся ля вёскі Гарадзішча і ўзняліся на курган, дзе, магчыма, і знаходзілася старажытная Міндоўгава сталіца Варута.

Новы Час
Масава-палітычная газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар **Алена Анісім**
Шэф-рэдактар **Аляксей Кароль**

Пасведчанне аб рэгістрацыі № 1798 ад 12 верасня 2008.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў».

Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 280 17 91.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова №
Падпісана да друку 26.06.2009. 8.00.
Наклад 5050 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.